1

# Буслянка







А. В. Вольскі, І. А. Гімпель

# Буслянка 1

Падручнік па літаратурнаму чытанню
для першага класа агульнаадукацыйнай школы
з беларускай мовай навучання

Зацверджана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Выданне трэцяе

Мінск
«Асар»
2000

УДК 808.26(075.2=826)
ББК 81.2Беи-93
В71

**Умоўныя абазначэнні:**

? — пытанні і заданні да тэкстаў;

* — заданне павышанай цяжкасці;

○ — тэксты для дадатковага чытання.

**Вольскі А. В., Гімпель І. А.**

В71 Буслянка: Падруч. па літаратурнаму чытанню для 1-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. мовай навучання. — 3-е выд. — Мн.: «Асар», 2000. — 304 с.: іл.

ISBN 985-6572-14-2

УДК 808.26(075.2=826)
ББК 81.2Беи-93

ISBN 985-6572-14-2

© «Асар», 1998
© Вольскі А. В., Гімпель І. А., 1998
© Цімохава Р. М., ілюстрацыі, 1998
© Кулажэнка А. А., афармленне і арыгінал-макет, 1998

# Непаўторны край.

*Артур Вольскі.*

То ялінкі, то сасонкі
падпіраюць небакрай...
Прыгажэйшае старонкі
не знайсці, як ні шукай.
Скачуць сонейка асколкі
пасля дождджыку ў вадзе.
Весялейшае вясёлкі
не пабачыш анідзе.
Пахне збожжа свежым хлебам.
Сыпле золата жніво.
Жаўрукі звіняць пад небам —
славяць свету хараство.
На бярозе — белы бусел.
Пад бярозаю — ручай.
А завецца БЕЛАРУССЮ
Непаўторны родны край.







# Зямля бацькоўская, святая...

*Пімен Панчанка*



## Памяць зямлі.

*Васіль Вітка.*

Якая, вы думаеце, самая цікавая кніга на свеце? Адразу не адкажаце, не здагадаецеся. Гэта кніга — зямля, на якой мы жывём і якая з першых год нашага жыцця штодня вучыць нас гісторыі, мове, штодня і штораз адкрывае нам усё новыя і новыя словы, значэнне і сэнс якіх мы вучымся спазнаваць і разумець.

Жывое асяроддзе акружае нас: жывёлы, птушкі, самыя малыя істоты, а таксама расліны, кветкі, дрэвы. І ўсе яны маюць свае імёны.

Многа назваў існуе на зямлі. Кожная яе мясцінка мае сваю назву.

Чалавеку дорага месца, дзе ён нарадзіўся, адкуль пачаўся род яго сям'і, і ўсе сляды, справы, памяць, што пакінулі аб сабе яго продкі. Усё гэта, як нашу найдаражэйшую спадчыну, беражэ памяць зямлі, нясе праз гады, праз вякі ў імёнах і назвах, у словах, у мове, у паданнях і легендах.

Людзі даюць імёны не толькі сваім дзецям, а ўсяму жывому наваколлю, імёнамі называюць зямлю, на якой жывуць, дарогі, па якіх ходзяць і ездзяць, кожную ваколіцу, дзялянку, лес, рэчку, луг, выпас, палетак.

? Як вы разумееце назву раздзела «Зямля бацькоўская, святая...»?

Якая самая цікавая кніга на свеце? Пацвердзіце словамі тэксту.

Патлумачце выраз: «Кожная яе мясцінка мае сваю назву». Прывядзіце прыклады пра тыя мясціны, дзе вы жывяце.

* Перакажыце тэкст сваімі словамі.

## Чым займаліся нашы продкі.

*Віталь Вольскі.*

Галоўным заняткам старажытных жыхароў Беларусі было земляробства. Яны сеялі жыта, ячмень, авёс, проса, грэчку, лён і каноплі.

Продкі беларусаў былі людзі дужыя і працавітыя. Для пасеваў яны высякалі дрымучы лес, а потым яго выпальвалі. Са свойскіх жывёл у нашых продкаў былі каровы, козы, авечкі, свінні, сабакі.

Нашы продкі былі выдатныя паляўнічыя, добра ведалі норавы і звычкі дзікіх звяроў. Яны палявалі на зубра, тура, мядзведзя, лася, вепра. Вельмі развіта было лясное пчалярства.

Мёд, воск, звярыныя шкуры старажытныя жыхары Беларусі не толькі спажывалі самі, але і вывозілі ў іншыя краіны.

---

**Слоўнік.**

Продкі — людзі, якія жылі задоўга да цяперашняга часу.

Вепр — дзік.

? Які галоўны занятак быў у старажытных беларусаў?

Чым яшчэ займаліся нашы продкі? Што старажытныя жыхары Беларусі спажывалі самі і вывозілі ў іншыя краіны?

* Прачытайце тэкст самі сабе і перакажыце яго падрабязна.

## Адкуль пайшлі беларусы.

(Паданне.)

Калісь яшчэ свет толькі зачынаўся, дык нічога нідзе не было. Усюды стаяла мёртвая вада, а пасярод вады тырчэў нібы камень. Адзін раз пярун разыграўся і давай пыляць стрэламі ў гэты камень. Ад яго стрэлаў выскачылі тры іскаркі: белая, жоўтая і чырвоная. Упалі тыя іскаркі на ваду; з гэтага ўся вада скаламуцілася, і свет памуціўся, як хмары. Але па некаторым часе, як усё праяснілася, дык і адзначылася — дзе вада, дзе зямля. А яшчэ па некаторым часе завялося ўсякае жыццё ў вадзе і на зямлі. І лясы, і травы,

і звяры, і рыбы, а пасля і чалавек завёўся: ці ён прыйшоў аднекуль, ці вырас хутка.

Гэты жыхар стаў заводзіць свае чалавечыя парадкі. Ці доўга ён так жыў, ці мала, але меў ён ужо сваю сялібу і шмат дзяцей. Было яму прозвішча Бай. А як прыйшла яго гадзіна смерці, дык ён склікаў сваіх сыноў і падзяліў усю сваю маёмасць. Толькі аднаго сына забыў.

Той у гэты час быў на паляванні, а з ім былі і любімыя бацькавы сабакі Стаўры і Гаўры. Прозвішча гэтаму сыну было Белаполь.

Неўзабаве пасля смерці бацькі вярнуўся Белаполь з палявання. А браты яму кажуць:

— Вось бацька падзяліў нам усю сваю маёмасць, а табе ён адказаў сваіх сабак ды яшчэ наказаў, каб ты іх пусціў па волі: аднаго — у правы бок, а другога — у левы; колькі яны зямлі аббягуць за дзень, дык гэтая ўся зямля твая будзе.

Вось пайшоў Белаполь і злавіў дзвюх птушак, што прыляцелі адна з паўднёвага мора, другая з заходняга. Пусціў адну птушку на

поўдзень, ды і кажа першаму сабаку: «Бяры!»

Пусціў другую на захад і кажа: «Хапай!»

Як паляцелі тыя птушкі адна ў адзін бок, другая ў другі. Як пабеглі сабакі за птушкамі, дык ажно зямля закурылася... Як пабеглі тыя сабакі, дык і да гэтага часу не вярнуліся, а па іх слядах дзве рэчкі працягнуліся, у адзін бок прыйшла Дзвіна, а ў другі бок — Дняпро.

Вось у гэтых абшарах Белаполь і пачаў сяліцца ды заводзіць свае лады...

---

**Слоўнік.**

Пярун — аглушальны ўдар грому.

Паданне — вуснае апавяданне, якое здаўна жыве ў народзе.

Абшары — шырокія прасторы.

Лады — парадак, спосабы гаспадарання.

? Якія дзівосы адбываліся ў прыродзе, калі свет толькі зачынаўся? Знайдзіце апісанне і прачытайце яго.

Што зрабіў Бай перад смерцю?

Што сказалі браты Белаполю? Прачытайце.

* Чаму людзі здаўна сяліліся па берагах рэк?

Перакажыце паданне сваімі словамі.



## Я — беларус маленькі.

*Мікола Маляўка.*

Я — беларус маленькі,
Дарос ужо да школы.
Як і бацькі, сумленны,
Руплівы і вясёлы.

Я — беларус маленькі
З блакітнымі вачыма.
Хачу і я, каб лепей
Жыла мая Радзіма.

Я — беларус маленькі.
Люблю блакіт і сонца.
З Радзімай пасталею,
Радзімы — абаронца.

Я — беларус маленькі,
Адкрыты ўсім трывогам,
Ды стану на калені
Я толькі перад Богам.

? Прачытайце верш. Ці спадабаўся ён вам? Чаму?

Які настрой выклікаў у вас верш, калі вы яго чыталі? Знайдзіце радкі, якія характарызуюць хлопчыка.

* Прачытайце апошняе чатырохрадкоўе і адкажыце, як вы разумееце два заключныя радкі.

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання: пастарайцеся перадаць голасам пачуццё любові да Радзімы.



## Спадчына.

*Янка Купала.*

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Аб ёй мне баюць казкі-сны
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.

Аб ёй мне будзіць успамін
На ліпе бусел клёкатам
І той стары амшалы тын,
Што лёг ля вёсак покатам...

**Слоўнік.**

Спадчына — тое, што пакінута папярэднікамі.

Амшалы — аброслы мохам.

Тын — агароджа.

Покат — адзін за адным, без пэўнага парадку.

? З якім пачуццём паэт піша пра родны край? У якіх радках верша гэтае пачуццё перадаецца асабліва выразна?

Знайдзіце ў вершы выразы, якія малююць прыгажосць родных мясцін.

Ці чулі вы песню на верш Янкі Купалы «Спадчына»? Паслухайце яе ў запісе.

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання твора ў класе.

Вывучыце верш на памяць.





# Душа народа ў песнях тых жыве...





# КАЛЫХАНКІ.

Калыханкі — гэта песні, якія спяваюць, калі закалыхваюць дзіця.

Люлі, люлі, люлі...
Палез кот па дулі,
Адмарозіў лапку,
Прыйшоў грэцца ў хатку.

Недзе кату дзецца,
Лапачцы пагрэцца...
Узлез бы на палаткі,
Ды баіцца бабкі.

Палез бы на вышкі,
Ды баіцца мышкі:
Там мышы дурэлі,
Кату хвост ад'елі.

Пайшоў каток у лясок,
Знайшоў каток паясок,
А котачка адняла
Ды дзіцяці аддала.

Пайшоў каток пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток.
Ці самому з'есці,
Ці дзіцяці знесці?

Думаў каток, думаў,
Думаў ды надумаў:
І сам разок укушу,
І дзіцяці занясу.



Вы не чулі навіны́?
Я сцвярджаю без маны:
Чалавек расце — у сне!
І прашу паверыць мне!
Мы памыліся!
Расшпіліліся!
Шнуркі развязалі!
Дабранач сказалі!
А цяпер давайце
Вочкі закрывайце!
Вейкі апусціце
І ўсю ноч — расціце!



? Якія запевы і прыпевы ўжываюцца ў калыханках? Прачытайце.

Якія вобразы сустракаюцца найчасцей у калыханках? Пацвердзіце словамі з тэксту.

Завучыце адну з калыханак на памяць.



# ПЕСНІ.

Песні з'явіліся вельмі даўно. Свае песні народ часцей за ўсё звязваў з думамі пра ураджай, з працай людзей, гульнямі, святамі. Спявалі песні пра з'явы прыроды, пра зіму і восень. У песнях заклікалі вясну, славілі цёплае лета.

## Дажынкавая.

Рада, рада шэра перапёлка,
Што лета даждала,
Рада, рада наша гаспадынька,
Што жыта дажала.

Перамерзла шэра перапёлка
Глыбока ў крыніцы,
У сцюдзёнай вадзіцы.
Перамерзла наша гаспадынька
Без жытняга хлеба,
Без кіслага квасу.
Радзей таго наша гаспадынька,
Што жнеек сабрала
І жыта дажала.
Ніўка, ніўка, аддай маю сілку
На другую ніўку!
На коніка лой, на ніўку гной,
А мне здароўя!







## Перадзімная.

— Ой, чаго, зімачка,
Ой, чаго, лютая,
Percenька настала?
— Ой, я не раненька,
А ўжо позненька
Зімачка настала.
Ужо лісточак апаў
Ды й зямліцу ўваслаў —
То мая пара прыйшла.
А рэчачкі сталі
Ды й пазамярзалі —
То пара й другая.

## Калядная.

Прыехала Каляда на сваім коніку,
Паставіла коніка ў адрынцы,
Сама села на куце ў пярынцы,
Паставіла дудачкі на стаўпе:
Грайце, дудачкі, голасна,
Скачыце, дзетачкі, хораша.



## На масляніцу.

У нас сягоння масляніца!
Прыляцела к нам ластавіца.
Села, пане, на калу,
Скінула масла па кашу.
А хто ўхопіць — так таму.
Наша Агашка хапліва,
Тое масла схапіла,
У кубачку стапіла.

## Вясновыя.

— Ой ты, жаваранку,
Ранняя пташачка,
Ой, чаго так рана
І з выраю выйшаў?
— Не сам жа я выйшаў —
У мяне пташкі былі,
У мяне пташкі былі,
З выраю ганілі.
— Ляці, жавароначку,
У сваю старонку.
Ой, дзе ты радзіўся,
Там корчык свяціўся.
Там табе вадзіца
Па самы крыліца,
Там табе травіца
Па самы каленцы.



* * *

А ты, вясна, а ты, красна!
А што ж ты нам прынясла?
— Я прынясла, прынясла
Цёпленькай вадзіцы,
Зялёненькай травіцы.



? Пра што спяваў народ у сваіх песнях? Адказы пацвердзіце словамі тэксту.

Якая песня вам найбольш спадабалася? Чым яна кранула?

Чаму песні названы «Дажынкавая», «Перадзімная», «Калядная» і іншыя.

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання песні «Дажынкавая».

# ПЕСЕНЬКІ.



Гого-гого, гусачок,
Зрабі хлопчыку свісток
З беласнежнага крыла
Ды з бліскучага пяра.

І зрабіў ён, і падаў,
І сыночак заіграў.

* * *

Сядзіць сыч на капе,
А сава на другой.
Гой-гой-гой! — на другой,
Гой-гой-гой! — на другой.
У савы сыч пытае:
— Хто ў лесе гукае?
Гу-гу-гу! — гукае,
Гу-гу-гу! — гукае.
— Дрывасекі мае
Сякуць лес у мяне.



* * *

Наляцелі гусі,
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Сталі думаць і гадаць,
Чым дзіця гадаваць:
Ці кашкаю, ці мядком,
Ці салодзенькім малачком?



? Якая з песенек вам найбольш спадабалася?

Прачытайце выразна першую песеньку і паспрабуйце праспяваць яе.

Вывучыце адну з песенек на памяць.

# ЗАКЛІЧКІ.

У заклічках людзі звяртаюцца звычайна да вясны і лета, да сонца і ветру, да дажджу і вясёлкі, да жывёл і раслін.

Прыйдзі, прыйдзі, вясна,
Прыйдзі, прыйдзі, красна,
К нам у таночак,
Прынясі нам збожжа,
Прынясі нам красак,
Каб нам звіць вяночак.



Сонейка, сонца,
Выглянi ў аконца,
Пасвяці нам трошку,
Дам табе гарошку!

Ідзі, ідзі, дожджычку,
Звару табе боршчыку,
Пастаўлю пад елкаю,
Накрыю талеркаю,
Сама пакаштую,
Цябе пачастую.



Пра што гаворыцца ў заклічках? Да каго ці да чаго звяртаюцца ў іх людзі?

Чаму так многа ўвагі надавалася з'явам прыроды?

Прачытайце заклічкі самастойна і падрыхтуйцеся да выразнага чытання.

Вывучыце адну з іх на памяць.

# ЗАБАЎЛЯНКІ.

Забаўлянкі — звычайна невялікія вершы, якімі матулі ці бабулі супакойвалі або цешылі дзяцей.

Ладачкі-ладушкі,
Прыляцелі птушкі,
Селі на варотах
У чырвоных ботах.

Боты паскідалі,
Кругом паляталі,
Сталі сакатаці,
Каб ім есці даці.

Прынясу ім жыта —
Будуць птушкі сыты.
Пасыплю гароху,
Хай ядуць патроху.

* * *

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая.
Зачапілася за пень,
Прастаяла цэлы дзень.

* * *

Сарока-варона
Дзеткам кашку варыла,
На прыпечку студзіла,
Памялом мяшала,
Памялом давала.
Гэтаму дала,
І гэтаму дала,
І гэтаму дала,
І гэтаму дала.

А гэтаму не дала:
— Ты, малы, круп не драў,
Вады не насіў,
Дзяжы не мясіў.
Ідзі, малы, па вадзіцу
У сцюдзёную крыніцу,
За пень, за калоду
Па жывенькую воду!



З якім настроем вы чыталі забаўлянкі? Якая з іх найбольш вам спадабалася? Чаму?

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання адной з забаўлянак (на выбар).

Вывучыце адну ці дзве забаўлянкі на памяць і раскажыце сваім бацькам, родным, сябрам.

# ЛІЧЫЛКІ.

З даўніх часоў дзеці любілі вясёлыя, шумныя гульні. Многія з іх суправаджаліся песнямі, загадкамі, лічылкамі. Лічылка — слоўная гульня. Яна часцей за ўсё ўжываецца пры вызначэнні вядучага гульні.

* * *

Пятро, Пятро,
Падай вядро.
Карове піць —
Табе жмурыць.

* * *

А ты, коцік, не гуляй,
Начовачкі прыбірай!
Начовачкі слізкі,
Вядзёрачкі блізкі.
Круг абарваўся,
А ты так астаўся.

* * *

Кацілася торба
З вялікага горба.
А ў той торбе
Хлеб, пшаніца,
З кім ты хочаш
Падзяліцца?





? Калі вы карыстаецеся лічылкамі?

У якім тэмпе чытаюцца лічылкі? Пацвердзіце прыкладамі, прачытаўшы адну з іх.

Прачытайце лічылкі самастойна і падрыхтуйцеся да выразнага чытання.

Завучыце адну-дзве лічылкі на памяць (па жаданню).

## У зімы і лета — свае прыкметы.

Гусі ляцяць нізка — зіма блізка, а высока — зіма далёка.

Вароны і галкі садзяцца на верхавіны дрэў — на мароз.

Лес шуміць — чакай адлігі.

Снег наліпае на дрэвы — будзе цёпла.

Зімою частыя адлігі — жыта ўродзіцца дрэннае.

Кот ляжыць сярод хаты — будзе цёпла, а спіць на печы — да марозу.

Студзень — году пачатак, зіме сярэдзіна.

У лютым дажджы — мокрыя вясна і лета.

Грак на гары — вясна на двары.

Мокры май — будзе жыта як гай.

Удзень горача, уночы холадна — да добрага надвор'я.

Ноч без расы — дзень з дажджом.

Вясёлка раніцай — на дождж, вечарам — на добрае надвор'е.

Камары таўкуцца — на добрае надвор'е.

Сена моцна пахне — уночы дождж ахне.

Жабы скачуць на беразе і ўдзень крэкчуць — чакай дажджу.

Навальніца ў верасні — восень будзе цёплая.

Гром у верасні — на цёплую восень, кастрычніцкі гром — на бясснежную зіму.

Багаты ўраджай жалудоў на дубах — на цёплую зіму.



? Як вы разумееце сэнс загалоўка?

Прачытайце самі сабе прыкметы. Якую з іх вы найлепш запомнілі? Зачытайце.

Прачытайце прыкметы, у якіх вызначаны розныя поры года. Спачатку — пра восень, потым — пра зіму, затым — пра вясну і нарэшце — пра лета.

Вывучыце на памяць прыкметы пра восень.

# ЦІ ТО СМЕХ, ЦІ ПАЎСМЕХА.

## На жарты крыўдаваць не варта.

— У якім вуху звініць?

— У левым.

— Не, не ўгадаў. У пра-а-а-вым.

— Значыцца, ты і сам ведаеш. Дык навошта пытаўся?

* * *

— Чаму ты перад сном прычэсваешся?

— Трэба. Бывае, сасню, што я ў гасцях, дык сорамна будзе непрычасанаму.

* * *

**Сын.** Тата, сёння я адзін ва ўсёй школе мог адказаць настаўніку.

**Бацька.** А што ён пытаў, сынок?

**Сын.** Хто разбіў акно.

* * *

— Вось каб мне такія доўгія вушы, як у зайца, тады я вельмі лоўка падхопліваў бы ўсе падказкі, — заўважыў Коля.

— Не, не згодзен, — запярэчыў Вася. — Доўгія вушы доўга трэба мыць.

* * *

Чалавек заседзеўся ў гасцях. Гаспадар выйшаў яго праводзіць:

— Пачакай, я табе пасвячу, а то ў мяне высокі ганак і паламаны.

— Дзякуй, — адказаў госць з зямлі. — Я ўжо і без асвятлення гэта адчуў.

* * *

**Маці.** Чаму ты, сынок, нічога ў пару не робіш? Помні, што адклад не ідзе на лад.

**Сын.** Ах, калі так, мамачка, дык тады дай мне сягоння тыя цукеркі, што ты схавала на заўтра.

* * *

**Настаўнік.** Чаму салавей, як пяе свае песні, заплюшчвае вочы?

**Вучань.** Бо ён іх ведае на памяць.

* * *

— А што, Янук, спадабалася табе новая настаўніца?

— Ды яна, мама, нічога сабе: прыгожанькая і не старая. Але, мусіць, яна мала вучылася, бо пра ўсё мяне пытаецца.

* * *

Дзеці аглядаюць звярынец.

— Хто скажа, чаму ў ільва такая вялікая галава?

— Каб не вылез з клеткі.



? Як вы думаеце, чаму на жарты крыўдаваць не варта?

Як трэба паводзіць сябе, калі пра цябе гавораць з жартам?

Замяніце адным словам выраз: «гаварыць або рабіць што-небудзь несур'ёзна, са смехам, для пацехі».

* Чаму раздзел падручніка названы «Ці то смех, ці паўсмеха»?

Прачытайце жарт, які вас найбольш рассмяшыў.

## Скорагаворкі — радцы гаворкі.

Адна сарока — адна марока, сорак сарок — сорак марок.

Дзятлы дзюбамі дзяўблі дзеравіну.

Ішоў грэка цераз рэку, бачыць грэка ў рацэ — рак, грэка руку ў рэку ўсунуў, рак за руку грэку — цап!

Каласы каласавалі, каласавалі, выкаласаваліся.

Карл у Клары ўкраў каралы.

Лянок не любіць лянот, лянот не любіць лянок.

Пёкар Пётр пёк пірог.

Рабая курка дзяўбе крупы.

Стругаў, стругаў, не дастругаў, стаў дастругваць — перастругаў.

Ткач тчэ тканіну на хустку Антаніне.

? Якім словам можна замяніць выраз «хутка, паспешліва гаварыць»?

Як вы разумееце значэнне слова *скорагаворка*?

Прачытайце самі сабе скорагаворкі. Зачытайце тыя, што найбольш спадабаліся.

Прачытайце спачатку павольна, а потым хутка скорагаворкі пра працу.

Навучыцеся чытаць скорагаворкі выразна. Вывучыце адну-дзве з іх на памяць і прагаварыце спачатку моўчкі, а потым некалькі разоў уголас.

## Загадкі з роднай хаткі.

Вадкае, а не вада, белае, а не снег.

Што ў вадзе родзіцца і ў вадзе расходзіцца?

Хто грызе, дробна жуе, сама не глытае?

Ляцелі тры галкі, селі на палкі. Адна кажа — паляжым, другая — пабяжым, трэцяя — паківаемся.

Сядзіць Пахом на кані вярхом. Сам непісьменны, а чытаць дапамагае.

Насупіцца, нахмурыцца, у слёзы ўдарыцца — нічога не застанецца.

Прыйшла чорна маці, усіх паклала спаці.

Мяту, мяту — не вымету, нясу, нясу — не вынесу.

Кругленька, залаценька — усяму свету міленька.

На паляне сіняй пасецца конь сівы.

Белая галубка ў хату ўляцела, што знала, усё расказала.

Што размаўляе на ўсіх мовах?

У лесе выразана, гладка вычасана, ажно заліваецца. Як называецца?

Чоран, ды не воран, рагат, ды не бык, шэсць ног без капыт, ляціць — вые, сядзе — зямлю рые.

Колькі на небе зорачак, столькі на зямлі дзірачак.

Стары і малы падыме, а цераз плот не перакіне.

Не рыба, а плыве, не конь, а ідзе, не піла, а рэжа.

Новая пасудзіна, а ўся ў дзірках.

Што гэта за вочы: адно свеціць удзень, а другое — уночы?

Усіх нас корміць, а сама есці не просіць.

Без кораня, а расце.

Конь бяжыць, а шкура ляжыць.

Бегла ліска каля лесу блізка, ні сцежкі, ні дарожкі, толькі залатыя рожкі.

Качка ў моры — хвост угору.

Вечарам прыляціць, ноч на зямлі праляжыць, а раніцай зноў на неба паляціць.

Стаіць дуб, на дубе дванаццаць гнёздаў, у кожным гняздзе па чатыры сініцы, у кожнай сініцы па чатырнаццаць яек, сем чорных і сем

белых.

Едзе кошка на шасці ножках, сама сёмая.

Хоць малая, ды дужая: з сабой хату носіць.

Што гэта за свінка: на спіне дзеравяшка, на жываце шчацінка?

? Прачытайце загадкі і паспрабуйце адгадаць іх. Адказы зверце з адгадкамі, што змешчаны на старонцы 296.

Знайдзіце самую лёгкую для вас загадку і самую цяжкую. Абгрунтуйце свой выбар.

Вывучыце некалькі загадак на памяць, каб загадаць іх сябрам, бацькам, знаёмым.



## Загадкі-жарты.

Што гарыць без агню?
Што бяжыць без ветру?
Хто ляціць без крылаў?
Што чорна не чэрнячы?
Што без вады плавае?
Хто малюе без рук і алоўка?
Які год цягнецца адзін дзень?
Якая ў рыбы кроў?
За чым ядуць?
На што каню хамут кладуць?
Які ў моры камень?
Пад які куст заяц садзіцца, калі дождж ідзе?
Без чаго хаты не пабудуеш?
Што стаіць пасярод зямлі?

? Прачытайце загадкі-жарты і паспрабуйце адгадаць іх. Адказы зверце з адгадкамі ў канцы падручніка на старонцы 296.

Зачытайце тыя загадкі, якія найбольш вас зацікавілі.

Правядзіце гульню «Не памыляйся!», выкарыстоўваючы гэтыя загадкі.

## Загадкі-задачы.

Сядзяць у крузе чатыры кошкі, супраць кожнай па тры кошкі. Колькі кошак разам?

* * *

Ляцелі дзве чарады гусей. Першая чарада кажа:

— Дайце нам адну гусь, тады ў нас будзе пароўну.

А другая чарада кажа:

— Дайце вы нам адну гусь, тады ў нас будзе ў два разы больш.

Колькі гусей у адной і ў другой чарадзе?

* * *

Які бацька штодня дзяцей пералічвае?

* * *

Што ў першы дзень года пачынаецца, а ў апошні канчаецца?

? Прачытайце загадкі-задачы і рашыце іх.

Знайдзіце задачу з дыялогам. Падрыхтуйцеся адказаць на пытанне: «Колькі гусей у адной і ў другой чарадзе?» Зрабіце ў сшытку малюнак па ўмове гэтай задачы.

# ТРАПНАЕ СЛОВА — МУДРАСЦІ АСНОВА.

## Прыказкі і прымаўкі.

Адклад не ідзе ў лад.

Адна пчала мёду не наносіць.

Вясенні дзень год корміць.

Гультай за работу — мазоль за руку.

Добра таго вучыць, хто хоча ўсё ведаць.

Добраму чалавеку ўсюды добра.

Добры чалавек і сабакі дражніць не будзе.

З вялікай хмары малы дождж.

З кім павядзешся, ад таго і набярэшся.

І ў вераб'я ёсць сэрца.

Кніга — маленькае аконца, ды праз яго ўвесь свет відзён.

Найлепшая вадзіца з роднай крыніцы.

Маслам кашы не сапсуеш.

Навука вочы адкрывае.

Навуку за плячыма не носяць.

Не хвалі сябе, хай людзі пахваляць.

Пад ляжачы камень вада не цячэ.
Рана ўстанеш — многа зробіш.
Сам добры — людзі добрыя.
Сябрамі не кідаюцца.
Хто язык доўгі мае, таму дрэнна бывае.
Які куст, такі і парастак.

? Прачытайце загаловак, які напісаны вялікімі літарамі. Як вы яго разумееце. Падмацуйце свае адказы прыкладамі.

Прачытайце самі сабе прыказкі на літару А (1-ы варыянт) і на літару Д (2-і вырыянт) і падрыхтуйцеся чытаць іх уголас. Якія думкі выказаў народ у гэтых прыказках?

Вывучыце на памяць дзве-тры прыказкі і прымаўкі (на выбар) і падрыхтуйцеся растлумачыць іх сэнс.





# НАРОДНЫЯ КАЗКІ.

## Лісіца і Гусак.

Неяк Лісіца злавіла Гусака і кажа: «Гусак, Гусак, я цябе з'ем!» Засмуціўся Гусак, а рабіць няма чаго. Вось ён і гаворыць: «Хай будзе так, Лісічка. Толькі дазволь мне перад смерцю патанцаваць».

Ліса адказвае: «Танцуй сабе, а з'есці я цябе яшчэ паспею».

Гусак пачаў махаць крыламі ды з нагі на нагу пераступаць.

Глядзіць Лісіца на Гусака і смяецца: «Вось дык Гусак! Вось дык танцор!»

А Гусак крыламі махаў, махаў, з нагі на нагу пераступаў, а потым падняўся ў паветра і паляцеў.

Так і засталася Лісіца з разяўленым ротам.

Прачытайце словы пад малюнкам. Як вы разумееце іх сэнс? Чаму казкі называюцца народнымі?

Прачытайце казку «Лісіца і Гусак» і адкажыце на пытанне: чаму Лісіца засталася з разяўленым ротам?

Падрыхтуйцеся да падрабязнага пераказу казкі «Лісіца і Гусак».

Зрабіце ў сшытках свае малюнкі да казкі.

## Зайчыкі.

*Апрацоўка Якуба Коласа.*

Селі два зайчыкі ў лясочку пад бярэзінкаю, грэюцца на сонейку і гутараць.

А ў лясочку так добранька!.. Мушкі гудуць, адна за адною ганяюцца, крыльцамі звоняць, як бы смяюцца. А там дроздзік пасвіствае, хлопчыка Піліпку падражнівае:

— Піліп! Піліп!

А Піліпка па верасочку з кошыкам ходзіць, на баравічкі прыглядаецца.

Яшчэ далей зязюлька кукуе.

Ну так ясна, цёпла, весела!

Але нявесела зайчыкам, невясёлыя гутаркі іх.

— Ох, якая горкая долечка наша, — кажа адзін зайчык. — Бойся кожны дзянёчак, трасіся кожную часінку, хадзі, прыслухоўвайся, ці не ходзіць вораг твой блізка.

— А колькі ў нас ворагаў! Хто толькі не крыўдзіць нас, бедных зайчыкаў!

— Крыўдзяць нас людзі, крыўдзяць звяры; нават птушкі-драпежнікі — каршуны, совы,



пугачы — і тыя нас, зайчыкаў, ушчуваюць.

— І як бараніцца нам ад злых нашых ворагаў? Чым ратавацiся? Адна толькі надзея на нашы ножкі: выбавяць з бяды — наша шчасце, а не выбавяць — прапала наша скурка!

І заплакалі горкенька зайчыкі.

Плачуць і слёзкі лапкамі выціраюць.

— Ці ж можна нам жыць на свеце? — кажа другі зайчык.

— Ніхто не баіцца нас, — ну, ніхтосенькі! Пойдзем, хіба, ды ў ваду кінемся.

Наплакаліся, надумаліся бедныя зайчыкі і пайшлі ў возера тапіцца з гора. Прыйшлі да возера, прыпыніліся, развіталіся. Да самага беражка падышлі, каб у ваду кінуцца, аж бачаць — скок жаба на купіну: убачыла зайчыкаў і спалохалася.

— Эге, — кажа адзін зайчык, — ёсць жа на свеце стварэнні, што і нас баяцца. Відаць, ім яшчэ цяжэй на свеце жыць.

Глянулі зайчыкі адзін на аднаго і пабеглі назад.

? Якую невясёлую гутарку вялі зайчыкі? Зачытайце.

Якімі словамі перадаюцца страх і гора зайчыкаў?

Знайдзіце ў тэксце выразы: *крыльцамі звоняць, трасіся кожную часінку, выбавяць з бяды, тапіцца з гора, у ваду кінуцца.* Падрыхтуйцеся адказаць, як вы разумееце іх.

Хто прызнаў сілу зайчыкаў? Як гэта адбылося?

Знайдзіце сказы, якімі можна падпісаць малюнак, і зачытайце іх.

Дома падрыхтуйце падрабязны пераказ казкі.

## Хітры вол.

*Апрацоўка Алеся Якімовіча.*

Пайшоў вол сена касіць. Косіць, завіхаецца, на неба пазірае: ці не відаць адкуль хмары? «За пагоду, — думае, — сена насушу, стог скідаю, тады і зіма не страшна».

Ідзе воўк. Заглядзеўся на вала.

— Ты бык? — пытаецца.

— Не, я вол.

— Сена косіш?

— Кашу.

— Рагамі грабеш?

— Грабу.

— Хвастом падграбаеш?

— Падграбаю.

— А мяне ты не баішся?

Падумаў вол і кажа:

— Я не толькі цябе, а і двух такіх не баюся!

Паверыў воўк і пайшоў шукаць сабе падмогі. Прыходзіць на другі дзень з двума братамі.

— Ты бык? — зноў пытаецца.

— Не, я вол.

— Сена косіш?

— Кашу.

— Рагамі грабеш?

— Грабу.

— Хвастом падграбаеш?

— Падграбаю.

— А трох нас ты таксама не баішся?

Што валу рабіць? Давай ён далей хітрыць.

— Не толькі трох, — кажа, — а і чатырох не баюся.



Паверылі ваўкі і падаліся шукаць новых сяброў.

Доўга шукалі. Нарэшце прыходзяць на балота цэлаю чарадою. Глядзяць, а там ужо стог сена стаіць і вала не відаць.

Кінуліся ваўкі па следзе і прыбеглі да двара, дзе вол жыў. Двор вала высокім частаколам абгароджаны.

Круціліся, круціліся ваўкі, скакалі, скакалі, ды так да вала і не дабраліся.

— Ага, — закрычалі яны са злосці, — ты, баязлівец, схітрыў!

— Схітрыў ці не схітрыў, — адказаў вол, — а стог сена за пагодай накасіў. Ды і шкура ад вашых воўчых зубоў цэлая засталася.

І павалакліся ваўкі прэч, хвасты падцяўшы.

? Чаму казка называецца «Хітры вол»?

Прачытайце казку самі сабе і знайдзіце ў тэксце словы, якія паўтараюцца.

Як называецца тэкст, у якім перадаецца размова дзвюх ці болей асоб? Зачытайце выразна дыялогі паміж валом і ваўком.

Разгледзьце малюнак да казкі і знайдзіце ў тэксце словы, якімі можна падпісаць малюнак.

* Знайдзіце словы ў тэксце, якія раскрываюць галоўную думку казкі.

Прачытайце канцоўку казкі і зрабіце да яе малюнак.

Прачытайце казку некалькі разоў і коратка перадайце яе змест.



# І восень на прызбу ступіла…

*Раіса Баравікова*





## Восеньскія весткі.

*Васіль Вітка.*

Лета яшчэ было ў самай пары сваёй спеласці. Аднак, досвіткам прачнуўшыся і зірнуўшы ў чыстае неба, я адчуў: нешта такое адбылося, што раптам змяніла і настрой паднябеснай прасторы, і ціхі пошум яшчэ густых і зялёных дрэў. І ўсё ніяк не мог уцяміць — доўга і пакутліва: што ж адбылося, што змянілася?

І толькі калі на маладой арабінцы, ужо зачырванелай гронкамі ягад, убачыў увішную, гарэзлівую сінічку, пачуў яе звонкі сярэбраны залівісты галасок, зразумеў, чаго не хапала гэтай раніцы. Урачыстых, радасных воклічаў маладых ластавак, што навучыліся ўжо лятаць і заўсёды першымі сустракалі досвітак. Значыць, маладыя ўжо дасканала навучыліся

лятаць і старыя ўпэўнена разам з імі выправіліся ў далёкую дарогу.

Ластаўкі зніклі. І глыбока ў душы варухнулася трывога. Чаму ж так рана, яшчэ ў зусім цёплую пару, калі ў самай сіле шчодрае лета, калі яшчэ так многа блакітнага прастору і спелага сонца?

Мабыць, яны ўсё ж болей прадбачлівыя, чым людзі, і ўжо загадзя, за многія сотні і тысячы вёрст адчулі, што ідзе восень.

---

**Слоўнік.**

Пошум — ціхі шум.

Досвітак — час перад самым світаннем.

? Прачытайце ў слоўніку словы і іх тлумачэнні. Знайдзіце гэтыя словы ў тэксце разам з тымі, якія дапамагаюць лепш зразумець іх значэнне.

Пра якія восеньскія весткі гаворыцца ў тэксце?

На старонцы 38 знайдзіце прыкметы восені, якімі можна было б дапоўніць тэкст. Зачытайце.

* Прачытайце два апошнія абзацы тэксту і адкажыце, чаму ў душы пісьменніка варухнулася трывога.

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання.

## Адшумела лета.

*Сяргей Грахоўскі.*

Адшумела лета
Роснымі лугамі.
Апусцела поле,
Нівы адцвілі.
Праплываюць хмары
Нізка над стагамі,
І ляцяць у вырай
З крыкам жураўлі.
Не сціхае вецер
Над асеннім полем,
За ракой
Рыбацкі аганёк патух,
І ляціць паволі
Ад старой таполі,
Кружыць над дарогай
Белы-белы пух.



На рабіне скачуць
Шустрыя сініцы.
Пад дажджом намоклі
Клёны і дубы,
Наліліся сокам
Спелыя брусніцы,
І каля дарогі
Выраслі грыбы.

Заліваюць пчолы
Чыстым воскам соты,
І да кожнай хаты
Нашага сяла
З дружнаю работай,
З добрым умалотам,
Выспеўшы на сонцы,
Восень надышла.

Кружыць вецер лісце,
Завывае ў полі.
Змоўклі перапёлкі,
Жаваранак змоўк —
Адшумела лета.
Ды звініць у школе
І за парту кліча
Раніцай званок.

? З якім пачуццём паэт піша пра адшумелае лета? У якіх радках верша гэтае пачуццё перадаецца асабліва яскрава?

Прачытайце верш і выдзеліце радкі, якія перадаюць сумны і разам з тым радасны настрой надыходу восені.

* Супастаўце тэкст верша «Адшумела лета» Сяргея Грахоўскага з тэкстам Васіля Віткі «Восеньскія весткі», знайдзіце ў іх агульнае і рознае.

Вывучыце верш (увесь альбо частку) на памяць.





## У верасні.

*Артур Вольскі.*

У верасні,
у верасні
хапае ўсім турбот.
Дзятва да школы
ў верасні
спяшаецца штогод.
У верасні,
у верасні
зрабіўся дзень малы.
Развітваюцца
ў верасні
з буслянкамі буслы.
Рассекшы хмару ўзмахамі,
клін журавуліны знік.
А ўсё чуваць над дахамі
птушыны сумны крык.

У верасні,
у верасні
стаў лес зусім рабы.
Вавёрачка
ў верасні
дасушвае грыбы.
І вожык
устрывожаны.
А знаеце — чаму?
Бо трэба ложак вожыку
заслаць на ўсю зіму.

У верасні,
у верасні
хапае ўсім трывог.
Мядзведзіца
у верасні
вышуквае бярлог.
Медзведзяняты жвавыя
да самае вясны,
расстаўшыся з забавамі,
глядзець там будуць сны.

У верасні,
у верасні
турбот — паўнюткі рот.
І я раблюся
ў верасні
старэй на цэлы год.

## У арэхах.

*Рыгор Ігнаценка.*

Пайшлі мы аднойчы з Кастусём у арэхі. Па дарозе дамовіліся ніводнага арэха не есці, каб потым палічыць, хто болей нарваў.

Ціха ў канцы лета ў лесе. Хіба толькі дзе мыш у апалым лісці піскне ці вецер у верхавінах дрэў прашуміць. Пракоціцца марской хваляй і тут жа сціхне.

Праз нейкі час, чую, справа арэх шчоўкнуў. Значыць, усё ж Кастусь не ўтрымаўся, каб не паспытаць. Потым другі шчаўчок, трэці. Я ж трымаюся, не спрабую. Няхай, думаю, тады паглядзім, у каго болей будзе.

А Кастусь, між тым, усё грызе арэхі ды грызе. Я памацаў: амаль ужо дзве кішэні поўныя. Ну што ж, думаю, зараз можна і мне паспытаць. Сарву шышачку — што ў кішэню, а што — у рот.

Доўга я так арэхі рваў. А Кастусь увесь гэты час грыз іх.

Нарэшце вырашыў я паглядзець. Можа, у яго там арэхаў процьма, што ён есць іх не шкадуючы?

Падыходжу асцярожна да куста, дзе арэхамі шчоўкаюць. Гляджу — аж гэта ніякі не Кастусь, а вавёрка. Паважна сядзіць на шырокім пні і арэх грызе. А што за прыгажуня! Футра на ёй рыжае, грудкі снежна-белыя, мяккі пушысты хвост, вялікія цёмныя вочкі. Так і хочацца падысці да звярка ды па мяккай поўсці пагладзіць.

Пераможцам, вядома, Кастусь стаў. Як і дамовіліся мы, ён ніводнага арэха не з'еў.

? Пра што цікавае даведаліся вы з гэтага апавядання?

Творы якіх пісьменнікаў пра жывёл вы чыталі ў падрыхтоўчым класе? Які твор найбольш запоўніўся? Чым?

Хто галоўны герой апавядання?

* Знайдзіце апісанне вавёркі і прачытайце яго. Апішыце вавёрку, карыстаючыся малюнкам і ўжываючы словы з тэксту.

Падзяліце тэкст на часткі згодна з планам і зачытайце іх: 1. Хлопчыкі пайшлі ў арэхі.
2. Шчоўкнуў арэх.
3. Сустрэча з вавёркай.
4. Кастусь не падмануў.

Падрыхтуйцеся да вуснага пераказу апавядання.



## Хлебная скарынка.

*Авяр'ян Дзеружынскі.*

Пахне
хлебная скарынка
цёплым ветрыкам,
хваінкай,
летнім дожджыкам
грыбным,
лугам,
полем іржаным,
і асенняй пазалотай,
ды натхнёнаю
работай.



? Чым пахне хлебная скарынка? Зачытайце.

* Як хлеб на стол прыходзіць? Ці ведаеце вы? Раскажыце.

У якіх радках верша гаворыцца, што хлеб — гэта вынік працы многіх людзей?

Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся да выразнага чытання ўголас.

Завучыце верш на памяць.

# Хто вінаваты?..

*Анатоль Жук.*

Хлопчык ніяк не мог зразумець, чаго ад яго хочуць.

Што ён, урэшце, такое зрабіў? Вазу крыштальную разбіў? Ці новую мэблю цвіком падрапаў?.. Падумаеш, у абед скарыначкай хлеба запусціў у Рубіка — сабачку, якога падарыў яму тата. Ды і зрабіў гэта не са злосці. А так, каб не сумна было абедаць. Рубік забег з пакоя ў кухню, а ён — раз! — і кінуў. Вось і ўсё. І болей нічагусенькі.

Толькі дзядуля з бабуляй чамусьці адразу перасталі есці, а потым дзядуля ціха сказаў:

— Прасі прабачэння...

Хлопчык незадаволена надзьмуўся, але вылез з-за стала, падышоў да дзядулі з бабуляй і, гледзячы ў падлогу, прамармытаў:

— Даруйце... Я болей не буду...

— Не-не, — паспяшаўся спыніць хлопчыка дзядуля. — Не ў нас, а ў яго прасі прабачэння...

Хлопчык падышоў да Рубіка, які зашыўся ў кут каля дзвярэй і вінаватымі вачыма сачыў за ўсім, што адбывалася на кухні.

— Даруй мне, Рубік... Я болей не буду...

Але дзядуля зноў яго перапыніў:

— Не-не... Ты і зараз, мусіць, не зразумеў. У хлеба прасі прабачэння... У хлеба...

І вось гэтага хлопчык ніяк не мог зразумець. Можа, ён недачуў? Ці, можа, дзядуля агаварыўся?

А дзядуля быццам здагадаўся пра яго думкі, яшчэ раз пацвердзіў свае словы:

— Так-так, у хлеба... Падымі і прасі прабачэння...

Як можна прасіць прабачэння ў хлеба?! Ён жа — нежывы! Не дыхае і не размаўляе. Не смяецца і не плача... Гэта ў людзей можна прасіць прабачэння. Ну, няхай нават у жывёл, у птушак — яны таксама жывыя. А ў хлеба?.. Ён кожны дзень бачыць, як кідаюць хлеб у скрынкі для смецця, проста на зямлю, у гразь... І ніхто не просіць прабачэння. А калі так робяць, значыць, хлеб — дробязь. Усё

адно як той камень ці пясок... Адным словам — мёртвая рэч! А тут — прасі прабачэння...

Хлопчык падняў скарыначку і заплакаў: ён не ведаў, за што павінен прасіць прабачэння ў хлеба.

А хто вінаваты?..

? Якія месцы ў тэксце выклікалі ў вас асуджэнне паводзін хлопчыка? Перачытайце іх.

* Чаму дзед прымусіў унука прасіць у хлеба прабачэння? Якія словы тэксту пра гэта гавораць?

Чаму хлопчык не хацеў прасіць у хлеба прабачэння? Пастарайцеся пацвердзіць словамі тэксту.

Чаму апавяданне называецца «Хто вінаваты?»

Намалюйце слоўную карціну да тэксту.

Навучыцеся выразна чытаць твор. Падрыхтуйцеся коратка перадаць яго змест.



## Хто галоўны.

*Леанід Улашчанка.*

Ні для каго не сакрэт, што спрэчкі былі, ёсць і будуць. Але спрэчка спрэчцы розніца. І пачынаюцца яны часцей за ўсё праз драбязу.

Аднаго разу ў нядзельку, акурат перад самым абедам, стравы, што стаялі на святочным стале, заспрачаліся, хто з іх самы галоўны. Трэба сказаць, што гаспадыня, якая гатавала іх, была жанчына працавітая і святочны абед удаўся на славу. Як кажуць: «Паспытаеш — пальчыкі абліжаш». Вядома, пальцы не трэба аблізваць, гэта непрыгожа. Выхаваны чалавек ніколі таго не робіць. Але не гэта галоўнае. Справа ў тым, што кожная страва лічыла сябе галоўнай. Грэцкая каша, якая стаяла ў вялікай прыгожай місе, раптам пыхнула парай і сказала:

— Слухай, падліўка, адсунься крыху ўбок, ад цябе занадта пахне цыбуляй і перцам. Гэта можа пашкодзіць майму смаку. Ты ж бачыш, што ў мяне ўжо ўторкнулі лыжку, каб раскласці



па талерках. І наогул, трэба быць больш сціплай у прысутнасці галоўнай стравы.

Што тут пачалося! Нават у казцы цяжка расказаць.

Падліўка ад такой знявагі аж зацягнулася зверху танюткай плеўкаю. Салата, якая стаяла недалёка ад яе, пазелянела ад злосці. Добра, што смятана яе крыху ахаладзіла. Інакш невядома, чым бы гэта ўсё скончылася.

Фаршыраваны шчупак наважыўся нешта сказаць. Але тут яму ў пашчу ўторкнулі галінку пятрушкі. Заліўная ялавічына блішчала, нібы лёд, і грозна зыркала маркоўным вокам на ўсіх, хто надта гарачыўся і пыхкаў парай. Яна баялася, каб не растаў студзень, якім яна была залітая.

Цыбуля і часнок ледзь не перамаглі ўсіх. Вядома, удваіх! Нездарма кажуць: часначок — цыбульчын брат. Але грэцкая каша не здавалася.Яна пыхкала парай то ў адзін, то ў другі бок.

— Хіба вы не ведаеце, што я самая паважаная з усіх нас, самая пажыўная, самая смач-

ная. Я нават у дыету ўваходжу.

Гарошак, які быў у мясной салаце, запярэчыў:

— А я?

— Памаўчаў бы лепш! Ты яшчэ зялёны зусім, а туды ж — у галоўныя.

— Без мяне, — сказала бульба, — ніколі ніхто не абыходзіўся. З мяне можна прыгатаваць трыста восемдзесят розных страў, і то я не выхваляюся, як ты, каша... Гэй вы, дранікі, чаму вы маўчыце? Хіба мы не радня?

Дранікі былі лянівыя. Адно толькі іх турбавала: хоць бы не страціць свайго цяпла. Бо што ж гэта за дранікі — халодныя?

А грэцкая каша зноў пачала:

— Ты, бульба, памаўчы! Табой і свіней, і жывёлу розную кормяць. А я толькі для людзей. Вось і выходзіць, што я самая галоўная.

— Не вельмі выхваляйся. Ты забылася, што бываеш і размазнёй, — кісла зазначыла капуста.

Тут пачалі да гаспадыні збірацца госці.

— А давайце дамовімся, — прапанавалі

раптам агуркі, — каго першага возьмуць людзі ў рукі, той і галоўны.

На тым і пагадзіліся.

Гаспадыня запрасіла гасцей да стала. Рассядаліся нетаропка. Нарэшце госці паселі. На чале стала сядзеў самы старэйшы і паважаны ўсімі дзед. Ён агледзеў стол, запытаўся, ці ў кожнага ўсё ёсць. Яшчэ раз зірнуў на стол і ўсміхнуўся.

— Гаспадынька, я нешта не бачу на стале самага галоўнага...

— Чаго? — падхапілася паружавелая жанчына.

— Паглядзі сама і ўбачыш.

Гаспадыня акінула ўважлівым вокам стол і пляснула далонню аб далонь.

— А мамкі мае, зязюлькі! Гэта ж трэба — хлеб не паставіла. Так закруцілася, што і пра галоўнае забылася!..

Людзі за сталом заўсміхаліся, павесялелі, а жанчына прынесла вялікі бохан свежага духмянага хлеба і падала дзеду.

Той узяў востры нож і пачаў луста за лустай

кроіць яго. Рукі ўсіх самі сабой пацягнуліся да хлеба.

Усе стравы прыціхлі.

Хлеб! Ён ніколі не прыядаецца і ніколі не лішні, колькі б яго ні было. Ён і ёсць усяму галава.

## Прытворка.

*Іван Муравейка.*

Захварэў раптоўна,
Захварэў сур'ёзна.
На ўсю хату стогне,
Енчыць, плача слёзна:
— У мяне —
балячка,
У мяне —
гарачка,
У жываце —
буркота,
Есці неахвота...

На дварэ ўжо раніца
Сонцам разгараецца.
Мама з бабай раяцца,
Як з хваробай справіцца:
— Трэба даць уколы
Беднаму Міколу.

А Мікола:
— Што вы!
Я даўно здаровы.
З ложка ўсхапіўся,
За партфель
   схапіўся:
— Не жадаю ўколаў,
Лепш пайду я ў школу!..

? Пра што расказвае гэты верш?

Якія словы дапамагаюць зразумець прытворства Міколы? Пры чытанні верша вымаўляйце іх больш гучна.

Што вы ўяўляеце, калі чытаеце апошні слупок верша?

Прачытайце верш самастойна і падрыхтуйцеся да выразнага чытання.

## Прынцэса Нехачу.

(Казка.)

*Лідзія Арабей.*

Жыла-была на свеце прынцэса, і звалі яе Нехачу. Раніцаю слугі будзяць яе, а прынцэса крычыць:

— Не хачу ўставаць!

І валяецца ў пасцелі, пакуль бакі не адлежыць ды есці не захоча. Толькі тады ўстае.

Слугі ёй тазік з вадою нясуць, кавалачак мыла пахучага, каб умылася пасля сну. А яна тое мыла ў тазік — боўць:

— Не хачу ўмывацца!

Паснедае прынцэса кісялямі ды пірагамі — за ўрокі пара брацца. Слугі ёй кніжкі, сшыткі падаюць. А яна зноў:

— Не хачу вучыцца!

Ішлі гады, прынцэса падрастала, вось ужо і замуж ёй пара. Але хто возьме такую — нямытую ды невучоную?

Бацькі самі ўжо рады збыць прынцэсу са двара. Падгаварылі яны слуг, тыя схапілі прын-

цэсу, сілком памылі, прычасалі, у прыгожую сукенку прыбралі, на багатае крэсла пасадзілі. І пачалі кавалераў зазываць.

Прыскакаў на кані каралевіч з Заходняга каралеўства. Прынцэса глянула на яго і скрывілася:

— Не хачу за яго замуж, у яго нос доўгі!

Пакрыўдзіўся каралевіч, паскакаў назад у сваё каралеўства.

Прымчаўся на аленях царэвіч з Паўночнага царства. Глянула на яго прынцэса і зморшчылася:

— Не хачу за яго замуж, у яго вочы касыя!

Пакрыўдзіўся царэвіч, памчаўся назад у сваё царства.

Прыехаў на вярблюдзе хан з Паўднёвага ханства. Глянула на яго прынцэса і губы закапыліла:

— Не хачу за яго замуж, у яго рот крывы!

Пакрыўдзіўся хан, паехаў назад у сваё ханства.

Хутка па свеце пагалоска пайшла, што прынцэса ўсім кавалерам адмаўляе, і перасталі

ездзіць да яе ў сваты. Яна і сама ўжо сядзіць, чакае, можа яшчэ хто прыедзе. Але болей ніхто не паказваецца.

Раззлавалася прынцэса, перастала ўмывацца і прычэсвацца, яшчэ з большаю злосцю крычала ўсім:

— Не хачу!

А гады каціліся, каціліся. Ужо і бацькі памерлі. Слугі не захацелі служыць такой прынцэсе і паразбягаліся. Засталася яна адна ў вялізным палацы. Палац той за гады састарэў — столь у пакоях пакрывілася, падлога паламалася, печы пахіліліся. І сама прынцэса састарэла — валасы пасівелі, твар зморшчыўся, спіна сагнулася. Ходзіць адна па цёмным палацы ў падраным адзенні, і толькі совы ды кажаны вакол яе лятаюць.

Усе людзі гаварыць пачалі, што ў палацы жыве злосная ведзьма. А хто бачыў яе зблізку, ніколі не мог падумаць, што некалі гэтая ведзьма была прынцэсаю.

# Сур'ёзная размова.

*Пятро Рунец.*

Грышка Сапун вучыцца не дужа старанна, таму і адзнакі ў дзённіку розныя.

Аднаго дня ён прыйшоў са школы, кінуў на канапу ранец і рашуча заявіў:

— Мама, у школу я больш не пайду!

— Чаму? — здзівілася маці.

— Я... не ўмею вучыцца. Пяцёрак мне не ставяць, а двоек сам не хачу. Навошта, каб з мяне смяяліся, двоечнікам называлі...

Маці спахмурнела і задумалася: што сказаць сыну? Потым прысела на канапу, абняла Грышку і лагодна загаварыла:

— Ну што ж, дзіцятка, сядзі дома. Толькі чым жа ты будзеш займацца, калі мы з татам пойдзем на работу?

Грышка падумаў і адказаў:

— Пагуляю на вуліцы адзін. А калі прыйдуць са школы сябры, пабягу да іх...

Маці не дала яму дагаварыць:

— Ты думаеш, хлопцы будуць бегаць з

табою па вуліцы? Ім жа трэба рыхтаваць урокі. А даведаюцца, чым ты заняты, пачнуць пальцам на цябе паказваць: «Во які! Замест таго, каб вучыцца, у цацкі гуляе...»

Грышку непрыемна было слухаць горкія словы, і ён аж закруціўся на канапе.

— Падумай сам, — працягвала маці, — усе дзеці ходзяць у школу, адзін ты сядзіш дома. Хто на доктара потым вывучыцца, хто на настаўніка, хто на камбайнера... А ты кім будзеш?

Грышка задумаўся. Сапраўды, кім ён будзе, калі вырасце? Як будзе жыць? Але тут яму ўспомнілася бабуля, і ён адразу павесялеў:

— Мама, а бабуля наша не вучылася, ніводнай літаркі не ведае, а жыве.

— Эх, сынок, гаворыш ты абы-што, — уздыхнула маці і з жалем дадала: — Бабуля, калі хочаш ведаць, вельмі хацела вучыцца, ды школ тады для бедных не было. Таму і засталася непісьменнай. Затое пазней вывучыла сына свайго, твайго бацьку, і ён цяпер корміць яе. А ці зможаш ты, невук, карміць

нас, тату і мяне, калі састарымся?

Грышка скасавурыўся і глядзеў на маці так, быццам бачыў яе ўпершыню. Гэтак сур'ёзна з ім яшчэ не размаўлялі.

— Дык што мне рабіць, мама? — разгубіўся ён. — Двоек я не хачу.

— У цябе, сынок, ёсць адна паганая хвароба — гультайства. Таму і атрымліваеш дрэнныя адзнакі. Вазьміся за вучобу, як Толя, твой сябрук, і ў тваім дзённіку таксама з'явяцца чацвёркі і пяцёркі!

Матчыны словы кранулі за жывое. Няўжо ён, Грышка Сапун, горшы за Толю? І, не сказаўшы ні слова, ён узяў ранец і пайшоў у другі пакой — рабіць урокі.

? Чым была раззлавана Грышкава маці? Што яна яму сказала?

Якія словы непрыемна было слухаць Грышку? Над чым задумаўся Грышка і што ён адказаў маці? Прачытайце.

* Чаму твор называецца «Сур'ёзная размова»? Якія іншыя загалоўкі можна было б даць яму?

# Нарэшце зразумеў.

*Павел Кавалёў.*

Маці паслала Цімку купіць батон. Каля самага магазіна ён дагнаў незнаёмага дзядулю. Не паспеў стары пераступіць парог, як Цімка, штурхануўшы яго, прашмыгнуў наперад. Стары лёгенька, але з яўным намёкам стукнуў Цімку кійком па спіне. Хлопчык азірнуўся: за што? А дзядуля, не хаваючы хітрынкі ў вачах, моўчкі пайшоў да прылаўка.

Вярнуўшыся дамоў, Цімка расказаў маці пра здарэнне ў магазіне.

— Цікава, — усміхнулася маці.

— Што цікава? — перапытаў Цімка.

— Ды тое, што з табою адбылося.

— Чаго ж той дзед мяне зачапіў?

— А ты не зразумеў?

— Не...

Маці хацела, каб Цімка сам пра ўсё здагадаўся. Але той маўчаў.

— Крыўдна мне за цябе, сынок.

— Чаму?

— Што ты такі някемлівы...

Цімка ледзь не плакаў: ён нічога не разумеў.

Тады маці сказала:

— Ты, сынок, пакрыўдзіў старога чалавека. Павінен быў прапусціць дзядулю першым. Трэба дарослых, асабліва старэйшых, паважаць.

— А-а, — нарэшце зразумеў Цімка.

? Што вы можаце сказаць пра паводзіны Цімкі ў магазіне?

За што дзядуля пакараў хлопчыка? Знайдзіце радкі ў тэксце і зачытайце іх.

Што нарэшце зразумеў Цімка? Пацвердзіце словамі з тэксту.

Прачытайце тэкст самастойна і падрыхтуйцеся пераказаць яго па плану:

1. Здарэнне ў магазіне.
2. Размова маці з сынам.
3. Здагадаўся.



## Добрыя суседзі.

*Рыгор Барадулін.*

Жыў-быў добры дзядзька Дзякуй,
ненавідзеў пусталыг,
выпускаў ён з хаты Дзягу,
калі крыўдзіў хто малых.

Забіяку, задзіраку
ён прагоніць ад дзяцей.
Толькі чутна: — Дзякуй, Дзякуй,
хочам бачыць вас часцей.

І суседка ў старога
несварлівая была —
Каліласка. Праз дарогу
многа-многа год жыла.

Не даюць нікога крыўдзе,
Ні грызні ў іх, ні пакут.
Толькі Дзякуй з хаты выйдзе —
Каліласка тут як тут.

Каліласка ў шлях выходзіць,
дзядзька Дзякуй — наўздагон.
У лагодзе, ў добрай згодзе
і жывуць да гэтых дзён.

---

**Слоўнік.**

Пусталыга — той, хто кідае словы на вецер, пустабрэх.

## Светлым раннем.

*Янка Брыль.*

Некалькі дзён быў дождж, а сёння свеціць сонца. І гэта вельмі добра!

Дзяўчынка Люся з татам ходзяць па лесе. Ёй усё прыемна, — і што сонейка свеціць, і што навокал лес, і што ў руках яе — вялікі баравік. Белую таўстую ножку яго Люся трымае аберуч. А над ручкамі Люсі — шапка баравіка, падобная на круглую, прыпечаную зверху булку.

Люся ніяк не можа дагнаць свайго тату. Ён збірае грыбы і ўсё лезе туды, дзе густа стаяць калючыя елачкі, куды Люсі не хочацца лезці.

— Тата! — крычыць яна час ад часу. — Ідзі па дарожцы!

Дарожкі тут няма, а скрозь трава вераса. Ды Люся лічыць дарожкай тое месца, дзе елачкі не загароджваюць ёй шлях.

Але вось тата гукае:

— Люся! Бяжы сюды!

Люся не лезе ў елачкі — яна аббягае іх.

— Ну, Люся, знайдзі грыбок! — гаворыць тата.

— А гэты? — пытаецца Люся, выставіўшы перад сабой свой вялікі баравік, якім заняты ў яе абедзве рукі.

— Гэты кладзі мне ў кошык.

У татавым кошыку многа грыбоў. Усе яны — баравікі з карычневымі шапкамі. Люся кладзе на іх свой баравік. З пустымі, свабоднымі рукамі ёй робіцца яшчэ весялей. Яна выцірае рукі адна аб адну і гаворыць:

— Я знайду яго, тата. Праўда?

Баравічок схаваўся ў верасе. Вакол яго — тры елачкі, калючыя лапы якіх звісаюць да самай зямлі. Баравічок зусім малы. Ён вырас, мусіць, толькі сёння ноччу. На карычневай шапцы яго прыліп сухі вялікі ліст. Грыбок нібы накрыўся ім, каб лепш схавацца.

— Ну, лезь, дачка, сюды, пад елачкі! Ён там!

Люся становіцца на калені, апускаецца рукамі на траву і лезе пад елачкі на чатырох нагах, як кошка. Вочы ў Люсі, вядома, заплюшчаны. Яна расплюшчвае іх, калі голле елачак канчаецца.

— Грыбок! — крычыць яна і аберуч хапаецца за белую таўстую ножку баравіка. — Я сама знайшла яго! Праўда?

Грыбок вельмі прыгожы. Яго малая карычневая шапачка падобна не на круглую булку, а на каштан. Такія каштаны Люся знаходзіла летась у садзе сваёй бабулі.

— Ідзем, тата, яшчэ знойдзем. Праўда?

Тата бярэ свой кошык з баравікамі, і яны ідуць далей па лесе. Тата зноў лезе ў зараснік,

а Люся стаіць на палянцы з баравіком у руках і чакае.

? Пра што апавядаецца ў гэтым творы? Якія месцы вам больш за ўсё спадабаліся? Зачытайце.

Як апісаў аўтар збор грыбоў? З якім пачуццём ён піша пра гэта? Прачытайце.

Як Люся знайшла грыбок?

Зачытайце ў тэксце апісанне баравіка.

Складзіце сваё вуснае апавяданне «Збор грыбоў».



## Восень.

*Сяргей Новік-Пяюн.*

Восень, восень залатая
Сее радасць на зямлі,
Хмарка ў сінім небе тае,
Мкнуць у вырай жураўлі.

Я іду лясною сцежкай,
Як па мяккім дыване.
Восень з ветлівай усмешкай
На спатканне выйшла мне.

Ярка, хораша прыбрала
Усюды дрэвы і кусты
І зямлю памалявала
У колер жоўта-залаты.

? Чым уразіла аўтара восень? Як ён сустракае яе?

З якім пачуццём паэт піша пра восень?

Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся да выразнага чытання ўголас.

## Чатыры пажаданні.

*Васіль Вітка.*

Добра, калі ты змалку
Можаш вітаць людзей.
Раніцай: — Добрага ранку!
І апаўдня: — Добры дзень!
Увечары пры сустрэчы
Знаёмым сказаць: — Добры вечар!
А соннаму сонейку нанач
І ўсім добрым людзям: — Дабранач!



? Якія яшчэ прывітальныя словы вы ведаеце? Калі іх гавораць?

З якім пачуццём трэба гаварыць і чытаць прывітальныя словы?

Прачытайце верш спакойна, выдзяляючы голасам прывітанні.

## Колькі кошак у кашы?

*Рыгор Барадулін.*

Берагам ішоў Цімошак,
Нёс цяжкі лазовы кошык.
Варушыўся дужа кошык —
Там сядзела многа кошак.
Адпачыць схацеў Цімошак,
Задрамаў —
Раскрыўся кошык.
Кошкі хітрыя паволі
Разбрыліся ўсе па волі.
Кошка першая пайшла
Частавацца да бусла.
Пачастунак надта слабы —
Не да смаку кошцы жабы.
А другая кошка — Мурка
З вераб'ём гуляла ў жмуркі.
Дзве схаваліся за горкай,
Дзве сачылі
За вавёркай,
Дзве збаяліся ваўкоў,

Хвост на плечы —
І дамоў!
Спаў Цімошак дацямна,
Засталася з ім адна.
Ты падумай і скажы,
Колькі кошак у кашы?

? Колькі кошак у кашы?

Знайдзіце словы, якія адрозніваюцца адной літарай? Зачытайце.

Прачытайце тэкст самі сабе і падрыхтуйцеся да чытання ўголас.



# Каток і мышка.

*Леанід Улашчанка.*

Злавіў каток мышку і збіраўся паснедаць. Мышка пачала горка плакаць.

— Якая ж я няшчасная! І чаму ж мне так не шанцуе? Лепш бы мяне з'ела ліса або калючы вожык, усё б лягчэй на душы было.

— Чаго гэта ты так галосіш? Чым кепска, што я з'ем цябе? — запытаў каток.

— Яшчэ пытаецца! — адказала мышка. — Зірні на сябе. Вусы доўгія, лапы брудныя, зубы нячышчаныя. Каму гэта прыемна гінуць ад бруднага, неахайнага ката? — і яна зноў горка заплакала, прамаўляючы: — А футрачка ж маё чысценькае! А я ж кожную ранічку цябе мыла!

— Ну, не галасі так жаласліва, — супакойвае яе каток. — Вось зараз памыюся і буду не горшы за тую лісу ці вожыка.

Сеў каток на заднія лапкі і пачаў мыцца.

Язычком лапку паліжа, па вусіках правядзе і пытаецца ў мышкі:



— Ну, як? Чысты я ці не?

— Не, не чысты, — адказвае мышка. — Ты яшчэ вочкі не працёр і за вушкамі не памыў, адна лапка ў цябе бруднейшая за другую.

— Ну, — кажа каток, — зараз так памыюся, што буду самы чысты ў свеце.

І давай лапкі аблізваць ды па пысцы сваёй вадзіць, і па вочках, і па носіку, і нават за вушкамі памыць стараецца.

А мышцы толькі гэта і трэба было. Шмыгнула яна ў норку і цікуе адтуль, як каток завіхаецца.

Скончыў каток мыцца і пытаецца ў мышкі:

— Ну, як? Цяпер не будзеш шкадаваць, што я цябе з'ем?

А мышка яму з норкі адказвае:

— Не, не буду. Таму што ты не зможаш з'есці мяне.

Зірнуў каток — а мышкі перад ім і няма.

Пачаў ён яе дакараць:

— А як жа табе не сорамна, ашуканка ты гэткая. Я табе паверыў, пашкадаваў, а ты! Каб я ведаў, што ты гэткая падманшчыца, з'еў бы

цябе не мыўшыся, няхай бы табе горш было.

Мышка яму і кажа:

— А гэта табе навука: перш чым ісці на паляванне ці па справах якіх, не забудзь памыцца, тады цябе ніхто не ашукае.

І мышка схавалася ў сваю норку. Вось з таго часу каток і мыецца некалькі разоў на дзень. Каму ж гэта прыемна сняданак траціць?



? Пра што гэтая казка?

Якімі паказаны ў казцы каток і мышка? Падмацуйце думкі словамі тэксту.

Як дакараў мышку каток? Што адказала яму мышка? Адказ пацвердзіце словамі з тэксту.

Прачытайце апошнія радкі тэксту і скажыце, чаму каток з таго часу мыецца некалькі разоў на дзень?

Прачытайце казку яшчэ раз. Перакажыце тэкст, карыстаючыся ілюстрацыяй.

## Зарадка.

*Ніна Галіноўская.*

Спускайцеся з ложка,
Босенькія ножкі,
Тапачкі абуйце,
Шпарка маршыруйце.

Гніся, мая спінка,
Лепей, як галінка.
Раз, два, тры, чатыры!
Станьце, ножкі, шырай!

Рукі — ўлева, рукі — ўправа!
Ой, як хораша, цікава
Кожны ранак з таткам
Нам рабіць зарадку.

? Якія практыкаванні для зарадкі апісаны ў вершы? Прачытайце.

Выдзеліце голасам словы, якія дапамагаюць вам уявіць гэтыя практыкаванні.

Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся выразна чытаць уголас.

# Лістапад.

*Станіслаў Шушкевіч.*

Пэўна, сонца знемаглося,
Адпачыць пайшло за хмары,
І паўзе павольна восень
Праз іржышчы і папары.



І ад холаду рабіна
Чырванее, нізка гнецца,
Паляцелі гусі клінам,
Каб у выраі пагрэцца.

? Якім паказаны лістапад у вершы?

Адзначце найбольш трапныя словы, якія апісваюць лістапад, і зачытайце іх.

* Якія пачуцці выклікае ў вас чытанне выразаў:

Пэўна, сонца знемаглося,
Адпачыць пайшло за хмары...

Паляцелі гусі клінам,
Каб у выраі пагрэцца...

Прачытайце верш самі сабе, а потым уголас.

# Прыгоды лісціка-карунчыка.

*Максім Валошка.*

У агародзе, каля Надзейчынай хаты, рос маленькі клёнік. А на ім разам са сваімі брацікамі красаваўся пад шчодрым сонцам лісцік-карунчык. Надзейка часта любавалася густалістым клёнікам. Калі ж надарылася засуха, яна ў сваім маленькім вядзерцы насіла ваду, палівала дрэўца. І тады лісцік-карунчык і яго браты ўдзячна шапацелі, нібы дзякавалі Надзейцы за дапамогу.

Неўзабаве прыкаціла на рыжым кані барвова-квяцістая восень. Яна кожны дзень прыбірала ў чырвань і пазалоту дрэвы. Не абмінула і клёнік. Успыхнуў ён яркай чырваннню, пачаў убор свой губляць. Лісцікі, як гарэзлівая малеча, доўга гушкаліся ў паветры. Пасля ціхенька клаліся на пажаўцелую траву, змешваліся з рудой грушавай лістотай.

Толькі лісцік-карунчык усё трымаўся за дрэўца, якое дало яму жыццё і сілу. Цяжка

было адрывацца ад роднай галінкі. Але і да сваіх братоў, што ў вясёлым карагодзе кружыліся вакол клёніка, таксама хацелася.

Міналі дні. Усё больш і больш братоў лісціка-карунчыка ападала на зямлю. Толькі ён не мог вырашыць, што рабіць.

І вось лісцік-карунчык застаўся на дрэўцы адзін. Цёмнай ноччу ён трымцеў ад халоднага ветру. Днём яго часта паласкалі дажджы. І не было каму паскардзіцца на свой горкі лёс.

Аднойчы да клёніка прыйшла Надзейка. Яна збірала з апалых лістоў букет. І тады лісцік-карунчык адважыўся і плаўна саслізнуў уніз. Ён і не заўважыў, як трапіў у капюшон Надзейчынай курткі. Там было цёпла і ўтульна.

Дома мама распранала Надзейку і знайшла лісцік-карунчык.

— Гэта мне восень падарыла, узрадавалася дзяўчынка.

А лісціку-карунчыку было нявесела.

Надзейцы здалося, што ён нават паскардзіўся: «Мне сумна без братоў...»

— Ты пагрэйся ў нас, а ранічкай я аднясу

цябе да тваіх брацікаў, — супакоіла дзяўчынка.

Назаўтра яна прыбегла да клёніка. Але лісця пад ім ужо не было. Тата зграб яго і вынес з агарода.

На Надзейчынай далоньцы адзінока ляжаў лісцік-карунчык. На ім ірдзелі дзве маленькія кропелькі — ці то ён сам заплакаў ад жалю, ці то скаціліся расінкі-слязінкі з яго роднай галінкі.

— Не гаруй, — суцешыла Надзейка, страсаючы на зямлю кропелькі. — Перазімуеш у нас, у хаце. А вясной я пакажу табе на клёніку зялёныя лісцікі — тваіх новых брацікаў.



Растлумачце назву тэкста. З якім пачуццём аўтар апісвае лісцік-карунчык? Якімі былі лісцікі вясной, летам, увосень?

Якія малюнкі з жыцця лісціка-карунчыка прыводзяцца ў розныя поры года? Знайдзіце і прачытайце ў тэксце.

Куды трапіў лісцік-карунчык? Што пра гэта сказала Надзейка?

Які сэнс укладзены аўтарам у апошнія радкі тэксту? Зачытайце іх.

Падрыхтуйцеся расказаць пра прыгоды лісціка-карунчыка.

## Амяла.

*Зоська Верас.*

Сярод шэрых галін высокага дуба, абдзёртых асеннімі вятрамі да апошняга лісточка, здалёк кідаецца ў вочы нейкі жоўта-зялёны кусцік.

Гэта кусцік амялы, дзіўнай і цікавай раслінкі. Расце амяла ў нас найчасцей на дубах, ліпах, бярозах, соснах, елках, асінах, ляшчыне, дзікіх яблынях і грушах, ды так высока, што і дастаць яе цяжка. Жыве яна крыўдай, бо не стараецца сама для сябе аб спажыве, але карыстаецца

гатовымі сокамі дрэва — свайго гаспадара. Галінкі яна мае дробныя, вілавата падзеленыя. Лісточкі даўгія, вузкія, цвёрдыя, быццам скурай пакрытыя. Трымаюцца яны васемнаццаць месяцаў, захоўваючы свой светла-зялёны колер. І праз тое, што ўвесь час творацца новыя лісточкі, куст амаль ніколі свайго прыгожага колеру не траціць.

Рана вясной, ужо ў сакавіку, у кутках галінак і паміж лісткамі з'яўляюцца дробныя жоўта-зялёныя, з прыемным пахам кветкі.

Ягады амялы спеюць вельмі памалу, толькі ў кастрычніку або нават у снежні бываюць зусім спелымі і выглядаюць тады як маленькія, велічынёй з дробны гарох, белыя кулькі, напоўненыя вельмі клейкім сокам. Гэтыя ягадкі з'яўляюцца найбольшым прысмакам амялушак. Амяла корміць іх, але недарма: мусяць яны ёй за корм аддзякаваць, рассяваючы зярняткі.

Зярняты амялы вельмі цвёрдыя, і птушкі іх не ядуць, а выкідаюць, старанна ачышчаючы дзюбкі аб кару дрэў. Зярняты маюць кругом

сябе клейкую масу, пры дапамозе якой прыклейваюцца да кары і тады выпускаюць маленькі карэньчык. Карэньчык выдзяляе сок, які раз'ядае кару. Утвараецца шчылінка, у якой і разрастаюцца карэньчыкі. На другі год зярнятка выпускае першыя галінкі і разрастаецца куст, які жыве сокамі свайго хлебадаўцы.

Карэнне амялы запускаецца глыбока, часта да дзесяці сантыметраў і вельмі шкодзіць дрэву.

У народзе з ягад амялы вырабляюць клей на мух, а лісце, разам з дробнымі галінкамі, дробна парэзанае і высушанае, служыць як лякарства і купляецца ў аптэцы.



? Як змяняецца настрой аўтара, калі ён піша пра амялу? Перадайце гэта пры чытанні.

Што нагадвае амяла? На якіх дрэвах яна расце? Што спажывае? Прачытайце.

Чым карысная амяла? Дакажыце словамі тэксту.

Апішыце амялу па плану:

1. Дзе расце амяла?
2. Якія ў яе галінкі, лісточкі, кветкі?
3. Якія ў амялы ягады, зярняты, карэньчыкі?
4. Як яна размнажаецца?

Прачытайце тэкст цалкам і падрыхтуйце падрабязны пераказ твора.

## Пра Марынку.

*Ядвіга Бяганская.*

Любіць Марынка сустракаць паштальёна. Асабліва яна выглядае цётку Дашу цяпер, калі татка паехаў з экспедыцыяй на далёкую Поўнач. Вось і сёння з самага ранку яна «дзяжурыць» каля акна, а ўгледзеўшы здалёк паштальёна, бяжыць адчыняць яму дзверы.

Павітаўшыся, цётка Даша падае маме цэлы пачак прыгожых віншавальных паштовак і кажа:

— Шчаслівыя вы, Ганна Сямёнаўна. Столькі ў вас родзічаў, столькі сяброў. А мяне і павіншаваць няма каму, адна-адзінюткая засталася на свеце.

— Хіба ў вас няма ні братоў, ні сясцёр? — запытала мама.

— Былі. А як жа. І сёстры і браты былі. Сямёра нас расло ў бацькоў. Загінулі ў вайну. Наляцелі на нашу вёску гітлераўцы і ўсіх чыста спалілі. Сагналі ў школу і спалілі. Я ў той дзень на леснічоўцы ў дзеда гасцявала, вось і засталася жывая, каб па іх усё жыццё памінкі спраўляць... — уздыхнула цётка Даша.

— Як у Хатыні... — ціха прамовіла Марынка.

— Але, дзіцятка, як у Хатыні... — сказала цётка Даша і, памаўчаўшы нейкую хвілінку, дадала: — Ну то і я вас віншую з Новым годам. Жывіце ў здароўі і шчасці.

— А калі віншуеце, то і пірагоў маіх паспытайце, і шкляначку гарачага чаю выпіце, — сказала мама. — Ды і сумка ваша ўжо апусцела. Распранайцеся, і да стала. Вось і чайнік ужо закіпеў, бразгае накрыўкай.



— Дзякую, дзякую. Я б з прыемнасцю. Толькі ў мяне яшчэ адно пісьмо засталося. Ваша суседка з чацвёртага паверха пісьма ад сына чакае, непакоіцца вельмі. Сын яе ў арміі служыць. Граніцу вартуе. Трэба ёй чым хутчэй пісьмо сынава перадаць. Зачакалася кабеціна.

— Гэта, мусіць, Вера Рыгораўна? Дык мы ёй мігам гэта пісьмо даставім. Марыначка, дачушка, занясі цётцы Веры пісьмо, — звярнулася да Марынкі мама. — А вы, Дар'я Сцяпанаўна, сядайце да стала.

Марынка аж засвяцілася ад радасці. Яна чула сумны расказ цёткі Дашы, спачувала ёй і цяпер рада была хоць чым-небудзь услужыць свайму паштальёну. Узяўшы пісьмо, яна памчалася на чацвёрты паверх і неўзабаве, расчырванелая і задыханая, прыбегла дадому:

— Пісьмо занесла. А вам прасілі перадаць вялікі, вялікі дзякуй.

— І табе дзякуй, галубка. Не трэба мне цяпер на чацвёрты паверх тупаць, а то ногі мае сёння зусім прытаміліся. Гэта ж столькі віншавальных паштовак перад святам разнесці трэба!

Калі цётка Даша падзякавала за пачастунак і развіталася, Марынка пабегла да акна і доўга глядзела ёй услед. А пасля села побач з мамай на канапе, прытулілася да яе і ціха сказала:

— Бедная цётка Даша. Нікога ў яе няма.

Ніхто яе дома не чакае.

— Вайна, дачушка, шмат людзей асіраціла, — уздыхнула маці.

Нейкую хвіліну і мама і Марынка маўчалі.

— А ведаеш, мамачка, што я прыдумала, — сказала раптам Марынка. — Сёння я раскажу пра цётку Дашу нашым школьнікам, і мы пашлём ёй навагодняе віншаванне. Кожны купіць прыгожую паштоўку і пашле. І цётка Даша атрымае адразу аж трыццаць пяць паштовак! А яшчэ... а яшчэ мы пад Новы год прыбяром маленькую елачку і занясём яе цётцы Дашы.

— Ты вельмі добра прыдумала, дачушка, проста цудоўна прыдумала, — усміхнулася мама і прыгарнула да сябе Марынку.



? Што вам спадабалася ў тэксце?

Якія думкі і пачуцці выклікалі ў вас учынкі Марынкі? Ці дапамагалі вы каму-небудзь так, як яна?

Чаму цётка Даша не атрымлівала паштоўкі? Што адчула яна ў доме Марынкі?

Што прыдумала Марынка для цёткі Дашы? Як да гэтага аднеслася маці?

* Што такое сціпласць? Свае выказванні пацвердзіце словамі тэксту.

Разгледзьце малюнак і падпішыце яго словамі з тэксту.







# Зноў да нас прыйшла зіма...

*Рыгор Барадулін*





## Першы снег.

*Міхась Лынькоў.*

Надышлі замаразкі. Яны ўсё мацнелі і мацнелі. Ужо раніцамі зямля адзывалася пад нагамі лёгкім звонам, і кожны крок быў чуваць за колькі кіламетраў па ўсім наваколлі. Сыпануў снег, і па ўсім было відаць, што намерыўся легчы ён ужо зусім сур'ёзна, аж да самай вясны. Снег сыпаў спачатку павольна, нібы з нейкім роздумам. Потым пачаў ісці так густа, што адразу на пеньчуках, на валунах з'явіліся пухнатыя белыя шапкі, а над ма-

ладзенькімі елкамі, над малымі бярозкамі хутка выраслі снежныя шатры. Некаторыя маладыя дрэўцы сагнуліся пад цяжарам, прыпалі верхавінкамі да самае зямлі, утварыўшы сотні і сотні беласнежных арак, якім так і стаяць у лесе да самай вясны, пакуль цёплае сонца не распрастае іх прымёрзлых да зямлі ствалін. Лес адразу ўпрыгожыўся новымі фарбамі.

**Слоўнік.**

Арка — дэкаратыўнае збудаванне ў выглядзе варот.

Шацёр — лёгкае пераноснае жыллё з тканіны, скуры, матэрыі, драўніны ці з галін і лісця дрэў.

? Назавіце тэму, якую мы вывучаем. Колькі месяцаў доўжыцца зіма? Як называюцца зімовыя месяцы?

Навучыцеся правільна чытаць словы, пададзеныя ў слоўніку. Намалюйце арку і шацёр.

З якім пачуццём пісьменнік піша пра першы снег? У чым ён бачыць прыгажосць зімы? Зачытайце.

Знайдзіце ў тэксце і прачытайце апісанне таго, што здарылася з маладымі дрэўцамі.

Якія малюнкі можна намаляваць да тэксту?



## Зіма.

*Мікола Хведаровіч.*

Ля хат высокія сумёты,
Пад снежнай коўдрай спяць палі.
Вятры бяздомныя ля плота
З віхурай песню завялі.

Замоўклі белыя прасторы,
Змарыў іх ціхі зімні сон,
Малюе срэбныя ўзоры
Зіма на шыбінах акон.

І лес, ад інею касматы,
Укрыўся снежным дыванам.
Стаяць у цёплых шапках хаты,
Абліты месячным святлом.

Люблю зіму, і спеў мяцеліц,
І сполах ранняе зары,
Калі развешвае кудзелі
Марозны іней на двары.

? Чым прыгожая зіма? Як аб гэтым піша паэт? Якія радкі ў вершы вам асабліва спадабаліся? Зачытайце іх.

Знайдзіце выразы, якія перадаюць, што зіма ўжо надышла. Прачытайце іх уголас.

* Аб якіх зменах у прыродзе расказвае паэт?

Выберыце з верша адзін слупок і падрыхтуйцеся да выразнага чытання. Пастарайцеся перадаць пры чытанні свае пачуцці.



## Сняжынка.

*Алесь Жыгуноў.*

Прывядзе мяне сцяжынка
На дзіцячы Новы год,
Над сняжынкаю сняжынка
Кружыць, водзіць карагод.
Снегу белага нямала,
А мароз такі круты!
Я ў сняжынкі запытала:
— Ну куды, малеча, ты?
Я пачуць адказ хацела.
Я магла б з ёй падружыць,
Ды сняжынка паляцела,
Каб ля елкі пакружыць.

? Куды спяшалася сняжынка? Як аб гэтым напісана ў вершы? Прачытайце.

Як, на ваш погляд, трэба чытаць гэты верш? Што вы хацелі б перадаць, чытаючы яго?

* Зрабіце малюнак да верша «Сняжынка».

Вывучыце верш на памяць.

# Месяцы года.

*Пімен Панчанка.*

*Студзень* — з копнамі снежных аблокаў,
*Люты* — шчодры на сіні мароз,
*Сакавік* — з сакатаннем і сокам
Беларускіх вясновых бяроз,
*Красавік* — час маланак і ліўняў,
*Травень* — з першым мурогам, сяўбой,
*Чэрвень* — з ягаднаю зарой,
*Ліпень* — з мёдам,
З пшаніцаю — *жнівень*,
Спелы яблычны *верасень*,
Багаты *кастрычнік*
У празрыстасці чыстай, крынічнай,
*Лістапад* — залаты лістапад,
*Снежань* — першы густы снегапад.

? Пра якія характэрныя прыкметы кожнага месяца вы прачыталі ў вершы?

Знайдзіце на старонцы 38 прыкметы і дапоўніце імі верш Пімена Панчанкі.

Прачытайце верш самастойна і падрыхтуйцеся да выразнага чытання. Больш гучна вымаўляйце словы-назвы месяцаў года.

* Складзіце вуснае апавяданне на тэму: «Усе месяцы года мы любім бясконца».

## Птушыная елка.

*Зоська Верас.*

— Юрачка, устань, сынок, і паглядзі ў акно. Уначы снегу нападала.

— Як на снезе добра ўсё відаць! Як міла кругом, як прыгожа! Татачка, а там на галінцы што сядзіць, нейкі шэранькі клубочак?

— Гэта птушачкі, Юрачка. Яны то не рады, што снег усё засыпаў, бо не маюць чаго есці. Ні зярнятка нідзе не знойдуць. Ды і зімна ім, маленькім. Бачыш, як наставілі пёркі?..

Засумаваў Юрачка ды моцна задумаўся... Як шкода птушачак! Пад'еўшы, пабег да суседскага хлопчыка Вінцуся.

— Што ж, Юрачка, — прывітаў Вінцусь таварыша, — на саначкі пойдзем?



— На саначкі пойдзем, але, ведаеш, Вінцусь, птушкі бедныя не маюць чаго есці.

— Ну дык што ж? Трэба іх накарміць!

— Накормім, накормім! — усцешыўся Юрачка. — А чым?

— Э, гэта не бяда. Знойдзецца чым. Назбіраем крошак хлеба, крыху рознага збожжа...

— А дзе мы ім пасыплем? У снег няможна, бо не знойдуць, — непакоіўся Юрачка.

— Не, не ў снег, на дошчачку, а дошчачку на дрэва павесім... Ведаеш, Юрачка, на гэтай ялінцы, што каля плота расце...

— Дык гэта будзе птушыная елка?

— Так. Ну, ідзём...

У моманцік знайшліся і дошчачка, і шнуркі, і дроцікі ды ўсё, што было патрэбна, і пачалося прыбіранне «елкі». Добра-такі хлопчыкі намучыліся, пакуль усё наладзілі. Але затое якая багатая была «елка» і колькі на ёй розных прысмакаў: на дошчачцы ляжалі крошкі хлеба, зярняты маку, жыта, ячменю, канопляў, сланечніку, лёну. На галінках віселі пучкі асоту,

чырванелі букецікі рабіны, чарнелі пацеркі ягад белага бэзу...

Рады былі хлопчыкі са сваёй работы і паспяшаліся схавацца, каб чаканыя госцейкі не баяліся ды хутчэй браліся за ежу.

Птушкі даўно заўважылі, што каля ялінкі нешта цікавае робіцца, але не мелі адвагі падляцець бліжэй. Прысутнасць дзяцей іх палохала.

Ды толькі хлопчыкі ўвайшлі ў хату, паміж птушкамі пачаўся рух. Peралятаючы з галінкі на галінку, з дрэва на дрэва, памаленечку шэрая грамадка набліжалася да цудоўнай «елкі». Ужо зусім блізка. Адзін пералёт — і смачнае зярнятка было б у галоднай дзюбцы! Але як адважыцца? А можа, там прыгатавана сіло!.. Не, лепш не глядзець. Ды як хочацца есці!..

Нарэшце адзін стары верабей адважыўся і падляцеў блізка.

Пррр... І вось ён каля ялінкі. Здаецца, усё ціха. Трэба паспрабаваць нешта з'есці... Падляцеў, ухапіў канаплянае зярнятка і хутчэй

наўцёкі... Маленькае сэрца моцна, моцна б'ецца... Ды дарма: нішто не злавіла, не трымае. Значыцца, усё добра. Голасна зачырыкаў верабейка, і на яго кліч уся грамада зрушылася з месца.

Падняўся гвалт, піск, чырыканне — усе апынуліся на ялінцы ды давай падмацоўвацца! Толькі зярняткі трашчалі...

За гадзіну на ялінцы не пазнаць было галінак. Каго, каго там не было! І сінічкі, і шчыглікі, і чыжыкі, і вераб'і, нават сойкі, сарокі і вароны.

Апошнім найбольш падабалася костка.

Але яна была толькі адна, а варон шмат, таму ўсчыналіся сваркі...

Праз акно, шчасліва ўсміхаючыся, паглядалі на сваіх госцейкаў Юрачка і Вінцусь.

**Слоўнік.**

Грамада — мноства чаго-небудзь, сабранага ў адным месцы: птушкі, жывёлы, дрэвы, прадметы і г.д.

Сіло — пятля для лоўлі птушак і дробных жывёлін; пастка.

? Чаму апавяданне называецца «Птушыная елка»? Знайдзіце і прачытайце ў тэксце словы, якія пацвярджаюць вашу думку.

Якімі словамі аўтар перадае заклапочанасць маці і сына аб маленькіх сябрах — птушках? Прачытайце.

Знайдзіце радкі тэксту, дзе гаворыцца пра ежу птушак. Пры чытанні перадайце настрой аўтара.

У якіх радках твора паказана радасць хлопчыкаў ад убачанага.

Падпішыце малюнак словамі з тэксту.

## Ёлка.

*Пятрусь Граніт.*

Запаліся, ёлка,
Рознымі агнямі.
Будзеш весяліцца
Ты сягоння з намі!..

Засвяціся ярка
Колерам вясёлкі,
Хай паскачуць дзеці
Ля зялёнай ёлкі!

Колькі ёлка дзецям
Радасці прынесла,
Да позняе ночы
Не змаўкалі песні!

? Што вы можаце сказаць пра гэты верш? Чым ён вам спадабаўся?

Прачытайце радкі верша, у якіх расказваецца, колькі радасці прынесла дзецям ёлка.

Завучыце верш на памяць.



## Калядкі.

*Артур Вольскі.*

Гой, ладачкі-ладкі,
надышлі Калядкі!
Надышлі Калядкі —
напяклі аладкі.

Мы надралі таркаю
дранікі духмяныя.
Хочаш —
еш са скваркаю,
хочаш —
са смятанаю.
Вось вам,
калі ласка,
з жэрдачкі каўбаска!
Вось кавалак пірага,
каб не брала вас туга.



Гой, ладачкі-ладкі!
І мядок салодкі
да лясной гарбаткі
наліем у сподкі.
І запахне рутай,
верасам,
чаборам,
каб зімою лютай
нам не знацца з горам.



Бярыце з талеркі
лізунцы,
цукеркі!

Цешце сябе,
    цешце,
галубкі,
галубкі!
Ешце ўволю,
    ешце,
ды не псуйце зубкі.
Бохан —
    поўняй яснаю.
Яйкі.
Бульба.
Скваркі.
Гэта ўсё —
    з уласнае
нашай гаспадаркі.

Калі вам прысмакі
прыйдуцца да смаку,
прынясіце людзям
шчырую падзяку.

Гой, ладачкі-ладкі —
пляскаем у ладкі.
Гой, ладачкі-ладкі —
святкуем Калядкі!

? Які настрой перадаў аўтар у вершы?

Што вы ведаеце пра свята Калядкі? Калі яго адзначаюць?

Якія стравы гатуюцца да свята? Зачытайце.

Раскажыце, як вы адзначаеце Калядкі.

Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся да выразнага чытання яго ўголас.

## Бабуліна варта.

*Уладзімір Ягоўдзік.*

Добра зімовым вечарам пасядзець каля грубкі. Гудзе, пагрозліва страляе іскрамі агонь — усё яму дроў мала. У мяне й самога рукі свярбяць падкарміць ненажэру бярозавым паленам, але баба Юстына тут як тут. Прыструніла чырвонае вуголле жалезным шуф-

лікам і кажа нам абодвум — мне і агню:

— Хопіць, даражэнькія, а то печка пусціцца ў скокі!..

Паглядзеў я на грубку, а на ёй і праўда дзве кафліны пунсавеюць, быццам шчокі ў дзяўчыны-прыгажуні. Лепей да іх не датуляцца.

Селі вячэраць. Я прыляпіўся на адным краёчку лавы, гаспадыня на другім, а паміж намі ўладкаваўся кот Рыжык. На стале, на драўляным кружку, чыгунок з бульбаю стаіць, каля яго міска з зялёнымі агуркамі і якраз насупраць мяне талерка з колцам падсмажанай каўбаскі. Пах на ўсю хату — аж у носе казыча. Пара з чыгунка слупам у столь упіраецца. Такой смачнай бульбы я ніколі яшчэ не еў. Сама ў рот скача. Ад крамяных агуркоў быццам зубы ў роце растуць. Во як! Адно кепска: Рыжык пакрыўдзіўся, зусім на стол не глядзіць. Не там талерку з каўбасою бабуля паставіла. Каб улагодзіць сябрука, я паклаў перад ім на лаву бульбіну. Кот адсунуўся ад пачастунка, незадаволена праваркатаў: «Гар-р-рачае...» Сорамна мне стала, падчапіў я

відэльцам скурку ад каўбаскі ды проста ў лапы Мурлыкавічу. А ён як выгне спіну дугою, як натапырыць вусы і давай выгаворваць мне: «М-мала, м-мала...».

Зусім як у казцы!

Дагадзіла кату баба Юстына. Толькі ўзялася за анучку — яго як ветрам здзьмула з лавы пад печ.

Позна, аж за поўнач, заседзеліся мы з гаспадыняй хаты. Усмак павячэралі, доўга гутарылі. Я даведаўся, што бабулін дзед Рыгор быў лесніком, цяпер на пенсіі. Учора паехаў у горад да ўнукаў гасцяваць. А яны як завітаюць улетку сюды — хата нібы вулей гудзе. Слухаў я бабу Юстыну, а ў самога вочы зліпаюцца, быццам вейкі хто мёдам намазаў.

— Каб не праспаць нам заўтра! — занепакоіўся я. — Не забудзьцеся будзільнік паставіць.

— Не турбуйся, добры чалавек, — усміхнулася гаспадыня, — ёсць у мяне варта, не дасць бакі адлежаць...

— Якая варта? — здзівіўся я. — І дзе яна?



— От пасцялю табе, тады і раскажу, — загадкава адказала баба Юстына і падхапілася з-за стала.

Неўзабаве я залез пад тоўстую коўдру, прытуліўся шчакою да мяккай падушкі.

— Заплюшчвай вочы ды слухай, — прысела каля мяне бабуля. — Найпершы мой вартавы — з вялікім чырвоным грэбенем, быццам з сякераю. Як закрычыць — глухі пачуе:

«Ку-ка-рэ-ку-у-у!.. За-ся-ку-у-у!..»

Страшна — аж мурашкі па скуры паўзуць. А тут яшчэ хтосьці голасна так пытаецца:

«Го-го-го!.. Ка-го? Ка-го?..»

Палахлівыя авечкі хутчэй у адзін гурт збіліся ды мацней адна за адну:

«Бе-е-е!.. Не мяне-е-е! Не мяне-е-е!..»

А маленькае цялятка са свайго кутка жаласліва:

«Ме-е-е... Мяне-е-е!..»

Тут як тут суддзі знайшліся:

«Кра-кра-кра... Так-так-так!..»

Хіба да сну, пачуўшы ўсё гэта? Расплюшчыў вочы я, падняў галаву, а ўжо, аказваецца, раніца наступіла. Чуваць, як баба Юстына на кухні каля печы завіхаецца, з Рыжыкам размаўляе. Вучыць, каб не назаляў мне, калі я буду акунькоў на азярыне з-пад лёду цягаць. Апрануўся я хуценька і давай пасабляць гаспадыні па гаспадарцы ўпраўляцца. Найперш курам, гусям і качкам сена ўкінуў. З усімі пасябраваў. Толькі з начальнікам бабулінай варты мы не паразумеліся. Ён пры мне да цеста

нават не дакрануўся. Пэўна, баяўся з галавы вялікі чырвоны грэбень — сваю баявую сякеру — згубіць.

? Пра што гэтае апавяданне? Што вас у ім рассмяшыла? Зачытайце гэтыя месцы.

* Як вы разумееце выразы: *сама ў рот скача*, *яго як ветрам здзьмула з лавы*?

Што адбывалася зімовым вечарам у хаце бабы Юстыны? Свае выказванні падмацуйце словамі тэксту.

Перачытайце тую частку твора, дзе расказваецца пра вячэру.

Чаму начальнік бабулінай варты не дакрануўся да ежы? Як пра гэта гаворыць аўтар і ці згодныя вы з яго думкамі?

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання.



# Зіма і Лета.

(Казка.)

*Уладзімір Дубоўка.*

Сустрэлася з Летам Зіма:
— Нідзе ў цябе ладу няма!

Як толькі з'явілася ты,
усе мкнуцца ў цянёк, пад кусты.

А ходзяць — нага за нагу!
Я нават глядзець не магу!

Вось я калі стану ізноў,
не ўседзіць ніхто ля кустоў!

Трушком пабягуць і дзяды,
не горш, чым які малады.





Для моладзі будзе размах:
на лыжах бяжы, на каньках.

Згадзіся ты, Лета, са мной:
мілей жыць на свеце зімой!

Смяялася Лета ў адказ:
— Не знаю, мілейшы хто з нас!

Ніяк зразумець не магу:
чаму ад цябе ўсе бягуць?!

? Ці спадабалася вам казка? Чым?

Пра што ішла размова ў час сустрэчы Зімы і Лета? Прачытайце.

На чыім баку была праўда ў спрэчцы? Чаму? Пацвердзіце словамі тэксту.

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання казкі.

Прачытайце тэкст па ролях.

## Словы на снезе.

*Юлій Ванаг.*

Зіма лютуе ўсё мацней. Насыпае ўсё больш глыбокія снежныя сумёты.

На дарогах гурбы.

Яры і канавы замяло да краёў. У барах і гаях пад цяжарам снегу згінаюцца і нават ломяцца маладыя хвойкі і бярозкі.

Калі заціхне мяцеліца і засвеціць скупое зімовае сонца, на свежым снезе відаць розныя сляды. Яны, як словы ў цікавай кнізе, расказваюць пра клопаты і прыгоды звяроў і птушак. Апавядаюць пра іх цяжкае жыццё ў самую суровую пару года.

Ні ў лесе, ні ў полі не знойдзеш ніякага корму. Рыба ў азёрах задыхаецца пад тоўстым панцырам з лёду і снегу.

Мікінь — сябар прыроды.

У вольны час ён становіцца на лыжы і вязе да хмызняку на краі поля ахапак канюшыны ці духмянага сена. Там кладзе яго ў куст на такой вышыні, каб заяц, падняўшыся на заднія

лапы, мог дастаць.

Мікінь знарок выбірае куст не вельмі шырокі і замацоўвае ахапак так, каб заяц не вырваў яго ўвесь адразу і не расцерушыў сена па снезе.

Шэры і сам сабе можа нашкодзіць, бо, вядома ж, у зайца і розум заечы.

Тут жа побач Мікінь кладзе прыхопленую з сабой моркву ці бурачок, каб і на дэсерт шэраму было чым паласавацца.

Во колькі ён ноччу напятляў тут слядоў, а цяпер спіць дзе-небудзь пад кустом!

І Мікінь запрашае:

— Калі ласка, сусед, на сняданак!

Пра сняданак ён, вядома, жартуе, бо добра ведае, што даўгавухі прыйдзе на папаску толькі пасля захаду сонца.



? Чаму тэкст названы так? Які іншы загаловак можна даць яму? Пра што расказваюць розныя сляды на снезе? З чым іх параўноўвае пісьменнік? Зачытайце.

Прачытайце тэкст самі сабе і падзяліце яго на часткі па плану:

1. Зіма лютуе.
2. Мікінь — сябар прыроды.
3. Словы на снезе.
4. Сняданак.

Прачытайце тэкст кожнай часткі. Перакажыце тую частку, якая вам найбольш спадабалася.

Падрыхтуйцеся да кароткага пераказу тэксту.

## Снягір.

*Мікола Хведаровіч.*

Заснежыў студзень агарод,
Насыпаў гурбіны паўз плот,
Прадзе снягоў валокны,
Пазамарожваў вокны.

Прыціхлі птушкі, спяць звяры,
Ды не баяцца снегіры —
Снуюць па агародзе
І пры такой пагодзе.

Мароз трашчыць, снягі мяце,
Снягір, як макаў цвет, цвіце.
Спявае, весяліцца,
Марозу не баіцца...

## Чаму адзенне грэе?

*Канстанцін Ушынскі.*

Перш за ўсё трэба спытацца ў сябе: ці праўда, што адзенне грэе?

У сапраўднасці ж не кажух грэе чалавека, а, наадварот, чалавек аддае цяпло кажуху. Ды хіба можа быць інакш? Кажух жа — не печка. «Вось як? — спытаецеся вы. — А чалавек хіба печка?»

Вядома, печка! Стравы, якія мы з'ядаем, —

гэта дровы, якія ў нас згараюць. Агню пры гэтым не відаць, але мы здагадваемся аб ім па тым цяпле, якое адчуваем у целе.

Цяпло гэта трэба берагчы. Каб не выпускаць яго на вуліцу, мы будуем дамы з тоўстымі сценамі, зімой устаўляем другія рамы, абабіваем дзверы лямцам. Тое самае і з адзеннем. Замест таго, каб грэць сваім целам паветра ў пакоі ці на вуліцы, мы грэем адзенне, а яно захоўвае гэта цяпло каля нас. Вядома, адзенне наша таксама аддае цяпло, але не так хутка, як наша цела.

Такім чынам, мы прымушаем адзенне мерзнуць замест нас.

? Ці праўда, што адзенне грэе?

Як вы разумееце выразы: «У сапраўднасці не кажух грэе чалавека, а, наадварот, чалавек грэе кажух», «А чалавек хіба печка?»? Падмацуйце свае выказванні словамі тэксту.

Чаму цяпло трэба берагчы? Прачытайце.

Прачытайце тэкст самастойна і падрыхтуйцеся да падрабязнага пераказу.

## Хто самы дужы.

(Казка.)

*Апрацоўка Хрысціны Лялько.*

Заспрачаліся аднаго разу мароз, сонца і вецер, хто з іх самы дужы. Пайшлі яны ў поле, дзе селянін жыта сеяў.

— Скажы, чалавеча, хто з нас самы дужы? — пытаюць.

Падумаў селянін і кажа:

— Па-мойму, вецер з вас самы дужы.

— Чаму? — злосна затрашчаў мароз. — Хіба ты можаш жыта пасеяць, калі я зямлю замарожу?

— Нічога ты адзін без ветру не зробіш, — адказвае чалавек. — Ты толькі тады моцны, калі табе вецер памагае.

— Не, усё ж самае дужае з іх я! — засмяялася сонца. — Толькі я магу мароз прагнаць і зямлю ўгрэць, каб ты, чалавек, жыта сваё пасеяў.

— Эге, — зноў не згаджаецца селянін. — Ты, сонейка, толькі тады свеціш, калі вецер

хмары разгоніць.

Пачуў усё гэта вецер і заганарыўся дужа. Пачаў свістаць ды выхваляцца сваёю сілаю перад сябрамі.

Пайшлі яны гэтак далей. Ажно бачаць, едзе ў возе якісь чалавек.

— Давайце, — кажа сонца, — праверым нашу сілу на гэтым чалавеку. Хто з нас здзярэ з яго плячэй сярмягу, той і будзе самы дужы.

Тут вецер і пачаў дзьмуць на чалавека. То з аднаго боку закруціць, то з другога наляціць, свішча, вые, галосіць, сярмягу шкуматае. А чалавек каўнер наставіў, папружку мацней падцісну дый паганяе сабе каня пужкаю.

Змогся вецер, з сілы выбіўся, а чалавека так і не распрануў.

— Я, — прызнаўся мароз, — таксама не здыму з чалавека вопраткі.

А сонейка ўсміхнулася, вызірнула з-за хмары і давай грэць чалавека на возе.

— Ого, як цёпла стала, — здзівіўся фурман, выціраючы пот з ілба. — Трэба, мусіць, распранацца.

Супыніў ён свайго каня, расперазаў папружку дый зняў з сябе сярмягу.

— А што, бачыце?? — засмяялася сонца. — Ласка за любую сілу дужэйшая.

І праўда, нездарма ж кажуць, што ласкавае цялятка дзвюх матак ссе.

---

**Слоўнік.**

Фурман — чалавек, які кіруе конямі.

Сярмяга — верхняе адзенне.

? Прачытайце ў слоўніку словы і тлумачэнні да іх.

* Што абазначаюць словы: *засмяялася сонца*. Знайдзіце ў канцы тэксту трапны выраз. Як вы яго разумееце? Які яшчэ выраз па сэнсу падыходзіць да гэтага? Зачытайце.

Пра што заспрачаліся героі казкі? Што адказаў ім селянін?

Як правяралі сваю сілу мароз, сонца і вецер на чалавеку? Зачытайце.

Адкажыце сваімі словамі, а потым словамі з тэксту, хто перамог у спрэчцы? Чаму?

Якая галоўная думка гэтай казкі? Знайдзіце пацверджанне сваім выказванням.

Падрыхтуйце падрабязны пераказ казкі па плану:

1. Спрэчка.
2. Гутарка з селянінам.
3. Праверка сілы.
4. Ласка за любую сілу дужэйшая.

## Пустыя кармушкі

*Мікола Маляўка.*

У школьным садзе дзеці
Павесілі кармушкі,
Каб у мароз і вецер
Не галадалі птушкі.

Нацешыліся ўволю
Каля кармушак-хатак,
Не крышаць хлеба болей,
Не сыплюць і зярнятак.

Відаць, заняты вельмі,
Забыліся пра птушак,
І замяла завея
Сцяжынкі да кармушак.

І аблятаюць птушкі
І сад, і хаткі тыя:
Не радуюць кармушкі,
Калі яны — пустыя.

? Якія пачуцці выклікаў у вас верш?

Пра што гаворыць загаловак верша?

Чаму трэба ўвесь час помніць пра птушак?

Прачытайце верш самі сабе, а потым уголас, перадаючы настрой аўтара.

## Галка.

*Васіль Хомчанка.*

У агародчыку зляпіў я Дзеда Мароза са снегу. Дзе вочы — чорныя вугольчыкі ўторкнуў. А нос зрабіў з вялікай жоўтай морквы.

У рукі Дзеду Марозу даў скрыначку і насыпаў туды зярнят.

— Частуй птушак, — сказаў я яму, а сам зайшоў у хату і стаў каля акна.

Прыляцела першая сінічка. Піскнула, села на край скрыначкі, дзеўбанула раз, другі. Потым снягір апусціўся побач. А нахабны верабей залез у кармушку з нагамі.

Чорная галка з бярозы таксама заўважыла кармушку. Пераляцела на самую ніжнюю галінку, але спусціцца на кармушку не адважылася.

Пакуль так галка сядзела ды аглядвалася, птушкі ўсё падзяўблі і разляцеліся.

Галка скокнула ў кармушку, а ў кармушцы — пуста.

Яна са злосці схапіла дзюбай моркву і паляцела з ёю.

І Дзед Мароз астаўся без носа.

? Што ў гэтым творы падалося вам смешным? Чаму?

Падумайце, чым падобныя тэксты «Птушыная елка» Зоські Верас і «Галка» Васіля Хомчанкі? Падмацуйце свае думкі словамі з тэкстаў.

Прачытайце, як паводзілі сябе птушкі ў кармушцы.

Чаму Дзед Мароз астаўся без носа?

Перакажыце змест прачытанага па плану:

1. Дзед Мароз са снегу.
2. Скрыначка з зярнятамі.
3. Пачастунак.
4. Дзед Мароз без носа.

## Гаспадарка.

*Змітрок Бядуля.*

У куце сядзіць мядзведзь,
Хустку вышывае,
А лісічка-невялічка
Хатку прыбірае.

А каток пячэ аладкі,
Маслам залівае,
На тапчане мышанятка
Есці памагае.

А сабачка ўе вяроўкі —
Пугу для хлапчыны,
Дзяцел-бондар на начоўкі
Длубае асіну.

Казёл лапці папраўляе,
Скуратом мацуе,
На аконцы павучочак
Кросенцы рыхтуе.

---

**Слоўнік.**

Бондар — майстар па вырабу драўлянай пасуды (бочак, дзежак, цаброў і г. д.).

Длубаць — корпацца, дастаючы што-небудзь.

Кросенцы — маленькі ткацкі станок.

Скурат — абрэзак скуры.

? Прачытайце ў слоўніку словы і тлумачэнні да іх.

З якім пачуццём Змітрок Бядуля гаворыць пра заняткі майстроў — герояў верша?

Прачытайце, хто і што робіць.

Прачытайце верш моўчкі і падрыхтуйцеся да выразнага чытання.

Вывучыце верш на памяць (поўнасцю альбо часткова).



# На горцы.

*Мікалай Носаў.*

Зранку дзеці рабілі снежную горку. Зграбалі лапатамі снег. Калі горка была гатова, дзеці залілі яе вадой і пабеглі дамоў.

— Пакуль паабедаем, — казалі яны, — і горка замерзне. А потым прыйдзем з санкамі і будзем катацца.

А Коцька Чыжоў з шостай кватэры хітры які! Ён горкі не рабіў. Сядзіць дома ды глядзіць у акно, як другія працуюць. Яго дзеці клічуць горку рабіць, ён толькі рукамі за акном разводзіць ды галавой матае — няможна яму. А калі дзеці пайшлі, ён хуценька апрануўся, начапіў канькі і выскачыў на двор. Чырк канькамі па снезе, чырк! І катацца як след не ўмее! Пад'ехаў да горкі.

— Во, — кажа, — добрая горка атрымалася! Зараз з'еду.

Толькі палез на горку — бух носам!

— Ого! — кажа. — Слізкая!

Разоў дзесяць падаў. Ніяк на горку ўзлезці

не можа.

«Што рабіць?» — думае.

Думаў, думаў — і прыдумаў:

«Пясочкам пасыплю і ўзлезу».

Схапіў ён фанерку ды да скрынкі з пяском. Нацягаў пяску і пасыпае перад сабой, а сам усё вышэй лезе. Узлез на самы верх.

— Вось цяпер, — кажа, — з'еду!

Адпіхнуўся нагой і зноў — бух носам! Канькі ж па пяску не едуць. Ляжыць Коцька на жываце і кажа:

— Як жа цяпер па пяску катацца?

І палез уніз бокам.

Тут і дзеці прыбеглі. Бачаць — горка пяском пасыпана.

— Хто гэта горку пяском пасыпаў? — закрычалі яны.

— Гэта я пасыпаў, бо вельмі слізкая і я не мог на яе ўзлезці, — кажа Коцька.

— Які разумны! Бачыш, што прыдумаў! Як жа цяпер катацца?

Коцька кажа:

— Можа, калі-небудзь снег пойдзе, засыпле



пясок, вось тады і катацца можна будзе.

— Снег, можа, праз тыдзень пойдзе, а нам сёння катацца трэба.

— Тады не ведаю, — кажа Коцька.

— Сапсаваць ты ведаеш, а як паправіць — не ведаеш! Бяры зараз жа лапату!

Коцька ўздыхнуў і ўзяўся за лапату.

— Засыпай пясок снегам!

Коцька засыпаў горку снегам, а дзеці зноў палілі яе вадою.

— Вось цяпер, — кажуць, — замерзне і можна будзе катацца.

А Коцьку так працаваць спадабалася, што ён яшчэ збоку лапатай прыступкі зрабіў.

— Гэта, — кажа, — каб усім добра было ўзлазіць, а то яшчэ хто-небудзь зноў пяском пасыпле!

? Што ўбачыў Коцька праз акно кватэры? Чаму ён не працаваў з дзецьмі?

Чаму Коцька вырашыў пасы́паць пяском горку? Як да гэтага аднесліся дзеці? Што яны яму сказалі? Зачытайце.

Чаму Коцьку потым спадабалася працаваць? Прачытайце.

Якая галоўная думка тэксту?

Падрыхтуйцеся да падрабязнага пераказу апавядання.

## У марозны дзень.

*Канстанцыя Буйло.*

Лёд на возеры — празрысты,
Чысты,
Шклісты,
Моцны лёд.
І па роўнядзі ільдзістай
Закружыўся карагод.
Хлапчукі ўсе з нашай школы
Сталі сёння на канькі.
Не сціхае смех вясёлы
У марозныя дзянькі.

## Птушыная тайна.

*Змітро Бяспалы.*

Пятрусь на досвітку ляжаў пад цёплай ватнай коўдраю і рабіў выгляд, што спіць. А як толькі бацька і маці пайшлі на працу, а Іван — у школу, вынырнуў з-пад коўдры, хуценька апрануўся, прынёс з сянец новыя Іванавы лыжы, пачаў прымяраць, хоць брат строга наказаў Петрусю, каб не чапаў іх. Але дзе ты ўтрымаешся, калі так хочацца пакатацца на новенькіх лыжах, пахваліцца сябрукам?!

Развіднела. Пятрусь за лыжы і — на двор. Хацеў выбегчы на вуліцу, але перадумаў, спыніўся перад брамкаю: толькі выйдзі, пакатайся — адразу хто-небудзь прагаворыцца і тады пападзе ад брата.

Ён павярнуў назад, стаў на лыжы і скіраваў да плота ў канцы саду. Пятрусь наважыўся ўзабрацца там на гурбу і з'ехаць з яе. Толькі крыху падняўся, як нечакана ўбачыў па другі бок плота страката-карычневых птушак. Яны былі падобныя да курэй, толькі крыху мен-

шыя. Птушкі не заўважалі хлапчука і спакойна выбіралі насенне палыну. Каб лепей разгледзець іх, ён падняўся вышэй, незнарок рыпнуў лыжаю. «Фырр-фырр-фырр», — залопалі птушкі крыламі, узвіхурылі снег і паляцелі ў зарослы малінаю і крапівою алешнік ля саду. Толькі адна не ўзнялася ў паветра: хуценька перабіраючы лапкамі, пабегла ў той жа алешнік. Пятрусь паглядзеў ёй услед і ніяк не мог зразумець, чаму яна не лятае. Хлапчука так захапілі птушкі, што ў яго нават прапала ахвота катацца на лыжах. Ён пастаяў яшчэ крыху ля плота, пачакаў, але птушкі не вярнуліся.

Пятрусь пачаў мерзнуць і паспяшаўся ў хату.

Назаўтра, асцярожна падкраўшыся да плота, з-за тоўстай старой яблыні ён зноў назіраў за курачкамі. Калі спудзіў — яны паляцелі ў алешнік. Адна пабегла ўслед. Чаму? Чаму ўсе лятаюць, а адна бегае? — ніяк не мог дагадацца хлапчук. Дый што гэта за птушкі? Тут без старэйшага брата нічога не высветліш. І калі Іван прыйшоў са школы, ён таямніча

паведаміў:

— Заўтра адразу пасля ўрокаў прыходзь дамоў... Я табе нештачка пакажу...

Іван ледзь дачакаўся апошняга званка. Ён першы выскачыў з класа, апрануўся і — дамоў. Ля сянец яго чакаў брат.

— Толькі ціха, не шумі... Зараз такое пакажу... — шэптам сказаў Пятрусь.

Хлапчукі пайшлі ў сад, наблізіліся да плота, прытаіліся за яблыняй. Пятрусь паказаў рукою — і Іван убачыў птушак, зграбных, карычневых, з белаватымі крапінкамі. Яны выбіралі насенне палыну, купаліся ў мяккім сыпучым снезе.

Браты нерухома, як зачараваныя, назіралі за птушкамі. Калі пачалі мерзнуць, заварушыліся і спудзілі іх. З фырканнем тыя дружна падняліся з палыну і, плануючы ў паветры, апусціліся ў алешнік. Адна, як было ўчора і пазаўчора, пабегла ўслед.

Каля хаты Пятрусь спытаў брата:

— Ты іх ведаеш?

— Не... Першы раз бачу.

— А чаму адна не лятае?

— У яе крыло перабітае, — адказаў Іван.

Аднак высветліць, што гэта былі за птушкі, хлапчукі не змаглі. Нарэшце Івану пашанцавала: знайшоў кніжку з каляровымі малюнкамі. На адным ён пазнаў менавіта такіх птушак, якія прыляталі ў сад. Гэта былі шэрыя курапаткі. Дома з Петрусём вычытаў, што курапаткі ў вырай не лятаюць. Зімою кормяцца насеннем розных траў, пустазелля. А як ляжа снег і засыпле ўсе расліны, для курапатак настае цяжкі час. Каб не загінуць з голаду, яны наведваюцца да хлявоў, гумнаў, трымаюцца ў старых садах і парках, каля дарог, падбіраюць зярняты, мякіну.

— Дык мы ж іх можам падкормліваць, — сказаў Іван.

— Ага, — падтрымаў Пятрусь.

Кожны вечар, калі птушкі адпачывалі ў алешніку, браты рассыпалі за плотам крупы. Курапаткі падбіралі іх і не галадалі, а ў пакалечанай курачкі загаілася крыло, і яна пачала лятаць.

? Чаму тэкст мае такую назву? Пра якую птушыную тайну даведаліся хлопчыкі?

Чаму Пятрусь не мог зразумець, з якой прычыны адна птушачка не лятае? Пацвердзіце словамі тэксту.

Куды прывёў Пятрусь брата і што ён яму паказаў? Прачытайце.

Як Іван высветліў, што гэта за птушкі? Чаму яны не адлятаюць у вырай? Прачытайце.

Што вырашылі зрабіць хлопцы, каб дапамагчы зімою птушкам?

Як вылечылася хворая курапатка? Свае выказванні падмацуйце словамі тэксту.





# Ідзе вясна ў шумлівых водах...

*Якуб Колас*



# Пошукі вясны.

*Рыгор Ігнаценка.*

Вясна!.. Пры адным толькі ўспаміне пра яе ўсё ў табе ўзрушаецца, мацней пачынае ў грудзях біцца сэрца, у вачах загараюцца агеньчыкі...

Колькі не сустракаў я на сваім вяку вёснаў, але так і не разумею — адкуль вясна свой пачатак бярэ?

Выйдзеш часам з хаты. На двары туманна, цёпла. І раптам у гэтай шэрай сакавіцкай імгле, недзе зусім побач — буль, буль, буль... Здаецца, нібы хто каменьчыкі ў ваду кідае. Ага, вось яно што! Ды гэта ж першы капеж! Пад страхой ужо і невялічкая лужынка вады сабралася. Адкуль ні вазьміся — цыбаты певень. Напіўся з лужыны, узляцеў на плот і заспяваў на ўсё горла:

— Ку-ка-рэ-ку!

Яму адгукнуўся суседскі певень. І пайшлі з канца ў канец па ўсёй вёсцы пеўні гарланіць.

«Усё-такі вясна ў вёсцы пачынаецца», — думаеш.

Ідзеш у лес.

Тут не відно яшчэ ніякіх прыкмет вясны. Снегу навокал вунь колькі! Але што гэта? З паўднёвага боку, ля самага камля векавой хвоі, леташняя траўка рыжэе. А з-за яе па-маладзецку зялёны брусьнічнік пазірае...

Вось дзе, аказваецца, ключы ад вясны схаваны!

Выходзіш у поле.

Снегу ў полі менш, чым у лесе. На самым высокім месцы знаходзіш маленькую, на квадратны сажань, праталінку. І так табе раптам у «класы» захочацца пагуляць, што хоць ты вазьмі ды накрэслі на гэтым малюсенькім шматку зямлі квадрацікі і скачы на адной назе.

Не, усё ж вясна ў полі свой пачатак бярэ!

Спыняешся ля ручая.

У карэннях чорнага алешніку імкліва бяжыць

каламутная халодная вада. Выйшаўшы ў адным месцы са сваіх берагоў, ручай шырока разліўся па роўнай сенажаці, затапіў рэдкі хмызняк.

— Вось адкуль вясна ў дарогу выходзіць! — гаворыш сам сабе, убачыўшы набрынялыя пупышкі вярбы, што схіліліся да самай вады. І так ад іх наўкол саладка мядком павявае!

Вяртаешся дахаты.

Вось табе і на! Паперадзе цябе, на рыхлай соннай дарозе, пабліскваючы чорным пер’ем, важна пахаджвае беладзюбы грак — наша першая пералётная птушка. Нібыта ўзрадаваўшыся яго з’яўленню, ажывіліся ў садах мурзатыя вераб’і. Крычаць, адзін аднаго за чубы цягаюць... І зусім ужо не разабраць: дзе ж па-сапраўднаму вясна свой пачатак бярэ?

І так кожны год...



? Чаму пісьменнік так і не разабраўся, адкуль вясна свой пачатак бярэ? Падмацуйце свае думкі словамі тэксту.

Знайдзіце ў творы вясеннія прыкметы і зачытайце іх.

Прачытайце апошні сказ твора. Як вы яго разумееце?

* Прачытайце тэкст ад слова «Вясна!..» і да слоў «Ідзеш у лес». Падрыхтуйцеся расказаць урывак блізка да тэксту.

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання тэксту.

## Прадвесне.

*Марк Смагаровіч.*

Зноў чуваць у нашым краі
Грай няўрымслівых гракоў.
Весела вясна іграе
На цымбалах ручайкоў.

Больш не падаюць сняжынкі,
Лютых маразоў няма,
З дахаў капаюць слязінкі —
Плача зімачка-зіма!

**Слоўнік.**

Няўрымслівы — непаседлівы.

? Якія пачуцці выклікаў у вас гэты верш?

Як вы разумееце выразы: «Весела вясна іграе на цымбалах ручайкоў», «З дахаў капаюць слязінкі — плача зімачка-зіма!»?

Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся чытаць уголас.

## Скора прыйдзе вясна.

*Цётка.*

Скора прыйдзе вясна,
Панясецца «ку-ку»
Праз лясы, праз палі,
Праз наш Нёман-раку,

Па Вілле, па сястры,
На плытах паплыве
Аж пад вокны да хат
І вясёла гукне:
«Дзецюкі, гу-гу-гу!!!
Ўжо вясна на дварэ!
Ўжо трава на лугу,
Ужо кветкі ў траве!»

? Якімі словамі перадаецца настрой аўтара? Знайдзіце іх у тэксце.

Прачытайце верш самастойна самі сабе, а потым выразна ўголас.

Знайдзіце ў ім прыкметы вясны і зачытайце іх.

Вывучыце верш на памяць.



# Вясна ідзе.

*Валерый Кастручын.*

Засмяялася ў небе сонейка і пачало прамянямі лічыць на стрэхах ледзяшы.

— Дзінь-дзінь-дзінь, — як цымбалы, зазвінелі льдзінкі.

Забулькалі, заспявалі пад снегам ручаі. На старой таполі ацерабіўся, замахаў крыламі чорны грак.

«Убачыў грака — вясну сустракай» — кажа прымаўка. Снег у полі пацямнеў, набрак і асеў. На ўзгорках чарнеюць праталінкі. У лесе на дрэвах набухаюць пупышкі, весела звіняць сінічкі на голым веццы, звонка грукае дзяцел на старой асіне. Грукаў, грукаў, аж разбудзіў мядзведзя. Вылез мішка з берлагу, пачухаў за вухам, зажмурыўся ад сонца і зароў на ўвесь лес: «Вясна ідзе!..»

Выскачыў з-пад кусціка маленькі зайчык. Працёр лапамі вочкі і здзівіўся — лес пацямнеў, елачкі зелянейшыя сталі. Нават маму сваю не пазнаў: скінула яна свой белы кажушок,

адзелася ў шэранькую світку і скубе на праталінцы леташні дзяцельнік.

Наўкола ўсё булькае, звініць і гукае: «Вясна ідзе-е-е!»

**Слоўнік.**

Світка — доўгая сялянская вопратка з сукна.

Дзяцельнік — дзікая канюшына.

? Якія малюнкі прыроды апісаў пісьменнік? Прачытайце.

Які сэнс закладзены ў прымаўку: «Убачыў грака — вясну сустракай»? Прачытайце на старонцы 38 прыкметы і знайдзіце сярод іх тую, якая па сэнсе будзе адпавядаць прыведзенай прымаўцы.

Прачытайце тэкст самастойна і знайдзіце трапныя словы і выразы, якія расказваюць аб надыходзе вясны.

Пры чытанні ўголас перадайце вашы адносіны да прачытанага.

Прачытайце перадапошні абзац тэксту і намалюйце словамі карціну пра вясну.

## Перад паводкай.

*Максім Багдановіч.*

Пад птушыны крык і гоман,
даўшы хвалям вольны ход,
прыпадыме бацька Нёман
на хрыбце магутны лёд.

Зазвіняць жалобна крыгі,
і бурлівая вада
снег, размоклы ў час адлігі,
змые з лугу без сляда.

? Пра якую пару года ідзе гаворка ў вершы? Адкажыце словамі з тэксту.

Які настрой перадае Максім Багдановіч у гэтым вершы?

Прачытайце другі слупок і прыдумайце слоўны малюнак да прачытанага.

Вывучыце верш на памяць.

# Вясна.

*Змітрок Бядуля.*

То не снег,
то чаромха цвіце.
То не снег,
то бярозка расце.

То не снег —
расцвітае садок.
То не снег,
а ляціць матылёк.
То не шоўк —
гэта рунь ля гары.
То не шоўк,
а сон-цвет у бары.

То не шоўк,
а мурожны лужок.
То не шоўк —
маладзенькі лянок.



Не гусляр —
то пяюць салаўі.
Не гусляр —
то звіняць ручаі.

Не гусляр —
дрозд у гаі пяе.
Не гусляр —
гэта пчолка гудзе.

Ах, вясна
маладая мая!
Пад табой
ажывае зямля.

Пад табой
і звініць і пяе
нават жук...
Нават мушка ў траве.

? Якім настроем прасякнуты гэты верш? Чаму яго хочацца чытаць весела і гучна?

Якую ролю адыгрываюць паўторы ў вершы? Прачытайце.

Знайдзіце ў тэксце вершаваныя радкі, да якіх можна намаляваць малюнкі. Колькі малюнкаў можа атрымацца?

Прачытайце верш цалкам самі сабе і падрыхтуйцеся да выразнага чытання.

## Смачная вада.

*Васіль Вітка.*

Наш калодзеж пры самай вуліцы. І хоць ён завецца Ціханаў калодзеж, ваду з яго бяруць усе, хто хоча.

Вада наша самая смачная. Бывае, і не хочаш, а пачнеш піць — не адарвацца.

Не дзіва, што каля нашай хаты спыняюцца і падарожныя і прыезджыя. Ніхто не абміне калодзежа. Людзі п'юць і гавораць:

— Але ж і вадзічка ў вас!

У гарачы дзень, ідучы на работу, людзі наліваюць вады, каб было чым прагнаць смагу ў полі. Няма адбою і ад малых. Яны збягаюцца з усяе вуліцы. І мне столькі клопату, пакуль усіх панапойваю.

— Стасічак, выцягні хаця з паўвядзерка.

— Стась, прынясі кубачак, — просяць самыя меншыя, што не ўмеюць піць з вядра.

Спярша я паіў у ахвоту, а потым сказаў:

— Не буду.

— Хіба табе вады шкада?

— Няўжо ж не.

Тата пачуў мае словы.

— А ты ведаеш, чаму наша вада смачная? — спытаўся ён.

— Чаму, татачка?

— А таму, што ёй не даюць застойвацца. Чым больш яе п'юць, тым яна смачнейшая. Нікому не шкадуй напіцца, — сказаў тата. — Знямоганы чалавек і той адразу падужэе, як вып'е свежай вады.

І я не шкадую нікому. Я рады напаіць кож-

нага. Заходзьце, піце. Калі не можаце з вядра, я вам конаўку вынесу.

**Слоўнік.**

Смага — моцнае жаданне піць.

Конаўка — металічная пасудзіна з ручкай для піцця.

? Чаму спыняліся падарожныя і прыезджыя каля калодзежа? Якія словы яны гаварылі? Прачытайце.

Чаму ж была такая смачная вада ў Ціханавым калодзежы?

Як вы думаеце, чаму Стасік пашкадаваў дзецям вады з калодзежа? Пацвердзіце свае выказванні словамі тэксту.

Прачытайце размову Стасіка з татам і выдзеліце голасам галоўныя словы.

Падрыхтуйцеся да кароткага пераказу тэкста.



# Галоўныя словы.

*Мар'ян Дукса.*

Я слоўнік гартаю,
прачытваю зноў —
якіх там, якіх там
няма толькі слоў!
Аж трохі ў вачах
мітусіцца ад іх —
кароткіх і доўгіх,
сваіх і чужых.
Чытаю і думаю,
хмурачы бровы:
якія з іх будуць
галоўныя словы?
Якія?
Гадаю,
а думкі — што вір.
А словы галоўныя —
МАМА І МІР.



? Чаму паэт галоўнымі словамі назваў словы МАМА і МІР? Пацвердзіце свае выказванні прыкладамі з жыцця.

Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся да выразнага чытання яго ўголас.

## Свята.

*Паўлюк Пранузa.*

Спяць яшчэ пад снегам
Паплавы, палеткі.
І таму з паперы
Я зрабіла кветкі.

І букет вясёлкай
Прамяністай ззяе,
На стале ў вазе
Маму ён чакае.

Рада мама святу,
Рады мы таксама.
Сонца ў вокны свеціць,
Светлае, як мама.

? Якія пачуцці перададзены паэтам у вершы?

Які падарунак падрыхтавала дзяўчынка маме?

Чаму радуюцца святу і дарослыя і дзеці? Якія радкі верша пра гэта гавораць?

Навучыцеся чытаць гэты верш выразна.

Вывучыце яго на памяць.

## Маміна работа.

*Яўген Пярмяк.*

Пеціна мама была тынкоўшчыцай. Яна тынкавала дамы. Даўно хацелася Пецю паглядзець, як гэта робіцца, ды ўсё не ўдавалася.

Неяк мама сказала Пецю:

— Выйдзі, сынок, заўтра на балкон. Убачыш, як мы наш стары дом будзем у новую вопратку апранаць.

Не зразумеў Пеця, як гэта можна дом апранаць, але пытацца не стаў. «Сам убачу», — рашыў ён сам сабе.

Раніцай выбег Пеця на балкон. Глядзіць, побач яшчэ адзін балкон з'явіўся. Ды не просты, а вісячы. Хочаш — паднімеш яго, хочаш

— апусціш. А на вісячым балконе стаіць мама з нейкай дзяўчынай. «Гэта, напэўна, маміна памочніца», — падумаў Пеця.

Каля памочніцы стаяла вялікае дашчанае карыта з шэрым цестам. Дзяўчына брала гэта цеста маленькай лапатачкай і накідвала на сцяну дома. А Пеціна мама разгладжвала яго роўна-раўнюсенька. Доўга глядзеў Пеця на маміну работу, пакуль не ўбачыў, што шэрае цеста стала цвёрдым і белым.

Зразумеў цяпер Пеця, як дом апранаюць. Захацелася яму хутчэй вырасці, каб самому навучыцца апранаць дамы ў прыгожую вопратку.

Добрая гэта работа. Патрэбная.

? Ці спадабаўся вам гэты тэкст? Чым?

Што азначае выраз: *стары дом будзем у новую вопратку апранаць*? Чаму Пеця не стаў пытацца, як гэта можна *дом апранаць*?

Што убачыў Пеця з балкона раніцай? Зачытайце.

Што захацелася хлопчыку?

* Прачытайце тэкст самастойна і падзяліце яго на часткі па плану:

1. Пеціна мама.
2. Запрашэнне.
3. На балконе.
4. Добрая гэта работа.

Падрыхтуйцеся да пераказу твора.

## Мама.

*Мікола Хведаровіч.*

Імя маёй мамы
Самае лепшае,
Маміна слова
Найдаражэйшае.

Свеціць, як сонца,
Ад самай калыскі.
Вобраз матулі
Родны нам, блізкі.

Дзе б ты ні быў,
А яго прыгадаеш.
Мама заўсёды
Нам шчасця жадае.

Маміна свята
Дорага людзям.
Хай яно светлым
І радасным будзе.

? Чаму вобраз мамы нам родны і блізкі? Пацвердзіце словамі з тэксту.

Якія песні-калыханкі вы чулі, ведаеце?

Чаму маміна свята так шануюць людзі?

Пры чытанні верша выдзеліце голасам словы, якія вам найбольш спадабаліся.

Вывучыце верш на памяць.



## Красавік.

*Рыгор Барадулін.*

Красавік ішоў сялом,
Грэў прасторы ласкаю,
Як махнуў ён рукавом —
Вылятаюць ластаўкі.

Беражком ступаў сухім,
Па ярах караскаўся.
Рукавом махнуў другім —
Луг смяецца праскамі.

Закасаўшы рукавы,
Неба ўзняў вясёлкамі.
Рады пушчы,
Паплавы
Месяцу вясёламу.



# Рэкі выйшлі з берагоў.

*Віталь Вольскі.*

На рэках не скончылася яшчэ паводка. Рэкі выйшлі з берагоў і злучыліся ў нізінах зляснымі рэчкамі, раўчукамі і балотамі ў адзін вялікі вадзяны прастор. Асобныя ўзвышшы ператварыліся ў астраўкі, на якіх ратуюцца лясныя звяры.

Вось сядзіць пад кустом цэлая грамадка зайцоў. Яны прытуліліся адзін да аднаго. Каля іх можна часам убачыць і лісіцу. Трывожна бегае яна па астраўку, паглядае на ваду, а на зайцоў не звяртае ніякай увагі, быццам іх тут зусім няма.

У сваю чаргу і палахлівыя, заўсёды асцярожныя зайцы нібы зусім не заўважаюць свайго лютага ворага. Перад тварам агульнай небяспекі старая, адвечная варожасць часова забыта.

Калі падплысці да такога астраўка, можна ўсіх гэтых звяркоў пабраць рукамі і пасадзіць у лодку. Яны будуць сядзець ціха і мірна,

пакуль лодка не наблізіцца да цвёрдай зямлі. Тады ўсе пасажыры паўскакваюць адразу са сваіх месц і, не чакаючы каманды, знікнуць у лесе, не падзякаваўшы нават за ратунак.

? Што адбываецца ў прыродзе, калі рэкі выходзяць з берагоў? Як пра гэта напісана ў апавяданні?

Чаму перад тварам агульнай небяспекі *старая, адвечная варожасць* забываецца? Якімі словамі гэта перададзена ў тэксце?

Прачытайце тэкст самастойна і падрыхтуйцеся да падрабязнага пераказу па плану:

1. Рэкі выйшлі з берагоў.
2. Грамадка зайцоў.
3. Ратунак.
4. Зніклі ў лесе.

## Веснавая раніца.

*Авяр'ян Дзеружынскі.*

Ціха абуджаюцца
Росныя палі,
Веснавая раніца
Крочыць па зямлі...

Промнямі агністымі
Саграе зямлю,
Зерні залацістыя
Кідае ў раллю.
А як напрацуецца,
На спачын ідзе,
Ніваю красуецца
Цэлы весні дзень.



**Слоўнік.**
Спачын — перапынак.
Весні — веснавы.

? З якім пачуццём апісвае паэт веснавую раніцу?

Як вы разумееце выраз: «Веснавая раніца крочыць па зямлі»?

Якія словы гавораць аб працы веснавой раніцы? Зачытайце.

Прачытайце верш уголас, захоўваючы патрэбную інтанацыю.

# Вялікдзень.

*Артур Вольскі.*

Вялікдзень,
Вялікдзень —
Найвялікшы Дзень!
Ззяе сонечны прамень,
уцякае цень.

Гэтым днём
Ісус Хрыстос
з мёртвых уваскрос.
Ён цяпер
глядзіць на нас
з вышыні нябёс.

Хто ў нядолі,
хто ў бядзе,
Ён да тых ідзе,
бо шануе нас усіх,
як дзяцей сваіх.



Зззяе сонечны прамень.
Уцякае цень.
Вялікдзень,
Вялікдзень —
Найвялікшы Дзень!

? Пра якое свята паэт піша ў вершы? Што вы ведаеце пра гэтае свята?

Як выказвае аўтар верша свае пачуцці і адносіны да гэтага свята? У якіх словах гэта перададзена асабліва выразна? Зачытайце.

Раскажыце, як вы звычайна святкуеце Вялікдзень.

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання верша, звярніце ўвагу на інтанацыю.

## Разумны пеўнік.

*Уладзімір Ліпскі.*

Жылі-былі дзядуля і пеўнік. Дружна жылі, у згодзе. Дзядуля каля хаты завіхаўся ды грэўся на сонейку, а пеўнік збіраў зярняткі ды весела спяваў.

Аднойчы пайшоў пеўнік пагуляць. Ішоў, ішоў і апынуўся ў лесе. Цікава там: трава высокая, дрэвы вялікія, жучкоў і казюлек розных не злічыць.

Загуляўся пеўнік, аж раптам чуе: туп-туп... Прыгледзеўся, а гэта бягуць па сцежцы воўк і ліс. Бягуць і пра нешта паміж сабой размаўляюць.

Пеўнік пад корч схаваўся, лістком накрыўся, слухае.

— Вой, як есці хочацца! — стогне воўк.

— І ў мяне жывот пусты, — скардзіцца ліс. — Нічога з учарашняга дня не еў.

— Чуў я, браце ліс, што недзе на ўзлеску хатка стаіць, а ў ёй певень і дзядуля жывуць.

— Вось бы нам да іх! — аблізнуўся ліс. — Мне б і пеўніка хапіла. Толькі дзе ж тая хатка?

— Вунь воблака плыве. Можа, яно ведае? Давай спытаем, — прапанаваў воўк.

— Давай, — згадзіўся ліс.

Воўк сеў на заднія лапы, закінуў галаву ўверх і завыў:



— Во-облака, во-облака, скажы, дзе жывуць дзядуля і пеўнік?

Але воблака не сказала, дзе шукаць дзядулю і пеўніка, хаця і ведала. Яно нахмурылася і пралілося на злыдняў халодным дажджом. Воўк з лісам — пад вываратень. Сядзяць на мокрых хвастах і скавычуць. Перастаў дождж, сонейка выглянула. Падумаў пеўнік, што воўка з лісам і блізка няма, вылез са сваёй схованкі. Ускочыў на пянёк ды ад радасці якяк закрычыць на ўвесь лес:

— Ку-ка-рэ-ку!

Пачулі воўк з лісам — і да пеўніка. А той наўцёкі!

— Стой, певень! — хрыпатым голасам закрычаў воўк.

— Пеўнік, пачакай, — просіць ліс.

Бяжыць пеўнік па сцежцы хутка-хутка, крыламі лапоча, нагам памагае. А воўк — напрасткі, праз гушчар, каб спеваку дарогу адрэзаць.

Выскачыў пеўнік на ўскраек лесу — хата дзядулева ўжо відна, а ратунку няма: апярэдзіў

яго воўк.

— Стой, певень! — крычыць. — У мяне не ўцячэш! З'ем цябе зараз! І дзядулю праглыну!

Задрыжаў пеўнік, аж прысеў ад страху і вочы заплюшчыў: не жыць яму болей на свеце.

Тут і ліс падбег:

— Адступіся, воўк, гэта мой абед!

— Чаму твой? — раззлаваўся воўк.

— Певень малы, худы, якраз мне аднаму, — сказаў ліс.

— А я галодны застануся! — зароў воўк.

Пеўнік тым часам ачомаўся ад страху.

— Не злуйся, воўк, — сказаў ён ціхім голасам, — паблізу мой дзядуля жыве. Вунь ягоная хатка пад чорным дахам. Адпусці мяне, дык я папрашу, каб ён вам добрую вячэру падрыхтаваў.

Падумалі-падумалі воўк з лісам і адпусцілі пеўніка. А вечарам прыйшлі да дзядулевай хаткі, грукаюць у акно.

— Дзед, вынось вячэру!

— Але, але, — пачуўся з хаты дзядулеў

голас, — расхінайце мех, я ўкіну туды барана.

Воўк і ліс расхінулі пад акном вялікі мех. Акно расчынілася, і нешта жывое бух туды! Воўк закінуў мех на плечы і бягом у лес. Ліс за ім ледзь паспяваў.

Спыніліся, развязалі матузок. А з меха — я-як выскачыць сабака! Ды вялізны-вялізны! Злосны-злосны! Сабака як загыркаў, як забрахаў на ўвесь лес! Воўк з лісам ад нечаканасці ледзь не пападалі. Ім падалося, што на іх нападае страшэнны звярына.

— Вой! Вой! Ратуйце! — закрычалі яны ў два галасы і далі дзёру.

А дзядуля з тае пары стаў яшчэ больш любіць і шанаваць свайго пеўніка, бо ён жа не толькі галасісты, але і разумны.

---

**Слоўнік.**

Выварацень — вывернутае з коранем дрэва.

Ачомаўся — апамятаўся.

Матузок — шнурок для завязкі.

? Што вам падалося смешным у творы? Зачытайце.

Як вы разумееце выразы: *ачомаўся ад страху*, *далі дзёру*? Знайдзіце іх у тэксце і зачытайце.

Чаму апавяданне называецца «Разумны пеўнік»? У чым выявіўся розум пеўніка? Пацвердзіце словамі тэксту.

Паглядзіце на малюнак. Якімі словамі з тэксту можна яго падпісаць?

Прачытайце казку яшчэ раз самастойна і падрыхтуйцеся да падрабязнага пераказу.

## Птушыны інтэрнат.

*Яраслаў Пархута.*

Аднойчы ў таполі навальніца зламала вершаліну. Людзі заўважылі непарадак, усцягнулі на дрэва старую барану і сказалі:

— Няхай хоць птушкам паслужыць.

І праўда. Вясною прыляцелі аднекуль буслы і пачалі завіхацца — майстраваць гняздо. Носяць сухія галінкі, шматкі моху, леташнюю салому і радуюцца. Хутка зажывуць у новым доме!

А вераб'і ўвесь гэты час гойдаліся на галінках і толькі пасміхаліся:

— Ці ў ім жыцьмуць?! Ці ў ім жыцьмуць?!

Іх падтрымалі шпакі:

— Дарма ўюць! Дарма ўюць!

А калі буслы нарэшце закончылі будаўніцтва і з вясёлым клёкатам паведамілі, якое ў іх цудоўнае жытло атрымалася, вераб'і першыя схапіліся і пачалі прасіцца ў падсуседзі.

Буслы падумалі-падумалі і дазволілі вераб'ям пасяліцца разам.

Шпакі ад зайздрасці ажно свіснулі, маўляў, не шкодзіла б і ім прысуседзіцца!

— Такі клопат! Такі клопат! — сказалі буслы і шпакам таксама далі дазвол.

Але як ні стараліся шпакі прыстроіцца да буслінага гнязда — не змаглі. І тады з ельніку прыляцеў дзяцел і пачаў рабіць ім дупло. Ніжэй буслінага жытла, ніжэй вераб'інага... А калі ўбачыў, што кватэра шпакам цудоўная выйшла, дык рашыў заадно і сабе дупло змайстраваць.

На старой таполі нібы інтэрнат атрымаўся.

Але аднойчы рыжы кот Фядот вырашыў праверыць буслянку. І тут дзяцел першы ўзняў трывогу. Стукнуў тройчы ў сук:

— Кот-кот-кот!

Усхапіліся шпакі ды завагаліся:

— Біць ці не? Біць ці не?

— Біць-біць-біць! — закрычалі вераб'і, кінуліся ў атаку і пачалі калашмаціць Фядота — ажно рыжая поўсць паляцела. Тут і шпакі пасмялелі, памагаць пачалі. А калі на той гоман з бліжняга балотца прыляцелі бусел з busліхаю, на таполі быў поўны парадак: бусляняты спрасонку пазяхалі на мяккай пасцельцы, шпакі з вераб'ямі абмяркоўвалі нядаўнюю падзею, а кот Фядот ляжаў у крапіве і лічыў сінякі.

З таго часу жыхары птушынага інтэрната жывуць спакойна. А кот Фядот за вярсту абходзіць старую таполю.

? Як па-іншаму можна назваць гэты твор?

* Дзеля чаго людзі ўсцягнулі на таполю барану? Чаму лічыцца шчаслівай прыкмета, калі ў двары ці

ў вёсцы гняздуюць буслы? Адкуль гэта пайшло?

Хто папрасіўся да буслоў у падсуседзі? Прачытайце.

Што вырашыў зрабіць кот Фядот? Хто першы прыйшоў на дапамогу буслам?

Чаму цяпер кот Фядот за вярсту абходзіць старую таполю?

Прачытайце тэкст самі сабе і падрыхтуйцеся да кароткага пераказу па плану:

1. Барана на таполі.
2. Буслы майструюць гняздо.
3. Падсуседзі.
4. Бойка.
5. Кот Фядот лічыць сінякі.

## Вечны агонь.

*Еўдакія Пяршай.*

Пасярод плошчы стаіць высокі помнік. Перад ім гарыць Вечны агонь. Да помніка падыходзяць людзі: і старыя, і маладыя, і дзеці. Стаяць, маўчаць. Многія сюды прыносяць кветкі.

Верачка прыйшла да помніка разам з мамай. Дзяўчынка была ў святочнай сукенцы. У руках яна трымала чырвоную ружу. Ад ветрыку шапацела лісце ліп, варушыліся стужкі на вянках, што прынеслі да помніка людзі.

— Мама, — пытае Верачка, гледзячы на трапяткое жоўтае полымя ля помніка, — чаму гэты агонь называецца Вечны?

— Таму, што ён будзе гарэць заўсёды і напамінаць пра тых, хто загінуў за нас з табою.

— Ён ніколі не згасне?

— Ніколі. Бо гэты Вечны агонь памяці гарыць не толькі тут, ля помніка, а ў людскіх сэрцах.

Маці стаяла моўчкі. Маўчала і Верачка. Потым яна нахілілася і паклала ля помніка сваю кветку.

? Якія пачуцці ўзніклі ў вас пры чытанні гэтага твора?

З кім пайшла Верачка да помніка? Што яна там убачыла?

Чаму агонь называецца *Вечным*? Падмацуйце свае выказванні словамі тэксту.

Ці ведаеце вы герояў, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны? Як ушаноўваецца іх памяць у нашай краіне?

Пры чытанні тэксту пастарайцеся перадаць настрой аўтара і вашы ўласныя адносіны да прачытанага.

Падрыхтуйцеся да вуснага пераказу апавядання.



## Гасцінец.

*Уладзімір Ліпскі.*

Позна ноччу тата прыехаў з камандзіроўкі. Раніцай Марынка перабегла са свайго ложка да таты пад коўдру. Лашчыцца. Расказвае навіны. Раптам пытаецца:

— Што мне прывёз?

— О, прывёз табе незвычайны гасцінец.

— А які ён? Пакажы мне.

Тата падняўся з ложка. Дастаў з партфеля чырвоны яблык і падаў Марынцы. Яна схапіла рукамі гасцінец, але радасць у яе вачах патухла: вялікае дзіва — яблык!

— Гэта гасцінец ад цёткі Зіны, — пачаў тлумачыць тата.

— Якой цёткі? — зацікавілася Марынка і бліжэй падсела да таты.

— Яна жыве ў горадзе, адкуль я толькі што прыехаў, — пачаў расказваць тата. — Цётка Зіна на вайне была цяжка паранена... У яе няма рук...

Марынка аберуч абняла яблык і прытуліла да грудзей. Прыціхла, глядзіць на тату, чакае працягу.

— Цётка Зіна вельмі доўга была ў бальніцы. Аднойчы ўзімку, калі яшчэ ішла вайна, ёй у палату прынеслі гасцінец — вялізны чырвоны яблык. Цётка Зіна вельмі ўзрадавалася. Нават, здаецца, раны перасталі балець.

— Гэта той самы? — спытала Марынка і ўжо з большай цікавасцю паглядзела на сакавіты яблык.

— Не, вядома, не той, — усміхнуўся тата і расказваў далей: — Цётка Зіна папраўілася. Яна папрасіла, каб пасадзілі каля дома яблыньку. Вось з тае пары кожную восень у яе ёсць чырвоныя яблыкі. Яна любіць частаваць імі ўсіх сваіх гасцей. І мяне пачаставала. А вось гэты яблык папрасіла перадаць табе, — закончыў свой расказ тата.

Марынка сядзела моўчкі. Твар яе зрабіўся сур'ёзны. Губы падцяла, вочы патухлі. Дзе і падзеліся тыя гуллівыя агеньчыкі!

— Як падрасту, — урэшце сказала Марынка, паеду да цёткі Зіны і завязу ёй сваю Жану.

Жана — самая любімая лялька Марынкі.

Тата прытуліў дачку да сябе і спытаў:

— А не шкада?

— Ані не шкада, — адказала Марынка. — Я ёй падару ўсе свае цацкі.

Тата не пытаўся, навошта цётцы Зіне такі падарунак. Сваім позіркам Марынка выказала шчырае жаданне дапамагчы цётцы, каб ёй заўсёды было добра і весела.

— Я напішу цётцы Зіне пісьмо. Скажу ёй,

што таксама хачу вырошчваць яблыкі, якія вылечваюць людзей.

Цэлы дзень гуляла Марынка з чырвоным яблыкам — дарагім гасцінцам незнаёмай цёткі.



**?** Што вас кранула ў гэтым тэксце?

Чаму Марынка спачатку не ўзрадавалася гасцінцу? І чаму яна з большай цікавасцю паглядзела на сакавіты яблык, калі бацька расказаў ёй пра цётку Зіну? Зачытайце.

Што дзяўчынка вырашыла падарыць цётцы?

Чаму чырвоны яблык стаў дарагім гасцінцам?

Прачытайце тэкст моўчкі, а потым уголас тую яго частку, якая вас найбольш уразіла.

Падрыхтуйце кароткі пераказ тэксту.

## Мае забавы.

*Змітрок Бядуля.*

Па даліне, па лужочку
Ездзіць я люблю.
Я з дубовага кіёчка
Коніка зраблю.

Гайда, гайда, буланенькі,
Аж у цёмны бор!
І ляціць кіёк мой ценькі
Проста як віхор.

Аж дрыжыць, шуміць зямліца,
А я скок ды скок!
А за мною весяліцца
Жучка — мой дружок.



**Слоўнік.**

Ценькі — тонкі.

? Як мяняецца настрой аўтара ў вершы? Перадайце гэта пры чытанні.

Пра якія забавы расказваецца ў вершы?

Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся да выразнага чытання ўголас.

Вывучыце верш на памяць.

## Хітрун.

*Павел Ткачоў.*

Вожык жыў са сваёй матуляй у лесе. Каля магутнага волата-дуба засталася ад старога пянька ямка. Вось у гэтай ямцы і быў іх дом.

Вельмі любіла матуля свайго Вожыка і ўсё лічыла яго маленькім. Але сам Вожык з гэтым не згаджаўся. Мамы, яны заўсёды лічаць сваіх дзяцей маленькімі. А ў Вожыка іголкі не мяккія, як былі раней, а пругкія, колкія, — паспрабуй крані! Які ж ён маленькі?..

Каб здавацца дарослым, Вожык не коціцца, нібы мячык, з горкі, а ідзе не спяшаючыся, паважна. Але гэта не дапамагае. Матуля ўсё роўна не пускае гуляць аднаго. А сама заўсёды днём спіць. Надакучыла Вожыку — ноччу спі, днём спі.

І вельмі ж яму хочацца прайсці аднаму па сцяжынцы, што вядзе да возера. Падыдзеш да вады — і ўбачыш сваю пыску. Вожык ужо аднойчы любаваўся сабою, калі быў там з мамай. Ён тады зрабіў такі грозны выгляд, што ажно самому страшна стала. Не, ён ужо не маленькі.

Пагледзеў: матуля моцна спіць.

— Давай схаджу на возера, пакуль яна адпачывае, — вырашыў Вожык.

Ён радасна фыркнуў і падаўся да знаёмай сцяжынкі. Вось яна. Цяпер і спяшацца няма чаго. Можна прытаіцца каля старога дрэва і пачакаць, ці не пакажацца мышка-нарушка. Або пакаціцца мячыкам з горкі. Усё роўна матуля не бачыць. І ніхто не будзе гаварыць: «Вожык, не рабі таго, Вожык, не рабі гэтага».

Неўзабаве ён быў каля возера. Дзесьці ў вышыні, ў верхавінах дубоў, ліп і бяроз, якія, быццам вартавыя, сцераглі спакой возера, шумеў вецер. А тут было ціха і так хораша.

Не ўтрымаўся Вожык, скаціўся да вады мячыкам. Бадзёра страсянуў іголкамі і — залюбаваўся сваім адлюстраваннем у вадзе. Нават пра ўсё на свеце забыў. І не заўважыў, як да яго падышла дзяўчынка і нахілілася. Вожык адчуў небяспеку толькі тады, калі косыхвосцікі дзяўчынкі ледзь не дакрануліся да вады.

Ад страху Вожык хацеў «тукнуць», як маці, калі яна злавалася, але ў яго нічога не выйшла. У той жа момант ён скруціўся ў клубок.

— Ой, які ты прыгожы, — гаварыла дзяўчынка. — Не бойся. Я не пакрыўджу цябе.

Яна ўзяла Вожыка на рукі, вынесла на сцяжынку і паклала на зямлю.

— Бяжы, калюка, дамоў, да матулі.

Вожык ляжаў ціха-ціха, ад страху нават і дыхаць перастаў. А потым, калі крокі дзяўчынкі заціхлі, разгарнуўся і што меў сілы па -

бег дахаты.

— Мама, мама! — закрычаў, цяжка сапучы, Вожык над вухам матулі, якая яшчэ спала. — Каб ты ведала, як я напалохаў дзяўчынку. Яна да мяне падышла, а я: тук-тук — не чапай, бо я ўжо вялікі. Ды іголкамі яе, іголкамі. Яна ад мяне наўцёкі. А ты кажаш, што я маленькі.

Матуля паглядзела ў твар сыну. У вачах Вожыка бегалі нейкія агеньчыкі. Ён хітрыў — вельмі ж Вожыку хацелася быць дарослым.

— Не свавольнічай, сынок. Гэта была добрая дзяўчынка. Другая б занесла цябе кудынебудзь. Што б я тады рабіла?

Матуля гаварыла ціхім жаласлівым голасам. І Вожыку зрабілася сорамна за сваю няўдалую хітрасць.

? Чаму Вожык не хацеў быць маленькім?

Што ён наважыўся зрабіць, калі спала Вожычыха? Якую небяспеку адчуў Вожык? Прачытайце.

Як вы ставіцеся да ўчынка дзяўчынкі? Ці правільна яна зрабіла?

Што сказаў сваёй маці Вожык, калі прыбег дахаты? Чаму ён хітрыў?

# Хмарка.

*Пятрусь Граніт.*

— Хмарка, ты куды плывеш?
Што з сабою ты нясеш?
Мо маланкі, гром і град?..
— Хто ж тады мне будзе рад?!
Я нясу ваду жывую,
І нясу яе туды,
Дзе па ёй даўно сумуюць
Лес, і нівы, і сады!



# Ласі на кладцы.

*Васіль Гурскі.*

За вёскай, пры лесе, раней было балота. Пасярод яго працякаў ручай, які ўпадаў у Нёман. Балота асушылі. А праз ручай дзеці паклалі шэсць чатырохметровых жэрдак, каб і бабулі-ягадніцы смела маглі пераходзіць, каб і веласіпед можна было перавесці на другі бераг.

Аблюбавалі кладку звяры.

Лісіца доўга тупала каля ручая: не хацела мачыць ногі. Прынюхвалася да жэрдак, прыглядалася, прыслухоўвалася. І асмелілася нарэшце, павольна пайшла па кладцы. Пасля вярнулася назад, пасядзела на беразе ды стала бегаць туды-сюды.

А вось лось толькі касавурыўся на кладку. Да самага снегу ён пераходзіў ручай у неглыбокім месцы. Але зімой да мокрых ног пачаў прыліпаць снег, замярзаць. Даводзілася адбіваць ледзякі, абгрызаць зубамі. Непрыемны гэта быў занятак, марудны ды надакуч-

лівы. І балючы, бо ледзякі адрываліся іншы раз з поўсцю. Доўга нылі пасля ногі, напаміналі ласю, што небяспечна лезці ў халодную ваду.

Неяк ласіная сям'я рашыла разгрэбці капытамі снег і паласавацца зялёнай азімінай: яна расла ў полі, на другім беразе ручая. Лось першы падышоў да вады і спыніўся. Успомніў, мабыць, пра балючыя ледзякі на нагах. Пастаяў крыху і падаўся да кладкі, асцярожна ступіў на жэрдкі.

Непадалёку бегла лісіца. Яна спынілася, глядзела на лася і чакала, што вось-вось здарыцца бяда: кладка праломіцца і лясны рагач пакалечыць ногі. Але лось шчасліва перабраўся на другі бераг. А на кладку ступіла ласіха. За ёй, падахвочанае бацькамі, перайшло і ласяня.

Раніцой ішоў па сцежцы ляснік, убачыў сляды звяроў і ўсё зразумеў. Расказаў аб начной прыгодзе вяскоўцам. Многія не паверылі яму і самі хадзілі глядзець на лясныя сляды на кладцы. А дзецям ляснік сказаў:

— Падзяка вам ад звяроў за надзейную кладку: лася вытрымала, усю яго сям'ю.

Так дзіцячая кладка стала служыць днём людзям, а ноччу — звярам.

**Слоўнік.**

Касавурыцца — глядзець коса, убок; касіць вочы.

Азіміна — пасевы, усходы азімых збожжавых культур.

? Чаму тэкст называецца «Ласі на кладцы»? Якi яшчэ загаловак можна да яго прыдумаць?

Якую добрую справу зрабілі дзеці для людзей і жывёл? Як звяры паводзілі сябе, ідучы па кладцы? Зачытайце.

Пра якую начную прыгоду расказаў ляснік аднавяскоўцам?

За што падзякаваў ляснік дзецям? Каму стала служыць дзіцячая кладка? Пацвердзіце словамі тэксту.

* Прачытайце тэкст і падзяліце яго на часткі па плану:

1. Дзеці і кладка.
2. Звяры аблюбавалі кладку.
3. Ласі на кладцы.
4. Падзяка лесніка.

Падрыхтуйце сціслы пераказ.

## Бусел верны Беларусі.

*Віктар Швед.*

Бусел з Афрыкі гарачай
Родную зямельку ўбачыў.
Зноўку з выраю вярнуўся
Да айчыннай Беларусі.

Ён з буслiхай-прыгажуняй
Распазнаў гняздо на клуні.
Хутка ў буслоў цыбатых
Будуць дзеці-бусляняты.

Дзеці вырастуць праз лета
І пакінуць свой палетак.
Прыляцяць увесну. Бусел
Заўжды верны Беларусі.



? Чаму бусел заўжды верны Беларусі?

* Як вы разумееце наступныя радкі: «Бусел з Афрыкі гарачай родную зямельку ўбачыў»?

Прачытайце той урывак з верша, да якога зроблены малюнак. Якія яшчэ ілюстрацыі можна было б зрабіць да гэтага твора?

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання верша.

# Працавітае воблачка.

*Міхась Шубіч.*

Першы прачнуўся дзьмухавец. Працёр вочы, здзівіўся:

— Ого, ледзь не праспаў.

І пачаў будзіць мурашоў:

— Гэй, адчыняйце дзверы, вокны! Час за работу брацца...

Лес напоўніўся звонкімі галасамі. Весела заўсміхалася сонца, саграваючы руплівых лясных працаўнікоў. І толькі беламу воблачку, якое гуляла ў вышыні, не было чым заняцца. Яно апусцілася ніжэй, зачапілася за галлё высокага дуба і загайдалася туды-сюды.

Стары дуб незадаволена зашапацеў лісцямі:

— Ну чаго лётаеш гуляючы?

— А я нічога не ўмею рабіць.

— Вучыцца трэба! — зашумеў дуб і адпусціў воблачка. Але не паспела яно ўзняцца над лесам, як пачула голас з зямлі:

— Гэй! Што ты там робіш угары?

Воблачка глянула ўніз і здзівілася:

— Ой, якое маленькае воблачка!

— І зусім я не воблачка, а дзьмухавец. І не маленькі я: лясныя жыхары даручылі мне будзіць іх раніцай на работу.

— А я — воблачка і не ўмею нічога рабіць...

Воблачка заплакала.

— Няўжо дождж пайшоў? — выглянула з дупла вавёрка. — Як добра — грыбы вырастуць!

Збегліся лясныя жыхары.

— Адкуль дождж? — не маглі здаўмецца яны. — На небе ж ніводнай хмаркі.

— А я? — азвалася воблачка. — Бачыце, я прыляцела.

І тут зайчык-каласавічок як закрычыць:

— Глядзіце, глядзіце — грыбы выраслі!

І праўда, з-пад рудой ігліцы, з моху прабіваліся на свет баравічкі, сыраежкі, лісічкі...

— Ура воблачку! — заскакаў дзьмухавец. — Гэта яно ўмее рабіць дождждык, я сам бачыў.

І лясныя жыхары пачалі дзякаваць воблачку за дождждык-грыбасей, запрашаць да сябе ў

госці.

— Малайчына, воблачка! — радаваўся дзік.

— Маленькае, а такое працавітае! — захапляўся мядзведзь.

— Гэта мой сябар! — хваліўся ўсім дзьмухавец. — Глядзіце, яно падобнае да мяне.

Сапраўды, воблачка было беленькае, пухнатае, як дзьмухавец.

— Ой, мне пара дамоў, мама будзе шукаць, — схамянулася воблачка. — А заўтра я зноў прылячу да вас, сябры. Пакраплю цёплым дожджыкам сунічную паляну, маліннік, чарнічныя латкі — увесь лес.

Якраз падзьмуў вецер, і воблачка паляцела за небасхіл.



? За што дзякавалі лясныя жыхары воблачку? Прачытайце.

Чым воблачка падобнае да дзьмухаўца?

Якім паказана воблачка ў пачатку апавядання і якім у канцы?

Прачытайце тэкст, падзяліце яго на часткі па плану:

1. Дзьмухавец прачнуўся.
2. Белае воблачка.
3. Наказ старога дуба.
4. Размова воблачка з дзьмухаўцом.
5. Слёзы воблачка.
6. Падзяка воблачку.
7. Пара дамоў.

Падрыхтуйце падрабязны пераказ па плану.

## Пчолка.

*Янка Журба.*

Веснавое сонца
Росы падбірае.
Вылецела ў поле
Пчолка залатая.

Ёй за шчырай працай
Весела на полі:
Луг прыбраны ў кветкі
І наўкол раздолле.

З рання да змяркання
Пчолка залатая
Лётае па кветках
Ды мядок збірае.

Шмат сабрала пчолка
Мёду з розных кветак,
Дома ім накорміць
Родных пчолак-дзетак.

У вуллі работа
Цэлы дзень кіпела.
Вечарам з здабычай
Пчолка прыляцела.



? Чаму ў народзе кажуць: *працавітая як пчолка*?

Знайдзіце і зачытайце радкі верша, дзе апісваецца праца пчолкі.

Ці назіралі вы калі-небудзь за пчолкай? Што вы можаце сказаць пра яе?

У якіх радках верша выказана галоўная думка? Зачытайце.

Пры чытанні верша перадайце настрой аўтара і свае ўласныя адносіны.

## Сыны.

*Вольга Асеева.*

Тры жанчыны бралі ваду са студні. Побач на камені сядзеў стары дзед, адпачываў.

Разгаварыліся жанчыны пра сваіх сыноў. Адна кажа:

— Мой сынок спрытны і дужы, — ніхто з ім не зраўняецца.

— А мой дык спявае, як салавей. Ніхто такога голасу не мае, — кажа другая.

А трэцяя маўчыць.

— Што ж ты пра свайго не скажаш? —

пытаюцца ў яе суседкі.

— А што сказаць? — адказвае жанчына. — Нічога ў ім асаблівага няма.

Вось набралі жанчыны поўныя вёдры вады і пайшлі. А дзядок за імі. Ідуць жанчыны, спыняюцца. Баляць рукі, плёскаецца вада, ломіць спіну.

Раптам насустрач тры хлопчыкі выбягаюць. Адзін цераз галаву куляецца, каменне нагамі падкідвае. Цешацца з яго спрыту жанчыны.

Другі песню спявае, салаўём заліваецца. Заслухаліся жанчыны.

А трэці да маткі падбег, узяў у яе вёдры з вадою і панёс іх.

Пытаюцца жанчыны ў дзеда:

— Ну што? Як вам падабаюцца нашы сыны?

— А дзе ж яны? — адказвае дзядок. — Я толькі аднаго сына бачу.

І дзядок паказаў на хлопчыка, які ў маткі вёдры ўзяў.

? Чым спадабаўся вам тэкст? Якая асноўная думка яго?

Пра што размаўлялі жанчыны каля студні? Прачытайце іх размову.

Чаму дзядок адказаў, што ён бачыць толькі аднаго сына? Чаму ён не заўважаў астатніх сыноў?

* Прачытайце тэкст самастойна і падзяліце яго на часткі. Вусна дайце кожнай частцы загаловак.

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання і кароткага пераказу тэксту.



## Чырвоная лотаць.

*Васіль Хомчанка.*

Настаўніца дала вучням дамашняе заданне намаляваць вясну. Надзя прыйшла дамоў, паабедала і адразу ўзялася за ўрокі. Намалявала хату, бярозу каля хаты, яблыню і траўку на лужку. А потым падумала, што яшчэ намаляваць, зірнула ў акно і ўбачыла жоўтыя кветкі лотаці. Надзя хацела намаляваць і лотаць, але жоўтага алоўка не знайшла. Тады яна пабегла да Валі, сваёй суседкі.

— Дай мне жоўты аловак, — папрасіла яна.

— А ў мяне няма, — сказала Валя, пашкадаваўшы алоўка.

— Ты ж сёння на ўроку сонца малявала.

— Ён увесь спісаўся.

Надзя вярнулася дамоў і намалявала лотаць чырвоную.

Назаўтра настаўніца забрала ў вучняў сшыткі, пачала паказваць усім, як хто намаляваў вясну. Разгарнула і Надзін сшытак.

— Што гэта ў цябе? — паказала настаўніца на чырвоныя кветкі.

— Лотаць.

— А чаму ж яна чырвоная?

— У мяне не было жоўтага алоўка.

— Папрасіла б у каго.

— Я ў Валі прасіла, ды ў яе таксама не было жоўтага алоўка.

Настаўніца разгарнула і Валін сшытак. А там намаляваны жоўтае сонца, жоўтыя кветкі, жоўты домік.

Настаўніца нічога не сказала, а Валя пачырванела. Ёй было сорамна.

На перапынку Валя падышла да Надзеі:

— Ты прыходзь да мяне, я табе ўсе алоўкі дам.

— Добра, — адказала Надзя. — Я буду дома лета маляваць.

? Аб кім і аб чым гэты тэкст? Чым вас уразіла гэтае апавяданне?

Якое дамашняе заданне дала вучням настаўніца? Прачытайце.

Чаму Надзя намалявала лотаць чырвонай?

Што вы можаце сказаць пра Валю? Чаму ёй стала сорамна? Зачытайце.

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання і сціслага пераказу твора.

## Шпак.

*Янка Журба.*

Зніклі завірухі,
К нам вясна прыйшла,
Веснавое сонца
Многа шле цяпла.

Сёння раніцою
Прыляцеў к нам шпак,
Сеў ён на бярозцы
І спявае так:

«Выхадзіце, дзеці,
Сустракаць вясну!
Устала ўжо прырода
З зімовага сну».

? Якая асноўная думка гэтага верша?

З якім пачуццём пісьменнік піша пра шпака? Як перадаюцца яго адносіны да веснавой птушкі?

Якім тонам хочацца чытаць гэты верш? Чаму?

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання радкоў верша, якія вам найбольш спадабаліся.

Пры чытанні верша ўголас старайцеся перадаць свае адносіны да яго.

Вывучыце верш на памяць.





# Прыходзіць лета звонкае...

*Сяргей Грахоўскі*





## Лета.

*Якуб Колас.*

Прыйшло і лета. Куды ні глянь — усюды зелена, усё расце, усё наліваецца. Лісце на дрэвах вырасла ва ўвесь рост свой і весела трапечацца на сонцы. Весела пазірае стары лес, што разросся за сялом і цягнецца па краях поля, як разак, пастаўлены зубамі ўгору. Кусты арэшніку, рабіны, чаромхі густа разрасліся ўнізе і далёка параскідалі свае зялёныя галіны. Так зелена, так густа, што, здаецца, не пралезеш у лес! Птушкі аж глушаць сваімі галасамі, сваім шчэбетам. Некаторыя, раннія, ужо вывелі дзетак і клапатліва шчабечуць каля сваіх гняздзечак. Як нянькі каля калыскі. Колькі кветак, колькі

ўсялякіх матылёчкаў, мошак і пчолак! У паветры стаіць бясконцы шум і звон ад іх крылляў.

Поле пакрылася зеленню. Ужо выплыў авёс, ячмень, цягнуцца палоскі гароху з чырвоненькімі і беленькімі кветачкамі. Там відаць зялёненькія стужкі лёну з сіненькімі галоўкамі; бялее грэчка, наліваецца жыта і ціха шаргаціць у полі сваімі сярэбранымі каласкамі. Жаваранкі рассыпаюцца над імі песнямі, кружачыся ў небе.

Зялёнаю шырокаю паласою раскінуўся луг паабапал рэчкі. Густая высокая трава, як мора, калышацца на ветры. А кветак, кветак! Якога толькі колеру не знойдзеш кветак! Мільёны пчолак, чмялёў уюцца над імі са звонам і шумам. Так і цягне на прывольны луг, дзе так многа кветак, птушак, усякіх конікаў і матылёчкаў, песень, шуму і звону, дзе так прахладна падыхае чысты, свежы ветрык.

Шчыраю рукою ўбрала лета ўвесь свет.

? Якім бачыць лета Якуб Колас? Як ён перадаў гэта ў творы?

Як вы разумееце выразы: «Весела пазірае стары лес», «Птушкі аж глушаць сваімі галасамі», «Шчыраю рукою ўбрала лета ўвесь свет»?

Знайдзіце ў творы яшчэ трапныя выразы, якія характарызуюць надыход лета.

Які малюнак лета ў тэксце вам найбольш запомніўся? Зачытайце.

Пры чытанні тэксту выдзеліце голасам словы, якія дапамогуць уявіць прыгажосць летняй прыроды.

Прачытайце апавяданне і падрыхтуйцеся падрабязна пераказаць яго.



## Колеры года.

*Іван Муравейка.*

— Самы прыгожы —
колер зялёны, —
у маі шапталі
бярозы ды клёны.

— Самы гарачы —
золата колер, —
улетку звінела
жытнёвае поле.

— Самы ярчэйшы —
колер чырвоны, —
увосень рабіна
шумела штодзённа.

— Самы бліскучы —
колер бялюткі, —
спявала зіма
ў завеевы дудкі.

А дзеці сказалі
прасторам і сонцу:
— Усе колеры года
мы любім бясконца!

? Пра якія колеры года гаворыцца ў вершы? Зачытайце.

Якія словы паўтараюцца шмат разоў у вершы? Пры чытанні выдзеліце іх голасам. Якое значэнне мае такое паўтарэнне? Што яно надае тэксту?

Што сказалі дзеці прасторам і сонцу?

Прачытайце верш самастойна і падрыхтуйцеся да выразнага чытання.

Пры чытанні верша захоўвайце інтанацыю.



## Сінія званочкі.

*Васіль Хомчанка.*

Прасторны луг, а па ўсім лузе званочкі, сінія-сінія.

Ідзе Паўлік па лузе, дакранаецца да кветкі, а яна:

— Дзінь... Зі-і-нь...

«Званочкі звіняць!» — дзівіцца Паўлік. Ён спыняецца, задзірае ўверх адну сінюю чашачку, а там пчолка.

— Дзі-нь, — трапеча яна крылцамі і звініць. Падымае другі званочак, і ў тым — пчолка і таксама звініць. І амаль у кожным званочку — пчолка. Сядзіць і звініць.

? З чаго дзівіўся Паўлік? Прачытайце.

Паглядзіце на малюнак і прачытайце словы з тэксту, якімі можна падпісаць гэты малюнак.

Чаму тэкст названы «Сінія званочкі»? Падрабязна перакажыце яго.



## Лён-ляночак.

*Мікола Чарняўскі.*

На сцяблінцы кожнай —
Сіненькі званочак:
Хораша
На ранку
Лён расцвіў, ляночак.

Мама сцежкай крочыць.
Шчасцем
Ззяюць вочы:
Добры
У матулі
Вырас лён-ляночак.



? Чаму ў мамы шчасцем ззяюць вочы?

Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся выразна чытаць уголас.

На старонцы 44 знайдзіце скорагаворку пра лён. Адкажыце, чаму так гавораць.

Намалюйце словамі, якім вы ўяўляеце сабе лён.

Вывучыце верш на памяць.

## Наша лавачка.

*Васіль Хомчанка.*

Мы з Толікам на двары паставілі лавачку. Добрую, са спінкай. Як толькі зрабілі, паселі і сядзім. Добра сядзець у цяньку пад ліпай. Колькі хочаш сядзі, каго хочаш запрашай пасядзець — лавачка наша.

Вось так сядзім мы адны дзесяць хвілін, дваццаць...

З дому выйшаў наш сусед дзед Андрэй. Убачыў лавачку, здзівіўся: нічога не было, а цяпер лавачка стаіць.

Мы пасунуліся.

— Калі ласка, — сказалі дзеду Андрэю. — Гэтую лавачку мы зрабілі.

Цяпер сядзім утрох. Дзед хваліць лавачку і нас малайцамі заве. Добра, кажа, у цяньку пасядзець.

З трэцяга пад'езда выйшаў яшчэ адзін дзед.

— Хадзі, Іван, пасядзі, — паклікаў дзед Андрэй.

Падышоў дзед Іван і спытаў:

— Гэта ты, Андрэй, зрабіў лавачку?

— Не, мы з Толікам, — пахваліўся я.

Я ўстаў і даў месца дзеду Івану. Потым Толік саступіў месца бабулі, якая падышла да нас.

Мы стаім, а два дзяды і бабуля сядзяць на нашай лавачцы.

— Няхай пасядзяць, — сказалі мы. — Паспеем насядзецца.

Пагулялі ў двары, пабегалі па вуліцы, вярнуліся, а на лавачцы сядзяць тры бабулі. Схадзілі ў кіно, паабедалі, выйшлі на двор — зноў лаўка занятая. Нейкія дзядзька і цётка з дзіцем селі. Так у той дзень мы і не дачакаліся, калі можна будзе пасядзець на сваёй лавач-

цы. І на другі, і на трэці дзень тое ж самае — сядзяць людзі на ёй, а нас убачаць — хваляць:

— Малайцы, хлопцы. Такую добрую лавачку зрабілі.

Кожнаму хочацца пасядзець на лавачцы, а яна ж невялікая, толькі на тры чалавекі.

І рашылі мы зрабіць яшчэ адну лавачку, вялікую, каб усім хапіла месца. Узялі пілку, сякеру, цвікі, прынеслі дошкі.

— Цюк! Цюк! — стукае наша сякера.

Памагайце, малыя, мы робім другую лавачку. Большую, са спінкай. І для старых, і для малых.

? Якую добрую справу зрабілі хлопчыкі?

Якія словы ўдзячнасці выказвалі старэйшыя? Зачытайце.

Чаму хлопчыкі вырашылі зрабіць яшчэ адну лавачку?

Прачытайце тэкст самі сабе, а потым уголас тую частку, якая найбольш вам спадабалася.

# Цуда-шкельца.

*Эдзі Агняцвет.*

На пагорку я знайшла
чырвані асколак.
У малым кавалку шкла —
дзіваў шмат вясёлых.

На хвілiначку зірні —
стане ўсё інакшым,
і запаляцца агні
ў белым садзе нашым.



На галінках белы цвет
раптам стаў барвовым.
Травы,
    птушкі —
        цэлы свет
мне здаецца новым.

Свой чырвоны парасон
ясень раскрывае,
зачапіў хмурынку ён —
і яна палае!

Кожны лісцік над табой
казкай заіскрыцца,
і жар-птушкай агнявой
з'явіцца сініца.

Разгараюцца кусты,
ярка-ярка ўсюды.
...Толькі шкельца возьмеш ты —
сам убачыш цуды!

? Якія дзівы можна ўбачыць у маленькім кавалку шкла? Прачытайце.

Знайдзіце і патлумачце выразы: «І запаляцца агні ў белым садзе нашым», «На галінках белы цвет раптам стаў барвовым», «Свой чырвоны парасон ясень раскрывае», «Разгараюцца кусты ярка-ярка ўсюды». Прачытайце іх, выдзяляючы голасам. Захоўвайце пры гэтым пэўную інтанацыю.

З якім настроем вы будзеце чытаць гэты верш?

Да кожнага слупка верша зрабіце слоўны малюнак.

## У бабчыным агародчыку.

*Яраслаў Пархута.*

Ляжыць Юлька на фуфайцы пад кустом парэчак і не варушыцца. Куст з долу здаецца вялікім, лапушыстым. На галінках безліч ягад. Толькі працягнула руку, каб сарваць бліжэйшую гронку, як раптам бачыць: з ягадзінак да вугла цагліны, што ляжыць непадалёку, звісае сетка. Напятыя туга канаты ажно звіняць. Прыгледзелася ўважлівей — і гаспадара ўбачыла. Пузаты і страшны, ён сядзеў у кутку і, відаць, чакаў, пакуль хто трапіць у пастку.

Але ў пастку ніхто не жадаў трапляць. І павук нерваваўся і раз-пораз тузаў за канат.

Калі на цагліну ўпаў сонечны прамень, на яе ўскочыў цвыркунок. Ён быў у зялёных гольфіках, такой жа манішцы і празрыстай накідцы. Прайшоўся на край цагліны, вярнуўся на сярэдзіну, пастаяў там і пачаў настройваць скрыпачку.

Гэта ўчулі суседзі.

Першымі з'явіліся камарыкі. Аднолькава апранутыя. І тварыкі ў абодвух аднолькавыя — цвічкамі. А ножкі на адзін капыл — тонкія і спружыністыя. Паселі на край цагліны і пачалі цікавацца: а што гэта надумаў цвыркунок?

Прыбег жучок. Плашч на ім навюсенькі — ажно блішчыць. Патаптаўся перад цаглінай, паспрабаваў узлезці, ды не змог. І тады прыстроіўся паблізу на трэсачцы і стаў пакручваць вусы. Маўляў, пабачым, што з таго атрымаецца.

Апошнім прывалокся вусень. Хоць і меў шмат ног. Быў ён у кажушку. Поўсцю наверх. Во дзівак! Сонца, а ён аўчыну напяліў!.. Узабраўся

на цагліну насупраць камарыкаў і пачаў выгінацца — прабачэння прасіць за спазненне. А потым натапырыўся і аціх. Увесь выгляд яго гаварыў:

— І я мог бы так. Толькі б скрыпачку займець...

Юлька пазірала то на вусеня, то на жучка, то на блізнючкоў-камарыкаў і ўсміхалася: няўжо, сапраўды, цвыркунок будзе даваць ім канцэрт?

Цвыркунок не жартаваў. Пакінуў настройваць скрыпачку і так урэзаў, так урэзаў, што ажно камарыкі падскочылі, жук перастаў круціць вусамі, а вусень рыжую поўсць прыгладзіў — усе ў здзіўленні былі.

А цвыркун іграў. Іграў пра тое, што на зямлі добра жыць, што свеціць сонейка, што навокал такая густая трава, што ёсць на свеце чырвоная цагліна, на якой так добра іграць...

Потым пачаў пра сваіх суседзяў — пра братоў-камароў, пра жука, пра вусеня, якія ніколі не сварацца, жывуць з ім у згодзе. І пра тое, што яны такія добрыя — не паленаваліся

прыйсці на яго канцэрт.

Што ўбачыла Юлька, лежачы пад кустом у бабчыным агародчыку? Што яе там найбольш уразіла?

Што надумаў зрабіць цвыркунок? Апішыце, як ён выглядаў.

Зачытайце, хто з суседзяў з'явіўся першым, а хто — апошнім?

Пра што іграў цвыркунок? Знайдзіце гэтыя радкі ў тэксце.

Паглядзіце на малюнак і параўнайце яго з тэкстам. Што на ім адлюстравана?

Прачытайце тэкст самастойна, падрыхтуйце сціслы пераказ яго па плану:

1. Юлька ў агародчыку.
2. Цвыркунок на цагліне.
3. Суседзі.
4. Канцэрт.



# Касілкі.

*Мікола Салаўцоў.*

Зазвінелі камары:
— Касавіца на двары!..
Пад застрэшшам плачуць косы,
нездаволеныя лёсам,
бо пайшлі на луг касілкі,
працавітыя асілкі,
сакавіты травастой
рэжуць востраю пілой.

? Пра якую пару года напісаў аўтар?

Як вы разумееце выраз: «Плачуць косы, нездаволеныя лёсам»? Чаму яны «плачуць»?

Чаму аўтар гаворыць: «Бо пайшлі на луг касілкі, працавітыя асілкі»? Які сэнс укладвае ён у гэтыя словы?

Знайдзіце словы, якія пры чытанні неабходна выдзеліць голасам.

Прачытайце верш самі сабе, а потым уголас, захоўваючы пэўную інтанацыю.

## Выпадак на рэчцы.

*Алег Фомчанка.*

Пра Мішу і Гену кажуць, што іх вадой не разальеш. Такія сябры. Жывуць у адным доме. У адным пад'ездзе. Нават на адной лесвічнай пляцоўцы. І дня не пройдзе, каб не сустрэліся: то Міша бяжыць да Гены, то Гена да Мішы.

Аднаго разу, у нядзелю, паехалі яны з бацькамі за горад. Стаяў цёплы сонечны дзень. Дарослыя ўладкаваліся ў цяньку на лузе, а Міша і Гена пабеглі да рэчкі.

Празрыстая, з дробнымі каляровымі каменьчыкамі на дне, рэчка весела бегла ў нізкіх берагах, між зялёнага аеру, ціха віравала на пясчаных водмелях.

Цікава сачыць за хуткімі, як сонечныя промні, рыбінкамі. Усё далей ад берага адыходзіць Міша. А Гена боўтаецца ў вадзе каля самага аеру, дзе мяльчэй.

— Ідзі сюды! — махае рукой Міша.

Гена асцярожна брыдзе да сябра. Вада дастае яму да каленяў, і ён спыняецца.

— Не бойся! — крычыць Міша. — Тут неглыбока!

Але Гена паварочвае назад.

І раптам адтуль, дзе забаўляецца Міша, далятае крык:

— Ра-атуй-це!..

Гена на нейкі міг замірае, разгублены, а потым выскаквае на бераг. Лётам ляціць на луг, туды, дзе адпачываюць бацькі. Засопшыся, шэпча, паказваючы рукой на рэчку:

— Там... Міша топіцца...

Усе разам, абганяючы адзін аднаго, бягуць да рэчкі. І з палёгкай уздыхаюць: на беразе, боўтаючы нагамі ў вадзе, сядзіць Міша.

Бацька дакорліва глядзіць на Гену:

— Ці ж гэтак можна жартаваць?

— Дык ён жа тапіўся, — апраўдваецца Гена. — Сам чуў, як крычаў: «Ратуйце...»

— Табе падалося, — усміхаецца Міша. — Калі б я тапіўся, ты кінуўся б мяне ратаваць. Праўда?

Гена чырванее і апускае галаву. З крыўдай думае: «Так, я сапраўды разгубіўся там, на

рэчцы. Але і ты, Міша, маніш. І мне, і бацькам. Ці ж так выпрабоўваюць сяброў?..»

А вы як думаеце?

---

**Слоўнік.**

Водмель — мелкае месца каля берага.

? Чаму пра сяброўства Мішы і Гены гаварылі, што іх вадой не разальеш? Можа, і ў вашым класе ёсць такія дружбакі? Раскажыце пра іх.

Як забаўляліся хлопчыкі на рэчцы? Што там здарылася?

Як вы думаеце, з-за чаго пачырванеў і апусціў галаву Гена? Чаму яму было крыўдна?

Што вы можаце сказаць пра сяброўства хлопчыкаў?



## Салодкія лекі.

(Казка.)

*Уладзімір Шайдаў.*

Жылі ў вёсцы дзед і бабка.

Аднаго разу іх унучак гуляў з дзецьмі на вуліцы, напіўся халоднай вады і ахрып. Сядзіць у хаце і плача.

Забедавала бабка, паклікала дзеда.

— Што рабіць? — пытаецца. — Унучак голас згубіў.

Дзед адразу здагадаўся, у чым прычына.

— Не бяда, — супакойвае. — Пчолак прыйдзецца прасіць. Яны вернуць унучку голас.

Узяў дзед унучка за руку і павёў у сад. Падышлі да вулляў. Дзед і кажа:

— Пчолкі добрыя! У майго ўнучка горла баліць, трэба яго мёдам палячыць — голас вярнуць.

— Што ж унучак нарабіў, чаму галасок згубіў? — спыталіся пчолкі.

— Вады халоднай папіў — вось і галасок згубіў.



Загулі, зазвінелі пчолкі, узняліся хмаркай над садам і паляцелі хутчэй па мёд. Адны — на луг. Другія — у лес. Трэція — у поле.

— Прынясём, дзядуля, мядок, вернецца да ўнучка галасок.

Прыляцелі пчолкі да кветачак, закружыліся над імі ды і кажуць:

— Кветачкі прыгожыя, кветачкі духмяныя! Аддайце нам ваш мядок. У дзедавага ўнучка прапаў галасок. Ён мядку паспытае, горлачка балець перастане.

Кветачкі ласкава ўсміхнуліся і павярнулі свае галоўкі да яснага сонейка, каб пчолкам лепш было відаць кропелькі нектару.

— Бярыце, пчолкі, наш мядок ды нясіце хутчэй у дамок. Няхай унучак п’е мядок і верне сабе галасок.

Цэлы дзень лёталі пчолкі, насілі мядок для Віці. А пад вечар дзед зноў прывёў унучка ў сад.

Падышлі да чырвонага вулля.

— Пчолкі добрыя, працаўніцы слаўныя, — пытае дзед, — ці гатовы мядок?

Вылецела з доміка пчолка і загула:

— Вазьмі, дзядок, лугавы мядок! Няхай да ўнучка вернецца галасок, а сам ён няхай расце прыгожы, як васілёк!

Падзякаваў дзед пчолкам і ўзяў слоік лугавога мёду.

Падышлі да зялёнага вулля.

— Пчолкі добрыя, працаўніцы слаўныя, — пытае дзед, — ці гатовы мядок?

Вылецела з доміка пчолка і загула:

— Вазьмі, дзядок, лясны мядок! Няхай да ўнучка вернецца галасок, а сам ён няхай вырасце моцны, як дубок.

Падзякаваў дзед пчолкам і ўзяў слоік ляснога мёду.

Падышлі да жоўтага вулля.

— Пчолкі добрыя, працаўніцы слаўныя, — пытае дзед, — ці гатовы мядок?

Вылецела з доміка пчолка і загула:

— Вазьмі, дзядок, палявы мядок! Няхай да ўнучка вернецца галасок, а сам ён няхай вырасце шчодры, як каласок.

Падзякаваў дзед пчолкам і ўзяў слоік паля-

вога мёду. І ўнучак хацеў падзякаваць, але не змог — яшчэ голас не вярнуўся.

У хаце пасадзіла баба ўнучка за стол, сама побач з дзедам села. Дзед узяў драўляную лыжку, пачаў ўнука салодкімі лекамі частаваць: спачатку лугавым мёдам, потым — лясным, а затым — палявым.

З'еў хлопчык тры лыжкі мёду і адразу стаў такім, як пажадалі пчолкі. Зноў да яго вярнуўся галасок. Заўсміхаўся ён шчасліва, павесялеў адразу.

— Дзякуй вам, дзед і баба, дзякуй працавітым добрым пчолкам. Я зусім здаровы, у мяне нічога не баліць.

Усміхнуўся ў вусы дзед, засмяялася ад радасці баба. А ўнук хутчэй на вуліцу пабег.

І цяпер зноў гуляе з дзецьмі на вуліцы — прыгожы, як васілёк, моцны, як дубок, шчодры, як каласок.

? Чаму дзед, каб вылечыць унука, папрасіў дапамогі ў пчолак?

У каго прасілі мядку пчолкі? Якія словы гаварылі кветачкі? Прачытайце тэкст, выдзяляючы голасам ласкавыя словы.

Што гаварылі дзеду і ўнуку ў садзе пчолкі пад вечар? Якія словы ў творы паўтараюцца? Які сэнс у іх укладзены аўтарам? Зачытайце.

Чаму спачатку хлопчык не мог падзякаваць пчолкам? Што сказаў ён, калі з'еў тры лыжкі мёду? Прачытайце.

Якімі словамі пачынаецца і заканчваецца казка? Прачытайце пачатак і канец казкі.

Прачытайце казку яшчэ раз і падрыхтуйце падрабязны яе пераказ.



## Маленькі Саколік.

*Любоў Варанкова.*

Сонейка звярнула з паўдня, але прыгравала яшчэ вельмі горача. Так горача, што відаць было, як над зямлёй дрыжыць і струменіцца гарачае паветра.

Таня з Алёнкай сядзелі на бярвёнах і слухалі, як пад паветкай шчабяталі маладыя ластаўкі. Раптам на задворак прыбегла Нюра.

— Вы тут седзіце і нічога не ведаеце, — закрычала яна, — а на канюшні жарабё нарадзілася!

Усе пабеглі на канюшню.

Канюшня стаяла на самым краі вёскі, каля сажалкі. Яна была вялікая, з шклянымі акенцамі. Гэтую канюшню пабудавалі пасля вайны.

Коней у канюшні не было — усе працавалі. Толькі ў адным стойле стаяла рыжая Зорка. Дзед падсцілаў ёй чыстую салому. Ён убачыў дзяцей і забурчэў:

— Ну, чаго прыйшлі? Не бачылі вас.

Але дзяўчаткі ўсё ж падышлі бліжэй да стойла і ўбачылі, што каля Зоркі стаіць маленькае жарабё.

— Ух ты, міленькае! — усклікнула Таня. — Ух ты, прыгожанькае! А на лбе зорачка! Дзядулька, дай я яго пагладжу.

— Не ўжо, не гладзь, — сказаў дзед. —

Бачыш, яно і так баіцца.

Жарабё стрыгла вушамі, касілася на Таню, прыціскалася да маці. А дзед ласкава ўгаворваў яго:

— Ну-ну, Саколік, не палохайся! Мы цябе не пакрыўдзім.

Ішоў міма канюшні рахункавод Іван Сяргеевіч. Ён вярнуўся з вайны ранены, з тых часоў з палкаю ходзіць.

— Гэй, Міронавіч! — крыкнуў ён дзеду. — Кажуць, у цябе прыбытак сёння?

— А то як жа! — з гонарам адказаў дзед. — Ідзі палюбуйся!

Рахункаводу жарабё спадабалася:

— Бач ты, даўганогае якое! У нас у кавалерыі такія былі!

Ішла на сажалку цётка Мар'я. Паставіла вёдры сярод дарогі і таксама зайшла ў канюшню.

— Вось і добра — гаспадарка наша прыбывае! Хутка яшчэ багацей станем!

Потым прыйшоў стары вартаўнік. Яму таксама хацелася жарабё паглядзець.

Але дзед убачыў, што многа народу сабралася, замахаў рукой:

— Не ўжо, ідзіце вы, калі ласка! Няма чаго каня непакоіць.

Усе пайшлі са двара.

— Будзь здароў, Міронавіч, — сказалі дзеду, — гадуй каня.

— Ды ўжо выгадуем, — адказаў дзед, — не турбуйцеся!

Але дзяўчаткам не хацелася ісці адсюль. Яны яшчэ пастаялі ля варот, паглядзелі, як жарабё ходзіць каля маці і махае хвастом. А хвост у яго пушысты, кучаравы і яшчэ зусім маленькі.

---

**Слоўнік.**

Рахункавод — служачы бухгалтэрыі.

Прыбытак — даход, тут: з'яўленне патомства ў гаспадарцы.

? Якую вестку прынесла дзяўчынка Нюра? Зачытайце.

Што ўбачылі дзеці на канюшні? Якое яшчэ ёсць слова, адпаведнае слову *канюшня*?

Аб якім прыбытку спытаў у дзеда рахункавод? Што сказала пра гэта цётка Мар'я? З якой мэтай зайшоў на канюшню стары вартаўнік?

Чаму дзед папрасіў усіх выйсці з канюшні?

Чаму дзецям не хацелася адыходзіць ад жарабяці?

Прачытайце словы, якімі апісваецца Саколік. Як ён выглядаў, як паводзіў сябе?

Паглядзіце на малюнак і, ужываючы словы тэксту і свае ўласныя, апішыце яго.

Падрыхтуйцеся да вуснага пераказу тэксту.



# Журавель і Чапля.

(Казка.)

*Цётка.*

Жылі сабе па абодвух канцах балота Журавель і Чапля.

Пасля стала ім надта маркотна жыць, і вось уздумаў Журавель да Чаплі ў сваты ісці. Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху, цераз бор ды ў Чапляў двор.

— Як маешся, Чапля?

— Здароў, Журавель.

— Ці не пойдзеш, Чапля, за мяне замуж?

— А твае ногі доўгія, пер'е кароткае; дужа ты брыдкі... Ідзі сабе, дзе быў!

Журавель перабраўся ізноў цераз балота дый прыйшоў у свой двор.

Раздумалася Чапля, што за Жураўля замуж не пайшла. «Дай, — кажа, — пайду да яго і перапрашу».

Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху, цераз бор ды ў Жураўлёў двор.

— Здароў, Журавель!

— Як маешся, Чапля?

— Вазьмі мяне замуж за сябе.

— Твая шыя доўгая, і сіняя, і крывая, і сама ты гарбатая; такой мне не патрэбна.

Хаця было і сорамна, аднак Чапля папляялася цераз бор назад у свой двор.

Шкада стала Жураўлю, што не ўзяў Чаплю бедную, ізноў пайшоў ён тою самаю дарогаю. Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху...

Так цэлы век хадзілі яны адзін да аднаго ў сваты, і так на абодвух канцах балота асталіся іх хаты.

? Чаму Жураве́ль і Чапля не змаглі ажаніцца? Дакажыце, карыстаючыся словамі тэксту.

Якія словы ў казцы паўтараюцца? Зачытайце іх.

Прачытайце тэкст, выдзяляючы голасам самыя галоўныя словы.

Прачытайце казку па асобах.



## Жывы барометр.

*Алесь Пальчэўскі.*

На лета Міша паехаў гасцяваць у вёску да цёткі, якая працавала настаўніцай. Хутка хлопчык прывык, пасябраваў з такімі ж, як сам, вучнямі і цэлымі днямі прападаў з імі то на рэчцы, то ў лесе.

— Цётка Паліна, мы сёння зноў пойдзем у лес, — сказаў Міша за снеданнем.

— Тады вазьмі з сабою плашч.

— Навошта?

— Можа быць дождж.

Міша засмяяўся:

— Адкуль вы ведаеце?

— А вунь зірні, што паказваюць наготкі.

Перад акном на градцы расло шмат кветак.

— На небе ні хмурынкі, а яны ўжо чакаюць дажджу, — сказала цётка. — Бачыш, хоць і цёпла, а наготкі не раскрылі пялёсткаў. Тыя раніцы аж зіхацелі, а сёння спяць.

— Я ні разу не бачыў, калі яны распускаюцца.

— Трэба, Мішачка, прыглядацца да таго, што вакол цябе. Прырода — найцікавейшая кніга. Запомні: перад дажджом белая лілея таксама аберагае свае суквецці ад дажджавых кропляў, хоць і расце сама ў вадзе. А ці бачыў ты калі, як «плача» клён?

— Не.

— Прыгледзься, гэта цікава. У тым месцы, дзе чаранкі лістоў прыраслі да дрэва, на дождж выступаюць слёзы. Чаму? Перад дажджом у паветры з'явілася шмат вільгаці, а клён свае слёзы не можа выпарыць праз лісце, от і капае лішняя вада. Ты, мусіць, не ведаеш, што і акацыя перад дажджом выдзяляе шмат нектару? Гэта лёгка заўважыць. Калі над кветкамі акацыі многа ўсялякіх мошак, тады чакай дажджу.

Міша чуў гэта ўпершыню і не знаў, верыць ці не, а цётка казала далей:

— І дым, бачыш, з комінаў не слупам ідзе ўгору, а рассейваецца — таксама прыкмета на дождж. А ластаўкі высока ці нізка лятаюць? — спытала цётка.

— Над самай зямлёю, — паказаў хлопчык.

— А ўчора дзе ляталі?

— Высока ў небе.

— Значыць, мошкі цісну́цца да зямлі перад дажджом, і ластаўкі зніжаюцца, каб лавіць іх.

Міша аж пляснуў рукамі:

— Ой, як цікава! Без барометра можна ведаць, якое надвор'е будзе. Адкуль вы, цётачка, даведаліся пра гэта?

— Што з кніжак, а болей са сваіх уласных назіранняў... Яшчэ заўваж, кветкі могуць не толькі прадказваць надвор'е, але і паказваць гадзіны сутак, бо не кожная з іх распускаецца ў адзін і той жа час. Толькі трэба ўмець прыглядзецца. Паназірай сам, упэўнішся ў гэтым.

? Чаму тэкст мае назву «Жывы барометр»? Пра які барометр ідзе размова?

Зачытайце ў тэксце, як паводзяць сябе расліны, калі прадказваюць дождж. Знайдзіце на старонцы 38 іншыя прыкметы, якімі можна дапоўніць тэкст. Зачытайце іх.

Прачытайце апавяданне самастойна і падрыхтуйцеся адказаць на пытанні:

1. Куды паехаў летам Міша?
2. Чаму цётка Паліна вучыла Мішу?
*3. Якія прыкметы трэба ведаць, каб навучыцца прадказваць надвор'е?
4. Што вы можаце расказаць з уласнага вопыту пра назіранні за з'явамі прыроды?

Падрыхтуйцеся да вуснага пераказу тэксту.



## Вясёлка.

*Пятро Глебка.*

Хваліліся вербы
Уборам зялёным,
А возера — сінім,
А ружы — чырвоным.



Адна толькі ціха
Вясёлка маўчала,
Пакуль ад дажджынак
Уся не заззяла.

Заззяла квяціста
Над цэлай краінай —
Чырвоным,
аранжавым,
Жоўтым і сінім.

? Якім настроем прасякнуты верш?

Чым хваліліся вербы, возера, ружы? Зачытайце.

Чаму толькі вясёлка маўчала? Якімі колерамі яна потым заззяла?

Колькі колераў у вясёлкі? Назавіце іх.

Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся да выразнага чытання ўголас.

## Усім добра, калі згода.

(Казка.)

*Аляксандр Зянько.*

Крочыў па лесе Лесавічок, праз пянёчкі скок ды скок. Натрапілася яму палянка-заглянданка. Прыпыніўся ён, любуецца. Камары гудуць, слупам вісяць — цёпла будзе. Ля бярозы і асіны зямля варушыцца — грыбы лезуць. Пчолкі з чмялямі на кветках шчыруюць. Парадак вакол і лад.

Толькі хацеў Лесавічок ступіць крок далей, як пачуў тоненькі жаласлівы галасок:

— І калі вы марнаваць мяне перастанеце? Я ж цэлымі днямі для вас шчырую, а вы мне кропельку соку шкадуеце. І чаму вы зразумець мяне не хочаце? Калі я засохну, то і вам не жыць.

— А тут і разумець няма чаго, — злосна загаварыў басавіты голас, — мы цябе ўспаілі, а ты сваёй прыгажосцю перад усімі выхваляешся. Да тваіх паслуг вунь і сонейка, і ветрык, а мы ляжым у цемры, толькі і ведаем, што

працаваць. Хутчэй бы капыты якія-небудзь цябе затапталі.

Здзівіўся Лесавічок: «Хто там лаецца?» Наблізіўся, чуе — голас з-пад зямлі выбіваецца, а наверсе кветачка змарнелая стаіць. «Ну і цуд! — падумаў Лесавічок. — Колькі год на свеце жыву, а такое ўпершыню сустракаю. Карані соку кветачцы шкадуюць: перапрацаваліся!»

Пастаяў Лесавічок, паразважаў ды і вырашыў: «Шкада кветачку, загіне — ратаваць патрэбна. А караням навука будзе».

Сашчыкнуў ён кветачку і панёс у свой домік, паставіў у жывую вадзіцу — ажыла кветачка, выпрамілася, галоўку да сонейка нахіліла. Хараша ў пакойчыку стала.

А карані ўзрадаваліся — няма больш кветачкі! І загулі:

— Цяпер нам раздолле будзе. Адпачывай, колькі душа пажадае! Сок ёй патрэбен, а пра нас хто клапаціцца будзе? Хопіць! Нацярпеліся!

Цэлы дзень і ноч выхваляліся карані, якія



яны здатныя ды справядлівыя. А на наступны дзень, у спякотны поўдзень, запішчаў малюсенькі карэньчык:

— Дзядзечкі, пагрэйце мяне, вельмі холадна стала.

— Змоўкні! — закрычалі на яго тоўстыя карані.

Мінула колькі часу, і другія маленькія карані запішчалі:

— Холадна! Холадна!

— Цыц! — прыкрыкнулі таўсцейшыя. — Расціце хутчэй — цёпла стане.

— Дзядзечкі! — зноў запішчаў самы малюсенькі. — Паміраю я, — і заціх.

Зірнулі тут таўсцейшыя карані на танчэйшыя — гінуць тыя. Захваляваліся:

— Як нам быць?! Што рабіць? Гэтак і мы хутка загінем.

— Так вам і трэба, — сказала крапіва-жыгучка, якая расла непадалёк.

— Вой, вой, — заплакалі тоўстыя карані, — дапамажыце нам, калі ласка.

— Не ж-ы-ыць вам без кветачкі. Не ж-ы-

ыць, — варухнуў кудлатай галавою стары дуб.

— Кветачку вяртайце, кветачку вяртайце, — зазыкала пчолка.

— Калі не вернеце кветачку, загінеце, — не змаўчаў асот. — Вы яе сокам паілі зямным, а яна вас сонечнымі праменьчыкамі саграввала. Таму і добра ўсім вам жылося. А цяпер Лесавічка гукайце, павініцеся, можа, і верне ён вашу кветачку.

Што тут сталася! Карані на ўвесь лес расплакаліся, Лесавічка пачалі клікаць ды ўмольваць, каб кветачку вярнуў.

Шкада стала Лесавічку неразумных каранёў. Прынёс ён назад тую кветачку і прыжывіў.

І пачалі яны жыць у згодзе: карані кветачцы сок здабываюць, а яна ім сонечнае цяпло пасылае. Усміхнуўся Лесавічок і прамовіў:

— Усім добра, калі згода.

? Які сэнс укладзены ў назву казкі?

Чый жаласлівы галасок пачуў у лесе Лесавічок? Як пра гэта напісана ў тэксце?

Што адказалі кветачцы карані? Зачытайце.

Што здзівіла Лесавічка? Што ён зрабіў з кветачкай?

Чым выхваляліся тоўстыя карані? Што ім сказалі маленькія карэньчыкі? Якую параду даў караням стары дуб? Зачытайце.

Чаму шкада стала Лесавічку неразумных каранёў?

Як пачалі жыць карані?

Чаму вучыць гэтая казка?

Падрыхтуйцеся да падрабязнага пераказу казкі.

## Адкуль прыйшоў гліняны пеўнік.

*Казімір Камейша.*

Некалі ў дзяцінстве падарылі мне глінянага пеўніка. Ах, што гэта быў за пеўнік!.. Статны, яркахвосты, з пышным грабянцом. А як свістаў ён! Прыкладзеш да вуснаў — і адразу ліецца яркі, густавата-цёплы галасок. А пачнеш перабіраць пальцамі па дзвюх адтулінах збоку — голас пераломіцца, як быццам перабяжыць з берага на бераг, а то і зусім рассыплецца на дробныя падгалоскі.

Доўга не ведаў я, адкуль прыйшоў да мяне гліняны пеўнік. І вось аднойчы даведаўся. Хачу расказаць пра гэта і вам.

Неяк прыехаў я ў пушчанскі гарадок Івянец, што на беразе ракі Волма. Іду па вуліцах, прыглядаюся да акон. І на кожным бачу вазоны. А растуць яны ў прыгожых гліняных вазонніцах. Тут я і ўспомніў пра свайго глінянага пеўніка.

І яго, і тыя вазонніцы, аказваецца, стварылі адны і тыя ж людзі, івянецкія ганчары. І пайшоў я на тутэйшы завод мастацкай керамікі, дзе яны працуюць.

У прасторных цэхах кіславата пахла свежай глінай, павольна беглі стужкі канвеераў, моцна дыхалі цяплом электрапечы. Каля іх завіхалася многа людзей. Канвееры неслі да печаў яшчэ сырыя вазы, кубкі, сподкі. Але ўвесь сакрэт адкрыўся мне, калі зазірнуў у некалькі невялікіх пакояў, што былі тут, у цэху. Гэта рабочыя месцы вядомых усёй рэспублікі ганчароў Міхаіла Звярко, Антона Пракаповіча.

...Круціцца і круціцца ганчарны круг —



невялікі станок з кружочкам наверсе. Міхаіл Звярко бярэ ў руку камячок мяккай карычневай гліны, кладзе яго на круг — і вось ужо творыцца сапраўднае дзіва. Спрытныя рукі ганчара вырабляюць самае неверагоднае. Камячок расце, выгібаецца, набывае форму. Вось ён пачынае звужацца ў гарлавінку, зверху зноў крыху расшыраецца. Здагадваешся, што гэта павінен быць гарлачык. Усё і сапраўды нагадвае дзіва, як быццам на вачах тваіх распускаецца незвычайная кветка.

І вось гарлачык гатовы. Майстар ставіць яго на паліцу і кладзе на круг новы камячок гліны. Галоўнае зроблена, але шлях гарлачыка яшчэ не завершаны. Яму трэба прайсці загартоўку ў печы. Потым яго пакрываюць глазурай і адправяць у печ другім кругам.

Бачыў я на фабрыцы самыя розныя вырабы: збанкі, міскі, вазы, гліняных баранчыкаў і птушак.

Нялёгкая праца ў ганчара. Цяпер круг верціць электрычны матор. А калісьці круцілі яго нагамі. І рабілі яны за дзень столькі рухаў,

што, калі б перавесці іх у крокі, атрымалася б адлегласць у семдзесят кіламетраў. Гэта — шлях ад Івянца да Мінска.

Круціцца ганчарны круг. Вырастае ў руках майстра гарлачык.

А вось каб стварыць глінянага пеўніка, ганчар карыстаецца спецыяльнымі палачкамі. Гэта — горлышка, шыпуль, трасціна. Нараджэння яго бачыць не давялося, але, наведаўшы ганчароў, мне здалося, што я пабываў у дзяцінстве і сустрэў свайго глінянага пеўніка.

---

**Слоўнік.**

Ганчар — майстар, які вырабляе гліняны посуд.

Шыпуль — ганчарная іголка.

Трасціна — тонкая пласцінка.

? Чаму тэкст называецца «Адкуль прыйшоў гліняны пеўнік»?

Чаму лічылася для дзяцей за шчасце атрымаць у падарунак глінянага пеўніка? Якое пачуццё перадаў аўтар у гэтых словах? Зачытайце.

Якія цуды ствараюць івянецкія ганчары?

Што ўяўляе сабой ганчарны круг?

Як апісваецца аўтарам праца па стварэнні гарлачыка? Зачытайце.

Якімі прыладамі карыстаецца майстар, каб стварыць глінянага пеўніка?

* Чаму аўтар напісаў: «Мне здалося, што я пабываў у дзяцінстве і сустрэў свайго глінянага пеўніка»? Абгрунтуйце свой адказ.





# Ты — багацце маё і любоў...

*Артур Вольскі*





## Беларусь — мая Радзіма.

*Артур Вольскі.*

Якая прыгожая назва ў нашай краіны — Беларусь!

А яшчэ мы завём яе — Радзіма.

А яшчэ — Бацькаўшчына.

Радзіма — бо тут мы нарадзіліся, бо яна нам самая родная з усіх краін на цэлым свеце.

Бацькаўшчына — бо яна дасталася нам ад бацькоў нашых. А ім ад іхніх бацькоў — нашых дзядоў. А далей — ад прадзедаў, ад прапрадзедаў... І так — аж да самых далёкіх продкаў.

Над шырокімі палямі, над векавечнымі пушчамі, над зялёнымі лугамі, над блакітнымі стужкамі рэк і рачулак, над люстрамі незлічоных азёр лунаюць у высокім небе белакрылыя буслы. Таму паэт назваў краіну нашу зямлёю пад белымі крыламі.

А колькі багаццяў схавана ў зямлі гэтай! Калійныя солі, якімі ўзбагачаюць глебу, каб яна не бяднела і давала добрыя ўраджаі. Іх здабываюць беларускія шахцёры пад Салігорскам. Нафтавікі з падземных глыбіняў пампуюць нафту на Гомельшчыне. Неўзабаве пачнуцца распрацоўкі радовішчаў каменнага вугалю. Вучоныя-геолагі кажуць, што ёсць у нетрах Беларусі і золата і нават алмазы. Трэба толькі як след пашукаць...

Жыта ў полі, яблыкі ў садах, свойская жывёла на падворках, звяры ў лясах, рыба ў водах... Ды хіба пералічыш усё!

Але самы вялікі скарб Беларусі — гэта людзі, беларусы.

Побач з беларусамі жывуць у нашых гарадах і вёсках палякі, літоўцы, рускія, яўрэі,

татары, выхадцы з іншых краін. Усе разам мы складаем беларускі народ. Усе мы — грамадзяне незалежнай Рэспублікі Беларусь. Так завецца наша дзяржава. Усе мы павінны памнажаць сваёй працай яе багацці, бараніць ад нягод і напасцяў, як баранілі яе нашы продкі.

? Чаму Беларусь называюць зямлёю пад белымі крыламі?

Чаму нашу краіну мы называем яшчэ *Бацькаўшчына, Радзіма*? Які сэнс укладзены ў гэтыя словы?

Які найвялікшы скарб Беларусі? Зачытайце. Як завецца цяпер наша дзяржава?

Прачытайце тэкст самі сабе. Падрыхтуйцеся да падрабязнага пераказу.



# Дарагая Беларусь.

*Пятрусь Броўка.*

Слаўлю я свой край любімы,
незгасальную зару.
Як ты сэрцу майму міла,
дарагая Беларусь!

Залацістыя прасторы,
незлічона ясных зор,
рэкі ціхія, азёры,
галасісты шумны бор!

Ты нас ласкай атуліла,
і я ў шчасці гавару:
як ты сэрцу майму міла,
дарагая Беларусь!

? Як праслаўляе паэт дарагую Беларусь? Зачытайце радкі верша, прасякнутыя любоўю да роднага краю, да яго прастораў.

На аснове прачытанага і пачутага зрабіце ў сшытках малюнак на тэму «Слаўлю я свой край любімы!»

Вывучыце верш на памяць.

## Не магу жыць без Радзімы.

*Станіслаў Шушкевіч.*

У дуброве, каля рэчкі,
Віснуць сочныя парэчкі,
У пералеску, ля крыніцы,
Ззяюць спелыя суніцы.
І вясной, і цёплым летам
Тут наўкола многа кветак.
Нівы жыта і пшаніцы,
У стаўку вада іскрыцца.
Журавель з вядром, калодзеж...
Дзе ж такое месца знойдзеш?
Ну куды ж пайсці, падацца,
Па якой прайсці мне кладцы?
Хараство, куды ні глянеш,
Ад світання да змяркання.



І парэчкі — каля рэчкі,
І суніцы — ля крыніцы...
Без цябе жыць немагчыма,
Мая любая Радзіма!

## Родны край.

*Міхась Пазнякоў.*

Грае вечар на цымбалах,
Плаўна музыка цячэ,
Месяц у блакітных далях
Пакруглеў і паярчэў.

Пахне мёдам, пахне кропам
Напаўсоннае сяло,
І малінавым сіропам
Сонца захад абліло.

І плыве з садоў у сэрца
Малады птушыны грай.
Ён Радзімаю завецца,
Непаўторны гэты край.

? Якія словы верша вас найбольш кранулі?

Як вы разумееце выразы: «Грае вечар на цымбалах» і «Плыве з садоў у сэрца малады птушыны грай»? Знайдзіце іх у вершы і зачытайце.

Якімі словамі паэт перадае свае адносіны да роднага краю? Зачытайце.

У якім тэмпе трэба чытаць гэты верш? Чаму?

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання верша.

## Цяпер я ведаю, якая Беларусь.

*Васіль Сухамлінскі.*

На Украіну прыехалі ў госці беларускія дзеці. Маленькая Аксана пасябравала з дзяўчынкай Марысяй.

Павяла Аксана Марысю ў поле. Да самага краю зямлі раскінулася бязмежнае поле пшаніцы. Жоўтае поле, нібы золата. А над ім сіняе неба.

Марыся стаяла перад бясконцым пшанічным полем, захопленая яго хараством.

— Якая прыгожая Украіна! — паціху сказала яна Аксане.

Марыся пачала расказваць пра Беларусь:



перад вокнамі яе дома вось такое ж бязмежнае поле лёну, а лён сіні, як неба.

Аксана слухала Марысю, але не магла ўявіць: як жа гэта — поле сіняе, як неба, а над полем — сіняе неба. Тады ж увесь свет у Беларусі сіні?

Наступнаю вясною Аксана прыехала ў госці да Марысі.

Раніцай яны выйшлі з Марысінай хаты. Да самага краю зямлі было бязмежнае поле лёну. Сіняе поле, як неба. А над ім — сіняе неба.

— Цяпер я ведаю, якая прыгожая Беларусь! — сказала ў захапленні Аксана.

? Чаму Аксана сказала: «Цяпер я ведаю, якая прыгожая Беларусь»? Які сэнс заключаецца ў яе словах?

Куды паехалі беларускія дзеці? З кім пасябравала Аксана?

Што ўбачыла Марыся, калі Аксана павяла яе ў поле?

Пра што даведалася Аксана ад Марысі? Што яна не магла ўявіць? Чаму? Прачытайце.

Знайдзіце ў тэксце словы, якімі можна падпісаць малюнак.

Падрыхтуйцеся да падрабязнага пераказу тэксту.

## Свята лета.

*Ніл Гілевіч.*

Надышлі канікулы —
Эх жа, і раздолле.
Дзень-адодня клікаюць
Рэчка, луг і поле!

Ой, і слаўна, хораша
Беларускім летам!
Век душой не зморышся
На раздоллі гэтым.

**Слоўнік.**
Дзень-адодня — кожны дзень, з дня ў дзень.

? З якім пачуццём Ніл Гілевіч апісвае надыход канікул? Перадайце гэтае пачуццё пры чытанні.

Патлумачце выраз: «Век душой не зморышся на раздоллі гэтым».

Знайдзіце ў вершы словы, якія рыфмуюцца. Зачытайце іх.

Прачытайце верш самастойна і падрыхтуйцеся да чытання ўголас.

Вывучыце верш на памяць.



## Няма прыгажэй.

*Артур Вольскі.*

Высозныя сосны
адвечнага бору —
пад самае сонца,
пад самыя зоры.

Зубры
ў гушчары
пратапталі сцяжыны
туды, дзе ніводнай
няма каляіны.
Маліна сама
так і просіцца ў жмені,
грыбы — у кашы,
бы ў загоне алені.
Вітаюць нас
птушкі і дрэвы гасцінна...
Ну дзе яшчэ знойдзеш
такія мясціны?
Усім на зямлі
я давесці бяруся:
няма прыгажэй
ад маёй Беларусі!





## Адгадкі па парадку да старонак 45—47

Малако. Соль. Піла. Камень, вада, трава. Акуляры. Хмара. Ноч. Цень. Сонца. Месяц. Пісьмо. Рэха. Дудка. Жук. Іржышча. Пух. Бабёр. Рэшата. Сонца і месяц. Зямля. Камень. Маланка. Вясёлка. Раса. Год. Тыдзень. Чарапаха. Шчотка.

## Адгадкі па парадку да старонкі 48

Сонца. Вада. Вецер. Воран. Хмара. Мароз. Новы год. Халодная. За сталом. На шыю. Мокры. Пад мокры. Без стуку. Літара «м».

## Адгадкі па парадку да старонкі 49

Чатыры. Пяць і сем. Настаўнік. Каляндар.



# ЗМЕСТ

Непаўторны край. *Артур Вольскі.* .................................... 5

**Зямля бацькоўская, святая...**

Памяць зямлі. *Васіль Вітка.* .................................... 8
Чым займаліся нашы продкі. *Віталь Вольскі.* .................... 10
Адкуль пайшлі беларусы. (Паданне.) ................................ 11
Я — беларус маленькі. *Мікола Маляўка.* ........................ 14
Спадчына. *Янка Купала.* .................................... 16

**Душа народа ў песнях тых жыве.**

**КАЛЫХАНКІ.**
Люлі, люлі, люлі.................................... 20
Вы не чулі навіны? .................................... 22

**ПЕСНІ.**
Дажынкавая.................................... 23
Перадзімная. .................................... 25
Калядная. .................................... 26
На масляніцу. .................................... 26
Вясновыя. .................................... 26

Ой ты, жаваранку. .................................................. 27
А ты, вясна, а ты, красна! ........................................ 28

**ПЕСЕНЬКІ.**

Гого-гого, гусачок. ................................................ 29
Сядзіць сыч на капе. .............................................. 29
Наляцелі гусі. ....................................................... 29

**ЗАКЛІЧКІ.**

Прыйдзі, прыйдзі, вясна. ......................................... 31
Сонейка, сонца... ................................................... 31
Ідзі, дожджычку. .................................................... 32

**ЗАБАЎЛЯНКІ.**

Ладачкі-ладушкі. .................................................... 33
Кую, кую ножку. ..................................................... 34
Сарока-варона. ...................................................... 34

**ЛІЧЫЛКІ.**

Пятро, Пятро, падай вядро... .................................. 36
А ты, коцік, не гуляй. ............................................. 36
Каціласяторба. ...................................................... 37
У зімы і лета — свае прыкметы. ............................... 38

**ЦІ ТО СМЕХ, ЦІ ПАЎСМЕХА.**

На жарты крыўдаваць не варта. ............................... 40
Скорагаворкі — радцы гаворкі. ................................. 43
Загадкі з роднай хаткі. ........................................... 45
Загадкі-жарты. ...................................................... 48
Загадкі-задачы. ..................................................... 49

**ТРАПНАЕ СЛОВА — МУДРАСЦІ АСНОВА.**

Прыказкі і прымаўкі. ............................................... 50

## НАРОДНЫЯ КАЗКІ

Лісіца і Гусак. ........................................ 52
Зайчыкі. *Апрацоўка Якуба Коласа.* .............. 54
Хітры вол. *Апрацоўка Алеся Якімовіча.* ..........57

## І восень на прызбу ступіла...

Восеньскія весткі. *Васіль Вітка.* .................. 64
Адшумела лета. *Сяргей Грахоўскі.* .................. 66
У верасні. *Артур Вольскі.* .............................. 69
У арэхах. *Рыгор Ігнаценка.* ............................ 71
Хлебная скарынка. *Авяр'ян Дзеружынскі.* ........74
Хто вінаваты?.. *Анатоль Жук.* ........................75
Хто галоўны. *Леанід Улашчанка.* ................... 78
Прытворка. *Іван Мураўейка.* .......................... 83
Прынцэса Нехачу. (Казка.) *Лідзія Арабей.* ...... 85
Сур'ёзная размова. *Пятро Рунец.* .................... 88
Нарэшце зразумеў. *Павел Кавалёў.* ................. 91
Добрыя суседзі. *Рыгор Барадулін.* ................. 93
Светлым раннем. *Янка Брыль.* ........................ 94
Восень. *Сяргей Новік-Пяюн.* ............................ 98
Чатыры пажаданні. *Васіль Вітка.* .................... 99
Колькі кошак у кашы? *Рыгор Барадулін.* ......... 100
Каток і мышка. *Леанід Улашчанка.* ................. 102
Зарадка. *Ніна Галіноўская.* ............................ 106
Лістапад. *Станіслаў Шушкевіч.* ...................... 107
Прыгоды лісціка-карунчыка. *Максім Валошка.* ........... 108
Амяла. *Зоська Верас.* ................................... 111
Пра Марынку. *Ядвіга Бяганская.* .................. 114

## Зноў да нас прыйшла зіма...


Першы снег. *Міхась Лынькоў.* ........ 122
Зіма. *Мікола Хведаровіч.* ........ 124
Сняжынка. *Алесь Жыгуноў.* ........ 126
Месяцы года. *Пімен Панчанка.* ........ 127
Птушыная елка. *Зоська Верас.* ........ 128
Ёлка. *Пятрусь Граніт.* ........ 133
Калядкі. *Артур Вольскі.* ........ 134
Бабуліна варта. *Уладзімір Ягоўдзік.* ........ 137
Зіма і Лета. (Казка.) *Уладзімір Дубоўка.* ........ 143
Словы на снезе. *Юлій Ванаг.* ........ 145
Снягір. *Мікола Хведаровіч.* ........ 147
Чаму адзенне грэе? *Канстанцін Ушынскі.* ........ 148
Хто самы дужы. (Казка.)
*Апрацоўка Хрысціны Лялько.* ........ 150
Пустыя кармушкі. *Мікола Маляўка.* ........ 153
Галка. *Васіль Хомчанка.* ........ 154
Гаспадарка. *Змітрок Бядуля.* ........ 156
На горцы. *Мікалай Носаў.* ........ 158
У марозны дзень. *Канстанцыя Буйло.* ........ 162
Птушыная тайна. *Змітро Бяспалы.* ........ 163


## Ідзе вясна ў шумлівых водах...


Пошукі вясны. *Рыгор Ігнаценка.* ........ 170
Прадвесне. *Марк Смагаровіч.* ........ 173
Скора прыйдзе вясна. *Цётка.* ........ 174
Вясна ідзе. *Валерый Кастручын.* ........ 176
Перад паводкай. *Максім Багдановіч.* ........ 178

Вясна. *Змітрок Бядуля.* ........ 179
Смачная вада. *Васіль Вітка.* ........ 181
Галоўныя словы. *Мар'ян Дукса.* ........ 184
Свята. *Паўлюк Пранузa.* ........ 185
Маміна работа. *Яўген Пярмяк.* ........ 186
Мама. *Мікола Хведаровіч.* ........ 188
Красавік. *Рыгор Барадулін.* ........ 190
Рэкі выйшлі з берагоў. *Віталь Вольскі.* ........ 191
Веснавая раніца. *Авяр'ян Дзеружынскі.* ........ 192
Вялікдзень. *Артур Вольскі.* ........ 192
Разумны пеўнік. *Уладзімір Ліпскі.* ........ 195
Птушыны інтэрнат. *Яраслаў Пархута.* ........ 201
Вечны агонь. *Еўдакія Пяршай.* ........ 204
Гасцінец. *Уладзімір Ліпскі.* ........ 206
Мае забавы. *Змітрок Бядуля.* ........ 210
Хітрун. *Павел Ткачоў.* ........ 211
Хмарка. *Пятрусь Граніт.* ........ 215
Ласі на кладцы. *Васіль Гурскі.* ........ 216
Бусел верны Беларусі. *Віктар Швед.* ........ 219
Працавітае воблачка. *Міхась Шубіч.* ........ 221
Пчолка. *Янка Журба.* ........ 224
Сыны. *Вольга Асеева.* ........ 226
Чырвоная лотаць. *Васіль Хомчанка.* ........ 228
Шпак. *Янка Журба.* ........ 230

## Прыходзіць лета звонкае...

Лета. *Якуб Колас.* ........ 234
Колеры года. *Іван Муравейка.* ........ 236

Сінія званочкі. *Васіль Хомчанка.* ........................... 238
Лён-ляночак. *Мікола Чарняўскі.* ........................... 240
Наша лавачка. *Васіль Хомчанка.* ........................... 241
Цуда-шкельца. *Эдзі Агняцвет.* ........................... 244
У бабчыным агародчыку. *Яраслаў Пархута.* ................ 246
Касілкі. *Мікола Салаўцоў.* ........................... 250
Выпадак на рэчцы. *Алег Фомчанка.* ........................... 251
Салодкія лекі. (Казка.) *Уладзімір Шайдаў.* ................ 254
Маленькі Саколік. *Любоў Варанкова.* ........................... 259
Журавель і Чапля. (Казка.) *Цётка.* ........................... 264
Жывы барометр. *Алесь Пальчэўскі.* ........................... 266
Вясёлка. *Пятро Глебка.* ........................... 269
Усім добра, калі згода. (Казка.) *Аляксандр Зянько.* ... 271
Адкуль прыйшоў гліняны пеўнік. *Казімір Камейша.* .... 276

## Ты — багацце маё і любоў...

Беларусь — мая Радзіма. *Артур Вольскі.* ........................... 284
Дарагая Беларусь. *Пятрусь Броўка.* ........................... 287
Не магу жыць без Радзімы. *Станіслаў Шушкевіч.* ...... 288
Родны край. *Міхась Пазнякоў.* ........................... 289
Цяпер я ведаю, якая Беларусь. *Васіль Сухамлінскі.* ... 290
Свята лета. *Ніл Гілевіч.* ........................... 293
Няма прыгажэй. *Артур Вольскі.* ........................... 294
Адгадкі. ........................... 296

Назва і нумар школы

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан падручніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне падручнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Падручнік выдадзены за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэта для фондаў бібліятэк па заказу Міністэрства адукацыі, свабоднаму продажу не падлягае

Вучэбнае выданне

**Вольскі** Артур Вітальевіч
**Гімпель** Ірына Андрэеўна

# Буслянка

Падручнік па літаратурнаму чытанню для 1-га класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання

Выданне трэцяе

Рэдактар В. Я. Гарэлік
Мастацкі рэдактар А. А. Кулажэнка
Карэктар А. С. Вячорка

Падпісана ў друк з арыгінал-макета 27.04.2000. Фармат 70x90 $^1/_{16}$. Папера афсетная №1. Гарнітура Букварная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 22,23. Ум. фарб.-адб. 89,6. Ул.-выд. арк. 11,8. Тыраж 63100. Заказ 838.

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Асар». Ліцэнзія ЛВ №85 ад 04.12.1997. 220004, Мінск, вул. Раманаўская слабада, 5.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат ВПП імя Я. Коласа. 220005, Мінск, вул. Чырвоная, 23.



ISBN 985-6572-14-2
9 789856 572145

асар

# Буслянка

1

2000